**Установа адукацыі**
**«Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»**

**З.П. Мельнікава**

# КУЛЬТУРА ЛІТАРАТУРАЗНАЎЧАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

**Брэст 2013**
**УДК 8(091)=832**
**ББК 83.3(Беи2)**

**Мель 48**

*Рэцэнзенты:*

Доктар філалагічных навук, старшы навук. супр. Інстытута філасофіі НАН Беларусі
**В.А. Максімовіч**
Кандыдат філалагічных навук, дацэнт кафедры беларускай і рускай моў УА «Брэсцкі дзяржаўны тэхнічны ўніверсітэт»
**З.М. Заіка**

**Мельнікава З.П.**
Мель48 Культура літаратуразнаўчага даследавання: вучэбна-метадычны дапаможнік / З.П. Мельнікава. – Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2013. – 86 с.

ISBN

Пры стварэнні вучэбна-метадычнага дапаможніка ўлічаны: напрацоўкі беларускіх філолагаў М. Абабуркі, У. Анічэнка, У. Еўтухава, І. Лепешава, В. Ляшчынскай, Т. Тамашэвіча і нек. інш. па культуры беларускай мовы, асновах культуры маўлення і стылістыкі; сучасных расійскіх даследчыкаў Н. Аруцюнавай, А. Бажэнавай, І. Гальперына і інш. па пытаннях спецыфікі сучаснага навуковага тэксту; высновы ўкраінскіх філолагаў Н. Зялінскай, А. Коваль, В. Сяміног аб сучасным навуковым дыскурсе, а таксама нарматыўна-метадычныя рэкамендацыі ВАК Беларусі аб структуры і спецыфіцы навуковага даследавання.

Адрасуецца маладым навукоўцам: студэнтам філалагічных факультэтаў (спец. «Літаратуразнаўства»), магістрантам, аспірантам, настаўнікам, выкладчыкам, якія ажыццяўляюць навуковае кіраўніцтва даследчыцкай працай моладзі.

**УДК 8(091)=832**
**ББК 83.3(Беи2)**

**ISBN**

## 1. Навуковая культура і прафесійная дзейнасць даследчыка

Навука ўяўляецца важным сацыяльным фактарам і неад'емнай часткай прафесійнай кампетэнтнасці сучаснага спецыяліста. Сёння надзвычай узрасла роля метадалагічнай культуры даследчыкаў, іх здольнасці да крытычнага асэнсавання, навуковага абгрунтавання і творчага засваення пэўных нормаў і метадаў пазнання. Навукова-даследчая дзейнасць вымагае пастаяннай і настойлівай разумовай працы, уменняў інтэрпрэтаваць існуючыя канцэпцыі і тэорыі, творчага асэнсавання аналізуемага матэрыялу, імкнення даследчыка да самаўдасканалення. Імклівае развіццё навукі актуалізуе ўвагу да моўнай і маўленчай культуры кожнага даследчыка, тым болш філолага, гуманітарыя, грамадазнаўца.

Навуковая мова з'яўляецца важным і спецыфічным камунікатыўным феноменам, бо моўная якасць навуковай прадукцыі істотна ўплывае на яе тэарэтычную і практычную значнасць і каштоўнасць. Аднак аналіз сучаснага ўзроўню навуковай моўнай культуры высвятляе мноства праблем, асноўная з іх – недастатковая моўна-камунікатыўная падрыхтаванасць і культура, стылістычная некапметэнтнасць даследчыкаў. Уплывае дамінаванне ў міжнароднай навуковай прасторы англійскай мовы як глабальнай мовы навукі, у свеце на ёй, паводле звестак украінскай даследчыцы А. Сяміног, публікуюцца да 85% даследаванняў. Гэта прыкметна замінае развіццю нацыянальных навуковых моваў, некаторыя з іх, у тым ліку і беларуская, за выключэннем навуковай беларускай філалогіі, страчваюць статус моваў навуковага мыслення: зніжаецца выкарыстанне іх пазнавальнай, навукова-мысленчай, кагнітыўна-творчай, крэатыўна-наватарскай функцый для задавальнення сацыяльна-пазнавальных, камунікатыўна-прагматычных патрэб асобы і соцыуму. Для захавання і развіцця самабытнага моўнага каларыту асабліва гуманітарна-філалагічных даследаванняў неабходная *нацыянальная стратэгія* моўнага развіцця, павышэнне каштоўнасна-матывацыйнага статусу беларускай навуковай мовы. Для эфектыўнай навуковай дзейнасці недастаткова мець глыбокія спецыяльныя веды, дасканала валодаць метадалогіяй навуковай творчасці, уменнямі здабываць, аналізаваць, сістэматызаваць навуковыя факты. Не менш важная пры гэтым грунтоўная моўнакамунікатыўная падрыхтоўка, вольнае карыстанне нарматыўнаю нацыянальнай навуковай моваи ва ўсіх відах пісьмовай і вуснай формаў. Яны з'яўляюцца складнікамі і паказчыкамі высокай навуковай культуры даследчыка, сучаснага вучонага.

Беларускі вучоны павінен валодаць беларускай навуковай мовай у вуснай і пісьмовай, дыялагічнай і маналагічнай формах, дэманстраваць высокі ўзровень моўнакамунікатыўнай культуры.

Тэрмін «культура мовы» мае некалькі вызначэнняў. *Культура мовы* – гэта, найперш, мовазнаўчая навука, якая фарміруе крытэрыі моўнай камунікацыі, усвядомленых і кваліфікаваных адносін да мовы, да працэсаў і з'яў у ёй. Паралельна ўжываецца тэрмін *«культура маўлення»*, пад якім разумеецца нарматыўнасць і дакладнасць выкладу інфармацыі, гэта значыць, філалагічна і псіхолага-педагагічна абгрунтаванае выкарыстанне моўных граматычных структур. Культура маўлення выражаецца ў правільнасці, дакладнасці ўжывання моўных формаў. Навуковае маўленне – ужыванне, функцыянаванне мовы ў сферы навуковай камунікацыі.

Асновай навуковай мовы з'яўляецца літаратурная мова, на яе спецыфіку ўплываюць вынікі даследаванняў розных галін навукі. У 20–30-я гады ХХ ст. у даследаваннях Пражскага лінгвістычнага гуртка было сфармулявана паняцце «функцыянальная мова». *Функцыянальная мова* – мова, прызначаная для спецыяльных мэтаў і абслугоўвання пэўных сфераў людской камунікацыі. Нямецкія лінгвісты прапанавалі паняцце *«прадметнай (спецыяльнай) мовы»*, пад якой разумеюць сістэму моўных спосабаў, якія выкарыстоўваюцца ў прафесійнай сферы камунікацыі з мэтай забеспячэння паразумення між людзьмі, якія працуюць у адной прафесіі.

Культуру навуковай мовы канца ХХ – пач. ХХІ ст. даследуюць *функцыянальная стылістыка* (вывучае асаблівасці моўных нормаў у сувязі з рознымі функцыянальнымі стылямі), *лінгвістычная прагматыка* (аналізуе мэты ўдзельнікаў камунікацыі і метады іх дасягнення, стаўленне асобы да ўласнага і чужога маўлення), *лінгвістыка тэксту* (разглядае нормы пабудовы, структурна-стылістычныя асаблівасці тэксту), *псіхалінгвістыка* (высвятляе працэсы моватворчасці, успрыняцця і фарміравання маўлення і адпаведнасць гэтых працэсаў сістэме мовы).

*Аб'ектам* такіх даследаванняў з'яўляецца навуковая мова (навуковыя тэксты), *прадметам* – моўна-жанравыя асаблівасці навуковага стылю, этычныя нормы навуковых зносін. *Вынікі* такіх даследаванняў даюць магчымасць паглыбіць веды пра навуковы стыль увогуле, пра асаблівасці навуковага тэксту, асновы майстэрства навуковага выступлення, дапамагаюць выхоўваць моўны густ і моўнае чуццё, крытычныя адносіны да ненарматыўнага маўлення, ствараць навуковыя тэксты па спецыяльнасці, пісаць водгукі і рэцэнзіі на навуковыя працы, правільна ўжываць і афармляць цытаты, рэдагаваць навуковыя тэксты розных жанраў і г.д.

Сучаснаму вучонаму, асабліва пачынаючаму, важна валодаць паняццямі *«мова навукі», «навуковы стыль», «навуковае маўленне», «мова навуковай літаратуры».* Тэрмін «мова навукі» ўжываюць пад час вывучэння патрабаванняў да пабудовы навуковага тэксту.

*Мова навукі*, або мова навуковага выкладу – гэта спецыяльная навуковая мова, якая выконвае пазнавальную, кагнітыўную і камунікатыўную

функцыі. Лексіку мовы розных навук прадстаўляюць агульнанавуковыя словы, устойлівыя словазлучэнні, тэрміны, невярбальныя знакі (сімвалы), адпаведныя сінтаксічныя канструкцыі.

Культура навуковай мовы ахоплівае нарматыўны, камунікатыўны і этычны аспекты. *Нарматыўны* аспект прадугледжвае веданне літаратурных нормаў і ўменне іх ужываць у навуковым маўленні. *Камунікатыўны* – прапануе адбор моўных спосабаў, якія найлепш выконваюць *мэту навуковых зносін*. Захаванне нормаў паводзін, павага да ўдзельнікаў зносін, зычлівасць, тактоўнасць складаюць *этычны аспект* навуковай мовы.

Сучасныя даследчыкі культуры навуковай мовы (Н. Бабіч, Ф. Бацэвіч, А. Бажэнава, М. Кацюрава і інш.) вылучаюць *прыкладны* аспект. Навуковыя тэксты яны разглядаюць як носьбіты функцыянальна-стылёвай спецыфікі асобы, што дае магчымасць тлумачыць маўленчыя недахопы, іх псіхалагічную прыроду, фактары іх з'яўлення. Запачаткаваны нават асобны накірунак даследаванняў – *«лінгвістыка памылак», або «памылказнаўства»* («дзевіяталогія»).

Засваенне навуковай беларускай мовы – адна з важнейшых перадумоў падрыхтоўкі дасканалага навуковага тэксту, паспяховай *прэзентацыі* вынікаў навуковага даследавання.

## 2. Навуковыя тэксты: спецыфіка, функцыі, тыпы, жанры

Навуковы стыль з'яўляецца адным з функцыянальных стыляў мовы.

Сярод функцыянальных стыляў вылучаюць размоўны, публіцыстычны, навуковы, афіцыйна-дзелавы, мастацкі, канфесійны і нек. інш. Кожны з іх характарызуецца пэўнымі прыкметамі (сцісласць – разгорнутасць, эмацыйнасць – безэмацыйнасць, афіцыйнасць – нязмушанасць і інш.) і моўнымі адзінкамі.

Тэксты *афіцыйна-дзелавога стылю*, як правіла, рэгулююць дзелавыя адносіны ў дзяржаўна-прававой і агульна-вытворчай сферах. Іх асаблівасці: дакументальнасць, высокая ступень стандартызацыі, лаканізм, дакладнасць, строгая рэгламентацыя тэксту, адсутнасць эмацыйнай вобразнасці і якога-небудзь выяўлення індывідуальнасці аўтара.

Тэксты *мастацкага стылю* павінны ўплываць сродкамі мастацкага слова на розум, пачуцці і волю чытачоў, фарміраваць ідэйныя перакананні, маральныя якасці і эстэтычны густ. Іх асаблівасці: вобразнасць, паэтычнасць, эстэтыка маўлення, экспрэсія.

Прызначэнне *размоўнага стылю* – быць сродкам нязмушаных зносін, жывога абмену думкамі, высвятлення побытавых стасункаў між людзьмі. Яго асаблівасці: вусная форма зносін, неафіцыйнасць стасункаў між сураз-

моўцамі, непасрэднасць зносін, выкарыстанне пазамоўных сродкаў (рухі, жэсты, міміка), лаканізм, эмацыйнасць.

Тэксты *публіцыстычнага стылю* маюць мэту высвятляць разнастайныя агульна-палітычныя праблемы, фарміраваць грамадскую думку. Іх прыкметы: паяднанасць лагічнасці выкладу з эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкай, палемічнасць, вобразнасць, экспрэсіўнасць і афарыстычнасць.

***Навуковы стыль*** з’яўляецца *функцыянальнай разнавіднасцю літаратурнай мовы, якая абслугоўвае розныя галіны навук, вытворчасці, асветы і рэалізуецца ў спецыялізаваных тэкстах розных жанраў.* Навуковы стыль фарміруецца і развіваецца пад уплывам узроўню навуковых ведаў у Беларусі, узроўню развіцця беларускай літаратурнай мовы, моўнай практыкі пісьменнікаў, вучоных, дзеячаў культуры. *Сфера яго выкарыстання –* навука, тэхніка, вытворчыя адносіны. *Прыкметы* тэкстаў навуковага стылю: афіцыйны характар стасункаў удзельнікаў маўлення, падрыхтаванасць маўлення, пераважна пісьмовая форма ў выглядзе маналогу, лагічная паслядоўнасць выкладу, адназначнасць, дакладнасць, сціслaсць і інфарматыўная насычанасць зместу, канкрэтнасць, аб’ектыўнасць выкладу. *Асаблівасці:* насычанасць тэрмінамі, навуковая фразеалогія, перавага абстрактнай лексікі, ужыванне пераважна назоўнікаў, многакампанентных складаных выразаў. Тып маўлення: меркаванне, выкарыстанне апісання і тлумачэння як спосабу аргументацыі ў меркаванні.

*Мэта навуковых тэкстаў* – паведамленне аб’ектыўнай інфармацыі, выклад сутнасці навуковых ведаў, тлумачэнне прычын, з’яў, апісанне істотных прыкмет, уласцівасцяў, характарыстык прадмета навуковага пазнання.

Сучасныя даследчыкі вылучаюць наступныя *асноўныя функцыі навуковых тэкстаў*:

1) інфарматыўная (функцыя паведамлення);

2) эпістэмілагічная (навуковае тлумачэнне з’яваў, высвятленне, абгрунтаванне гіпотэз, класіфікацыя паняццяў, сістэматызацыя ведаў);

3) камунікатыўная (перадача спецыяльнай інфармацыі);

4) перфарматыўная (устанаўленне пэўных фактаў або сувязяў з дапамогаю моўнага матэрыялу);

5) гнасеалагічная (пазнавальная, накіраваная на паглыбленне ведаў чытача);

6) кагнітыўная (атрыманне новых ведаў);

7) функцыя ўплыву ( імкненне аўтара пераканаць чытачоў, слухачоў у правільнасці сваёй пазіцыі);

8) функцыя аргументаванага доказу (прывядзенне доказаў ці фактаў, якія падмацоўваюць правільнасць тлумачэння і думкі);

9) дыялагічная (зварот аўтара да думкі чытача, супастаўленне аўтарам свайго погляду з пазіцыямі іншых навукоўцаў).

Сферай рэалізацыі навуковага стылю з'яўляецца пераважна пісьмовае маўленне, аднак прыкметнае ўзрастанне навуковых кантактаў у выглядзе канферэнцый, сімпозіумаў, семінараў завастрае ўвагу і да вуснага навуковага маўлення.

Навуковаму тэксту ўласцівыя наступныя словы і выразы:

а) агульнанавуковыя, кніжныя словы, якія ў аднолькавай меры выкарыстоўваюцца ў большасці стыляў *(перавага, досвед, вынік, факт, заснавана, пакладзена ў аснову);*

б) моўныя адзінкі, якія маюць функцыянальна-стылёвую афарбоўку навуковага стылю *(гіпотэза, актуальнасць праблемы, навуковае значэнне, апрабацыя, эксперыментальная база, навуковая навізна, ступень даследаванасці).*

Інфармацыю ў навуковым тэксце можна перадаваць таксама з дапамогай штучнай, графічнай мовы – графікаў, табліц, малюнкаў, матэматычных, фізічных сімвалаў, знакаў і г.д.

У межах навуковага стылю вылучаюць наступныя **тыпы** моўных выказванняў: *апісанне, тлумачэнне (інтэрпрэтацыя), меркаванне, доказ.* У апісаннях пералічваюць у пэўнай паслядоўнасці прыкметы ці ўласцівасці таго ці іншага аб'екта. Кожны наступны этап дадае новыя звесткі да папярэдніх. Напрыклад: *У час пашырэння «тэорыі бесканфліктнасці» І. Шамякін уздымаў і сумленна вырашаў галоўную для пакалення «шасцідзесятнікаў» праблему праўды жыцця. Вакол гэтага паняцця з канца 50-х і ў 60-я гады вяліся вострыя, прынцыповыя спрэчкі творцаў. Тыя, хто ўсведамлялі неабходнасць кардынальных грамадска-ідэалагічных перамен, былі перакананы, што ў мастацкім творы неабходна праўдзіва, бескампрамісна, крытычна даследаваць жыццё (З. Мельнікава).*

Пры апісанні працэсаў навуковым стылем выкарыстоўваюць няпэўна-асабовыя выразы, якія даюць магчымасць засяродзіць увагу на дзеянні. Напрыклад: *Асноўным прынцыпам кожнага навуковага даследавання лічаць метадалагічны прынцып аб'ектыўнасці. Ён выражаецца ва ўсебаковым уліку фактараў, якія абумоўліваюць тую ці іншую з'яву, умоў, у якіх яны развіваюцца, адэкватнасці даследчыцкіх падыходаў і спосабаў, якія даюць магчымасць атрымаць праўдзівыя веды пра аб'ект.*

Асобна апісальныя ці інтэрпрэтацыйныя (тлумачальныя) навуковыя тэксты ў філалогіі, у літаратуразнаўстве функцыянуюць рэдка. Часцей карыстаюцца змешаным тыпам выкладу – інтэрпрэтацыйна-апісальным. У тэкстах-інтэрпрэтацыях даследуюць з'явы ці прадметы, раскрываюць іх унутраныя характарыстыкі. Інтэрпрэтацыя літаратурнага твора накіравана на спасціжэнне яго ідэйнай задумы, кола ўзнятых праблем, якія выраша-

юцца праз пэўную сістэму вобразаў, сюжэт, кампазіцыю, аўтарскую выяўленчую стылістыку і г.д. У такіх тэкстах магчымыя два спосабы разгортвання матэрыялу: 1) ад агульнага да прыватнага, ад абагульненняў да фактаў; спачатку падаецца тэзіс, а потым аргументы і ілюстрацыі да яго; 2) ад прыватнага да агульнага, ад назіранняў і фактаў да абагульненняў, высноў. Напрыклад: *У дысертацыі ўпершыню ў беларускім літаратуразнаўстве ставіцца тэарэтычная праблема гістарызму як метадалагічнага прынцыпа, які з'яўляецца навукова-тэарэтычнай асновай цэлага комплексу даследаванняў гісторыка-літаратурнага тыпу (гісторыка-генетычных, гісторыка-сацыялагічных, гісторыка-функцыянальных, гісторыка-біяграфічных). У дысертацыі ўпершыню: 1) прасочаны асноўныя этапы рэалізацыі прынцыпа гістарызму ў беларускім літаратуразнаўчым працэсе XX ст.; 2) разглядаюцца і ацэньваюцца тэарэтыка-метадалагічныя напрацоўкі айчыннага літаратуразнаўства па названай праблеме ў кантэксце пошукаў рускага савецкага і сучаснага, у тым ліку і замежнага, літаратуразнаўства; 3) паводле напрацовак сучаснага літаратуразнаўства ўдакладняецца аб'ём паняцця гісторыка-функцыянальная метадалогія (З. Мельнікава).*

*Доказ* у навуковым тэксце афармляюць дакладна, структуравана: тэзіс – аргументы (сістэма назіранняў) – выснова – абагульненне. Важна захоўваць моўную трапнасць для дасягнення сэнсавай выразнасці выказанага меркавання.

*Тэзісы* ўтрымліваюць адказ на пытанне: «Што даказваецца?», аргументы рэалізуюць мэту, надаюць тэарэтычнасці або практычнасці высновам, якія даказваюць сутнасць тэзіса, дэманструюць заканамерную сувязь з'яваў. Да тыповых моўных спосабаў абазначэння лагічных аперацый належаць дзеясловы 1-й асобы множнага ліку *назіраем, заўважаем, знаходзім, пераконваемся, прыходзім да высновы* або безасабовыя выразы: *можна назіраць, заўважаецца, варта адзначыць* і г.д.

Высновы доказу афармляюць пры дапамозе слоў *высновы, вывады, вынікі,* канструкцый *устаноўлена, што...; можна лёгка давесці, пераканацца...; гэта падцвярджаецца...; лічым, што гэта важкі і дастатковы доказ...*

Паводле сфер навуковых ведаў, тэксты гэтага стылю падзяляюць на *навукова-тэхнічныя* (утрымліваюць апісанні тэхнічных аб'ектаў, аналіз тэхналогій і г.д.), *навукова-прыродазнаўчыя* (тэксты па біялогіі, хіміі, фізіцы, геаграфіі, якія навукова апісваюць жывую і нежывую прыроду) і *навукова-гуманітарныя* (тэксты па філалогіі, культуралогіі, філасофіі, гісторыі, якія асэнсоўваюць феномен культуры, мастацтва, асобы і грамадства).

Спецыялісты-мовазнаўцы вылучаюць і падстылі, якімі часта карыстаюцца стваральнікі навуковых тэкстаў: уласна-навуковы, навукова-навучальны (дыдактычны), навукова-тэхнічны (вытворча-тэхнічны), навукова-

папулярны, навукова-інфарматыўны (навукова-рэфератыўны), навукова-даведачны (даведкава-энцыклапедычны), навукова-дзелавы. У межах навуковых тэкстаў вылучаюць таксама тэксты навукова-публіцыстычнага і навукова-фантастычнага падстыляў. Кожны падстыль адпавядае розным жанрам і відам тэкстаў: *уласна навуковым* стылем пішуцца артыкулы, дысертацыі, манаграфіі, навуковыя даклады; *навукова-папулярным* – нарысы, кнігі, лекцыі; *навукова-навучальным* – падручнікі, вучэбныя дапаможнікі, праграмы, зборнікі правіл, лекцыі, канспекты; *навукова-інфарматыўным* – рэфераты, анатацыі, рэцэнзіі, водгукі, агляды, рэзюме; *навукова-даведачным* – слоўнікі, энцыклапедыі, даведнікі, каталогі; *навукова-тэхнічным* – інструкцыі, патэнты, аўтарскія пасведчанні, дакладныя запіскі, службовыя лісты, прамысловая рэклама; *навукова-дзелавым* – навуковыя звесткі, даведкі аб выніках даследаванняў, дамовы аб навуковым супрацоўніцтве; *навукова-публіцыстычным* – навукова-публіцыстычны артыкул, хроніка, навуковы агляд, навуковае інтэрв'ю, рэпартаж; *навукова-фантастычным* – фантастычныя апавяданні, аповесці, раманы.

Паводле ступені абагульнення адрозніваюць першасныя і другасныя навуковыя жанры. Да *першасных* навуковых тэкстаў, мэта якіх – перадача першасных навуковых звестак, атрыманых у працэсе навуковых даследаванняў, належаць *манаграфія, дысертацыя, дыпломныя, магістарскія работы, навуковы артыкул, навуковы даклад* і нек. інш. Да *другасных* навуковых тэкстаў (іх мэта – апісанне зместу першасных тэкстаў) залічваюць *канспекты, рэфераты, анатацыі, рэцэнзіі, тэзісы, навуковыя агляды, навуковыя рэзюме, пратаколы пасяджэння навуковых таварыстваў, гурткоў* і нек. інш.

Па форме жанры навуковага маўлення падзяляюць на вялікія і малыя. Да *вялікіх* жанраў належаць дысертацыі, энцыклапедыі, манаграфіі, даведнікі, навучальныя дапаможнікі, да *малых* – навуковыя артыкулы, рэфераты, анатацыі, тэзісы, агляды, рэцэнзіі.

## 2.1. Акадэмічныя (уласна навуковыя), навукова-навучальныя і навукова-папулярныя тэксты

*Уласна навуковы (акадэмічны)* стыль выкарыстоўваюць для напісання першасных і другасных навуковых тэкстаў, якія ўтрымліваюць навуковую інфармацыю, даводзяць, абгрунтоўваюць яе навізну. Характэрнымі прыкметамі ўласна навуковых тэкстаў з'яўляецца акадэмічнасць выкладу, насычанасць тэрмінамі, кніжнасць, дакладнасць вызначэнняў, выразнасць, пераканаўчасць аргументацыі, сінтаксічных канструкцый, лагічная паслядоўнасць выкладу, лаканізм формы. Такія тэксты адрасаваны спецыялістам адпаведнага профілю.

Ва ўласна навуковым стылі пішуць наступныя тэксты:

1) манаграфію – аднаасобна, асабіста напісаную кнігу, у якой сабрана, сістэматызавана і абагульнена значная колькасць фактычнага матэрыялу, вынікі вялікага навуковага даследавання, зроблены пераканаўчыя высновы;

2) дысертацыю – арыгінальнае, самастойнае, навукова завершанае даследаванне, якое можа садзейнічаць развіццю пэўнай навуковай праблемы (для кандыдацкай дысертацыі) або адкрыццю новых напрамкаў у навуцы (для доктарскай дысертацыі);

3) навуковы артыкул – від навуковых публікацый, дзе апісваюцца канчатковыя або прамежкавыя вынікі даследавання, абгрунтоўваюцца перспектывы наступнага этапу іх распрацовак;

4) курсавую працу – даследаванне, якое прадугледжвае паглыбленне і абагульненне ведаў па пэўнай спецыяльнай ці прафесійна арыентаванай дысцыпліне (па асобных раздзелах або поўным навучальным курсе), развіццё даследчыцкіх навыкаў, здольнасці самастойнага асэнсавання навуковай праблемы;

5) дыпломную працу – навучальна-навуковае даследаванне, якое ўключае сістэматызацыю, замацаванне, паглыбленне тэарэтычных і практычных ведаў па базавай спецыяльнай навучальнай дысцыпліне і іх выкарыстанне для вырашэння канкрэтных навуковых і практычных задач у адпаведнай галіне ведаў. Дыпломныя працы таксама выкоўваць функцыі падрыхтоўчага этапу да магістарскага даследавання;

6) магістарскую працу (дысертацыю) – кваліфікацыйную самастойную навукова-даследчую работу, якая ўтрымлівае сукупнасць перспектыўных і актуальных праблем, адлюстроўвае творчы патэнцыял даследчыка, яго ўменне інтэрпрэтаваць розныя канцэпцыі і тэорыі, здольнасць да творчага асэнсавання аналізуемага матэрыялу, дэманструе ўзровень валодання прафесійнай тэрміналогіяй у абранай галіне ведаў. Магістарская праца, выкананая на ўзроўні грунтоўнага тэарэтычнага даследавання, можа стаць асновай для далейшай працы над кандыдацкай дысертацыяй.

У навуковым стылі пішуць працы малых жанраў – рэфераты, анатацыі, рэцэнзіі, навуковыя паведамленні, даклады і нек. інш.

*Навукова-навучальным падстылем* карыстаюцца пры напісанні падручнікаў, навучальных і метадычных дапаможнікаў, практыкумаў, навучальных праграм, курсаў лекцый, слоўнікаў, канспектаў, метадычных распрацовак, рэкамендацый, хрэстаматый і нек. інш. Навуковую інфармацыю ў такіх выпадках неабходна падаваць аргументавана і даходліва для студэнтаў ці вучняў. Навукова-навучальныя тэксты характарызуюцца дыдактычнай скіраванасцю, строгай лагічнасцю і паслядоўнасцю. Адбор

матэрыялу, змест і форма навучальнай літаратуры залежаць ад адрасаванасці – для вышэйшай школы, сярэдняй, іншых тыпаў школ.

*Лекцыі* уласціва лагічная строгасць, аб'ектыўнасць, паслядоўнасць у выкладзе думак, дакладнасць фармулёвак, выкарыстанне навуковых сінтаксічных стандартаў, наяўнасць тэрміналагічнай і абстрактнай лексікі, пэўная экспрэсіўная афарбоўка, выкарыстанне лагічных спосабаў уплыву і пераконвання.

Асноўная функцыя лекцыі – паведамленне інфармацыі, новых ведаў. Лекцыі падзяляюць па зместу (па прыродазнаўчых, тэхнічных, гуманітарных дысцыплінах), па розных відах вуснага маўлення (лекцыя-маналог, лекцыя-дыялог), па слухацкай аўдыторыі (для школьнікаў, студэнтаў, настаўнікаў, навукоўцаў), прысутнасцю-непрысутнасцю слухача (адрасата) (традыцыйная лекцыя, радыё-, тэлелекцыя).

У *метадычных рэкамендацыях* характарызуюцца пытанні тэмы, модуля (раздзелу) навучальнай дысцыпліны або практычнай дзейнасці. Практыкум змяшчае практычныя заданні і парады, накіраваныя на фарміраванне і развіццё прафесійных ведаў, уменняў і навыкаў. *Хрэстаматыя* – зборнік выбраных твораў або ўрыўкаў з іх, якія датычацца пэўнай галіны ведаў.

Да агульных характарыстык *падручніка і вучэбнага дапаможніка* належаць: навуковасць, аб'ектыўнасць выкладзенага матэрыялу; адпаведнасць навучальнай праграме; перспектыўнасць у працэсе развіцця навучальнага курсу; даходлівасць падачы матэрыялу. Але яны адрозніваюцца: падручнік змяшчае ўвесь абавязковы змест навучальнага курса, вучэбны дапаможнік дапаўняе падручнік і можа разглядаць не ўсе раздзелы, тэмы, праблемы, а толькі тыя, што, на думку аўтара, патрабуюць асаблівай увагі.

*Вучэбна-метадычны дапаможнік* – навучальнае выданне, якое акрамя выкладу вучэбнага матэрыялу змяшчае метадычныя ўказанні па выкладанні дысцыпліны або арганізацыі самастойнай працы студэнтаў (вучняў).

*Навукова-папулярныя тэксты* – гэта артыкулы, эсэ, навуковыя працы, інтэрв'ю, агляды навуковай інфармацыі. Задача навукова-папулярнай літаратуры – у даступнай і зразумелай форме з дапамогай розных прыёмаў актывізацыі ўвагі чытача (яскравыя вобразы, параўнанні) пазнаёміць чытача з навуковымі ведамі. Навуковыя палажэнні ў такіх тэкстах ілюструюць прыкладамі, пазбягаюць спецыяльных умоўных абазначэнняў, складаных схем. Замест вузкаспецыялізаваных тэрмінаў прапануюць агульнаўжывальную лексіку, падаюць спрошчаныя вызначэнні. Навукова-папулярным тэкстам уласцівы простыя сказы, радзей – складаныя сінтаксічныя канструкцыі. Напрыклад: *Міхась Мушынскі ўвесь час знаходзіцца ў творчым пошуку найбольш дзейснага кантакту акадэмічнай і педагагічнай навукі. Адным з прыкладаў такога пошуку можна назваць кнігу «Няскораны талент: Праўдзівая гісторыя жыцця і творчасці Міхася Зарэцкага» (2005). Яна склада-*

*еццa з двух раздзелаў. У першым раскрываюцца найбольш істотныя рысы творчага вобліку Міхася Зарэцкага, індывідуальная манера пісьма, па-новаму прачытваюцца многія творы, вялікая ўвага звернута на майстэрства пісьменніка. У другім раздзеле кнігі пададзены метадычныя рэкамендацыі да ўрокаў па вывучэнні творчасці пісьменніка ў школе (Т. Голуб).*

Асноўнай камунікатыўнай задачай зносін у навуковай сферы з'яўляецца выражэнне навуковых паняццяў і вывадаў. Мысленне ў гэтай сферы мае абстрагаваны, лагічны характар. Гэтым і абумоўлены такія спецыфічныя прыкметы навуковых тэкстаў, як абстрагаванасць, сцісласць, абагульненасць, дыялагічнасць, падкрэсленая лагічнасць, аб'ектыўнасць выкладу, выразнасць, сэнсавая дакладнасць, адназначнасць, інфарматыўная насычанасць. Яны характарызуюцца таксама нарматыўнасцю маўлення, прадметнасцю, доказнасцю, лаканічнасцю, пераканаўчасцю, аргументаванасцю. Гэтыя асаблівасці залежаць ад жанру, прадмета разгляду, адрасата.

*Абстрагаванасць і абагульненасць* навуковых тэкстаў ствараюцца выкарыстаннем назоўнікаў абстрактнага і абагульненага значэння, навуковых тэрмінаў, дзеясловаў цяперашняга часу ў «пазачасавым» значэнні. Напрыклад: *Сучаснае гісторыка-функцыянальнае даследаванне літаратурнай спадчыны сведчыць: большасць твораў першай трэці XX стагоддзя маюць значны патэнцыял метакамунікатыўнасці, анталагічную мнагаслойнасць. Асобныя – утрымліваюць аксіялагічна зменлівую сігнальна-вобразную структуру. Гэта абумоўлівае іх літаратуразнаўча-эстэтычную актуалізацыю ў новай сацыякультурнай прасторы, што выразна выяўляецца пры гісторыка-функцыянальным даследаванні творчасці З. Бядулі (З. Мельнікава).*

*Лагічнасць выкладу* выяўляецца ў паслядоўнасці выказвання, яго доказнасці і аргументаванасці, пабудовы тэксту ці выказвання ў адпаведнасці з законамі логікі, з захаваннем прычынна-выніковых адносін, сувязі прадмета даследавання з рэальнасцю. Гэта дасягаецца ўдумлівай распрацоўкай кампазіцыі, структуры працы ці дакладу. Даследчык павінен уважліва ставіцца як да частак, так і да ўсяго тэксту, клапаціцца аб звязанасці і дакладнасці выказвання думак, аб сэнсавай логіцы кампазіцыі. Дзейсным спосабам выражэння лагічных сувязяў могуць стаць спецыяльныя функцыянальна-сінтаксічныя сродкі, што ўказваюць на паслядоўнасць развіцця думкі (*спачатку, найперш, потым, па-першае, па-другое* і г.д.), пярэчанні (*але, затое, тады як, аднак* і г.д.), прычынна-выніковыя адносіны *(такім чынам, таму, дзякуючы таму, адпаведна з тым, як вынік таго, акрамя таго, да таго ж),* пераход ад адной думкі да іншай, рубрыкацыя тэксту *(перш, чым перайсці да..., звернемся да..., разгледзім, спынімся на..., разгледзеўшы..., пяройдзем да..., важна спыніцца на..., мэтазгодна разгледзіць),* вынік, выснову *(такім чынам, вышэй сказанае*

*дае магчымасць зрабіць выснову, падсумоўваючы сказанае, зазначым, падкрэслім…).*

*Сэнсавай дакладнасці і адназначнасці* выказвання дасягаюць шляхам выкарыстання тэрмінаў і слоў у прамым значэнні, удакладненняў у выглядзе зносак, спасылак, цытат, прозвішчаў, лічбаў, якія аргументуюць навуковыя палажэнні і ўзмацняюць аб'ектыўнасць і даставернасць выкладзенага. Недарэчна ўжытае ў навуковым тэксце слова можа прывесці да дваякага разумення і тлумачэння цэлага выказвання.

Адным з паказчыкаў агульнага навуковага і культурнага ўзроўню даследчыка з'яўляецца правільнае і вольнае валоданне тэрміналогіяй. *Тэрмін* – слова або словазлучэнне, які абазначае спецыяльнае паняцце з пэўнай галіны ведаў або дзейнасці. Каштоўнасць тэрміна ў тым, што ён нясе спецыяльную лагічную інфармацыю вялікага аб'ёму. Тэрміналогію нельга выкарыстоўваць адвольна. Неабходна памятаць, што кожная галіна навукі мае ўласцівую толькі ёй тэрміналагічную сістэму. У навуковым тэксце без патрэбы не ўжываюць прафесійную лексіку. *Прафесіяналізмы* – словы і выразы, пашыраныя ў пэўным навуковым асяроддзі. Іх ужываюць для абазначэння спецыяльных паняццяў пэўнай прафесіі: *літаратурны жанр, эпітэт, метафара, мастацкі стыль, вершаваны памер, ямб, байка* – гэта прафесійная тэрміналогія з літаратуразнаўства.

*Аб'ектыўнасць* выкладу (розныя погляды, адсутнасць суб'ектывізму, безасабовасць выражэння, засяроджанасць на прадмеце даследавання) выяўляецца ва ўзважаным асэнсаванні ступені даследаванасці праблемы, шляхоў яе вырашэння, эфектыўнасці пэўнай тэорыі, узроўню завершанасці яе вывучэння, у абгрунтаванасці вынікаў, праведзенага аналітычнага даследавання матэрыялу і г.д. Указанне на крыніцу паведамлення (каму канкрэтна належыць выказаная думка, ацэнка, тэорыя) прыводзіцца з ужываннем устаўных слоў і словазлучэнняў: *на думку…, паводле высноў (назіранняў)…, аўтар (вучоны, даследчык) пераканаy…* і г.д. Аб'ектыўнасць дасягаецца праз неўжыванне эмацыйна афарбаваных выразаў, слоў, экспрэсіўных мадэляў выказвання, дзякуючы перавазе нейтральнага парадку слоў, адсутнасцю клічных інтанацый, абмежаваным і матываваным ужываннем пытальных, выкарыстаннем безасабовых, неазначальна- і азначальна-асабовых выказванняў: *заўважана, назіраецца, неабходна падкрэсліць, варта засяродзіцца, можна прыйсці да высновы* і г.д.

Выяўленнем аб'ектыўнасці ў навуковых тэкстах з'яўляецца таксама *грунтоўны агляд літаратурных крыніц па праблеме даследавання*, з абавязковым указаннем спасылак. Ігнараванне гэтага можа быць расцэнена як плагіят.

*Лагічная паслядоўнасць навуковай работы* заключаецца ў паслядоўнай сувязі раздзелаў, паслядоўнай канкрэтызацыі выказанай думкі ці

тэзіса, у іх дапаўненні, паглыбленні, што ўвогуле спрыяе добраму ўспрыманню тэксту.

*Дакладнасць вуснага навуковага выказвання* дасягаецца дзякуючы выразнай дыкцыі, ужыванню лагічных і фанетычных націскаў, правільнаму інтанаванню, спакойнаму, роўнаму тону. *На пісьме дакладнасць* выяўляецца ў паслядоўнасці выкладу матэрыялу, у лагічным разгортванні думкі, дакладных вызначэннях, паўторах ключавых слоў, у чляненні навуковага тэксту на абзацы.

*Сцісласць навуковага тэксту* дасягаецца ўменнем даследчыка пазбягаць непатрэбных паўтораў, шматслоўя, моўнай празмернасці. Хаця навуковы тэкст і маналагічны, яму ўласціва скіраванасць да адрасата. Так навуковец павінен паведаміць пра мэту даследавання *(спынімся на..., асэнсуем..., прааналізуем...),* кваліфікаваць свае дзеянні *(прывядзем прыклад, разгледзім, праілюструем),* імкнуцца выказаць уласнае бачанне адносна ўзнятай праблемы, падыскутаваць са спецыялістамі. Гэту адзнаку навуковага стылю вызначаюць як *дыялагічнасць,* якая выражаецца ва ўжыванні праблемных пытанняў, цытат, ацэначных выказванняў. Напрыклад: *Сёння зусім відавочна, што крытыка-літаратурны працэс канца 20-х – пач. 30-х гадоў вызначаўся разбуральнай супярэчлівасцю. Аб гэтым сведчаць наступныя факты: згортвалася навукова-гістарычная праблематыка даследаванняў, запанавала тэндэнцыя адмаўлення ад літаратуры мінулага, многае ў літаратурнай спадчыне ігнаравалася ці ўвогуле ганьбавалася, дэрэктыўна забаранялася. Так, напрыклад, тагачасная крытыка адмаўляла ідэйна-эстэтычнае значэнне і багацце спадчыны вялікіх папярэднікаў і сучаснікаў – В. Дуніна-Марцінкевіча, Ф. Багушэвіча, Я. Купалы, Я. Коласа, М. Багдановіча, М. Гарэцкага, З. Бядулі... Пад моцным прэсінгам таталітарнай ідэалогіі адбывалася вульгарызацыя эстэтычных ацэнак літаратуры мінулага. Напрыклад, крытык М. Байкоў зусім адмаўляў спадчыну М. Багдановіча. Працытуем: Максім Багдановіч з боку сваёй ідэалогіі і літаратурных інтарэсаў-нахілаў – увесь у далёкім мінулым, і яго творчасць непасрэднай цікавасці з погляду сучаснасці не выяўляе. Яго вершы ... наскрозь прасякнутыя чужым нашаму часу ідыялістычным светапоглядам, зусім не будуць даступнымі для шырокіх колаў сялян і работнікаў, для якіх у першую чаргу павінна прызначацца нашая літаратура.*

*Яшчэ больш рашуча адмаўляў каштоўнасць спадчыны М. Багдановіча крытык А. Кучар. Вось як ён ацэньваў паэзію аўтара «Вянка»: Агульная ідэёвая ўбогасць творчасці М. Багдановіча, адрыў ад жыцця, містыцызм, розныя жахлівыя вобразы лесуноў, падвеяў, пугачоў, якія мучаюць паэту, захапленне мінуўшчынай..., захапленне «чыстым мастацтвам», якое нібыта і не мае дачынення да класавых боек і класавага змагання... Творчасць М. Багдановіча была рэакцыйнай па самой сваёй сутнасці*

*(«Маладняк». 1931. № 6–7. С. 124–125)* (з працы З. Мельнікавай «Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства». Брэст, 2004. С. 54).

Інфарматыўная насычанасць навуковага тэксту – гэта ступень сэнсавай і зместавай яго навізны, што выяўляецца ў аўтарскай канцэпцыі, сістэме аўтарскіх ацэнак. Гэтага дасягаюць шляхам доказнасці і аб'ектыўнасці выкладу, насычанасці вузкаспецыялізаванымі і агульнанавуковымі тэрмінамі. Напрыклад: *Даследуючы і абгрунтоўваючы гістарызм як метадалагічны прынцып, мы будзем паслядоўна захоўваць канструктыўныя адносіны да напрацовак у гэтым накірунку савецкага, і перадусім, беларускага літаратуразнаўства.*

*Праз абагульненне вопыту беларускіх навукоўцаў мінулага ў гэтым раздзеле даследавання праблема гістарызму будзе разгледжана: а) у агульнатэарэтычным плане функцыянавання гістарызму ў беларускім літаратуразнаўстве; б) у канкрэтнай, практычнай рэалізацыі гістарызму ў працах беларускіх крытыкаў і літаратуразнаўцаў XX ст.; в) у суадносінах гістарызму з іншымі катэгорыямі літаратуразнаўства (рэалізм, сацыялагізм, класавасць, народнасць і нек. інш.)* (Мельнікава З. Тамсама. С. 42).

Як бачым, навуковыя тэксты ствараюцца ў розных падстылях (уласна навуковы, навукова-вучэбны, навукова-папулярны, навукова-даведачны і інш.) і жанрах (навуковы артыкул, манаграфія, дыпломная праца, дысертацыя і г.д.). Навуковыя тэксты актыўна абслугоўваюць навукова-філалагічную галіну – паведамляюць, удакладняюць, канкрэтызуюць, ацэньваюць, забяспечваюць навуковы дыялог і палілог у формах пісьмовага і вуснага маўлення.

## 3. Культура вуснага і пісьмовага навуковага выказвання

Разуменне выказвання адбываецца шляхам яго ўспрыняцця, слухавога ці зрокавага, і асэнсавання, спасціжэння зместу. Той, хто выражае думку, – аўтар маўлення (адрасант), той, хто ўспрымае гэта выказванне, – рэцыпіент (адрасат). Ён можа быць прамым адрасатам (яму прызначана паведамляемая інфармацыя) або апасродкаваным, калі ў вусных зносінах аўтар выказвання, звяртаючыся да адной асобы, дапускае, што яго чуюць і іншыя, якім гэта інфармацыя таксама прызначана.

Прыкметы *вуснага* навуковага выказвання: незваротнасць, паступальны і лінейны характар разгортвання ў часе, нязмушанасць, экспрэсіўнасць. Для яго характэрны выразная інтанацыя, адпаведныя міміка і жэсты, а таксама пэўны тэмп і рытм маўлення.

*Пісьмовае* выказванне другаснае паводле вуснага і разлічана на зрокавае ўспрыняцце і трывалае захаванне інфармацыі.

*Вуснае выказванне бывае:* маналагічнае, дыялагічнае, полілагічнае; сітуатыўнае, кароткачасовае, непасрэднае, незваротнае; спантаннае, імпульсіўнае, часта непадрыхтаванае; разлічанае на непасрэднае слухавое ўспрыняцце, на канкрэтнага адрасата; імправізаванае, эмацыйнае, экспрэсіўнае, без прадуманых загадзя фактаў, з паўторамі, зваротамі да ўжо сказанага; мае паступальны, лінейны характар разгортвання ў часе, часцей кароткачасовае; неструктураванае. Формы і жанры: *дыялог, маналог, палілог, гутарка, выступленне, дыскусія, дыспут, спрэчка.*

*Пісьмовае* выказванне бывае: пераважна маналагічнае, існуе мажлівасць перачытвання, папярэдне абдуманае; разлічана на зрокавае ўспрыняцце, часта без уліку адрасата; уласцівы поўны і грунтоўны выклад думак; магчымасць многаразовага перапісвання і рэдагавання; мае ўласцівасць трывалага захавання інфармацыі, дакладна структураванае. Формы і жанры: *апісанне, роздум, план, тэзісы, канспект, рэферат і г.д.*

Вусная форма навуковага маўлення заклікана забяспечыць дакладнае ўспрыняцце зместу з дапамогай інтанацыі, тэмпу маўлення, паўз. Немажлівасць вярнуцца да ўжо вымаўленых слоў і фраз прымушае прамоўцу гаварыць і мысліць адначасова. Таму вуснаму выказванню часта ўласціва фрагментарнасць. Навуковае вуснае маўленне можа быць падрыхтаваным загадзя (выступленне, лекцыя). Падрыхтаванае вуснае выказванне характарызуецца больш дакладнай структурай, а непадрыхтаванаму вуснаму маўленню ўласціва спантаннасць: выказванне фарміруецца, звычайна, пэўнымі кавалкамі, паяднанымі паўзамі.

Прыемнае ўражанне на чытачоў аказваюць інтанацыя, змястоўная, вобразная, выразная і зразумелая мелодыка мовы. Важную ролю пры гэтым адыгрываюць разнастайнасць танальных малюнкаў, чыстата і выразнасць тэмбру, гнуткасць, рухомасць, эмацыйная насычанасць фраз.

Правільнае і дакладнае вымаўленне слоў указвае на ўнутраную дысцыпліну прамоўцы, а недакладнасць, паспешлівасць, звычайна, сведчаць пра няўпэўненасць. Занадта гучнае і эмацыйнае маўленне стварае ўражанне навязвання пэўнай пазіцыі, занадта ціхае і павольнае – можа пашкодзіць добраму ўспрыманню сэнсу. Паяднанне інтанацыйных элементаў выказвання (узмацненне інтэнсіўнасці голасу, разнатэмпавая структура сказаў, эматыўныя інтанацыі, інтанацыі важнасці і г.д.) характарызуюць індывідуальны інтанацыйны стыль прамоўцы. Істотнае значэнне для прамоўцы маюць інтанацыі важнасці, якія дапамагаюць аддзяліць галоўную інфармацыю.

У навуковым выказванні шырока карыстаюцца абстрактнай лексікай, якая перадае якасць *(постмадэрнісцкі стыль, народны верш)*, узаемасувязь *(літаратурныя ўплывы, купалаўскія традыцыі)*, дзеянне, працэс *(асэнсаванне вобразнасці, узнаўленне зместу, актуалізацыя жанраў)*, сукупнасць

*(тэматыка, праблематыка, кола матываў, канцэптуальная акрэсленасць).* Кожная галіна навукі аперыруе пэўнымі тэрмінамі, значэнне якіх тлумачаць энцыклапедычныя, літаратуразнаўчыя слоўнікі (напрыклад, Рагойша В. «Паэтычны слоўнік». Мінск: Беларуская навука, 2004, або Рагойша В. «На шляху да Парнаса»: Даведнік маладога літаратара. Мінск: Мастацкая літаратура, 2003). Тэрмінам уласцівы такія якасці: намінатыўнасць (называнне), дакладнасць навуковай дыфініцыі, тэндэнцыя да адназначнасці ў межах пэўнай навуковай галіны (у нашым выпадку – літаратуразнаўства), адсутнасць экспрэсіўных значэнняў, стылістычная нейтральнасць, высокая інфарматыўнасць, пераважна вузкапрафесійная сфера пашырэння, адсутнасць дадатковых семантычных адценняў, абстрагаваны логіка-паняційны характар, сістэмная арганізацыя ў межах пэўнага паняційнага поля, неметафарычнасць.

Немэтазгодна ў навуковым тэксце без неабходнасці ўжываць запазычаную тэрміналогію ці тэрміны з іншых галін. У сучасным беларускім навуковым стылі актыўна функцыянуюць іншаземныя тэрміны: *прэзентацыя, патэнцыял, элемент* і мноства іншых. Запазычанымі даўно з грэчаскай, лацінскай, французскай моваў з’яўляюцца многія літаратуразнаўчыя тэрміны: *троп, амфібрахій, інтанацыя, катрэн, жанр* і г.д. У навуковым стылі не выкарыстоўваюць словы і выразы абмежаванага ўжывання *(архаізмы, жарганізмы, дыялектызмы).* Патрэба ў выразнасці і дакладнасці навуковага стылю абумоўлівае выкарыстанне адпаведных эпітэтаў: *даследванне – фундаментальнае, глыбокае, наватарскае, эксперыментальнае; пытанне – прынцыповае, тэарэтычнае, важнае, складанае, дыскусійнае; праблема – навуковая, актуальная, важная, вострая; мэта – асноўная, рэальная, пастаўленая, дасягнутая; заданні – канкрэтныя, вызначаныя, абагульняючыя; інфармацыя – дакладная, вычарпальная, поўная, неабходная; матэрыял – навуковы, аналітычны, даследаваны, сабраны, сістэматызаваны, фактычны, тэарэтычны, практычны, атрыманы; аналіз тэмы, праблемы – навуковы, аб’ектыўны, праведзены, параўнальны, глыбокі; эксперымент – важны, падобны, аналагічны, унікальны, паспяховы* і г.д.

Фразеалогія навуковага тэксту павінна выражаць лагічныя сувязі між часткамі выказвання *(як паказаў аналіз тэксту, неабходна прывесці прыклады, адсюль вынікае, на аснове праведзеных назіранняў, аддаць належнае, звярнуць увагу, прывесці аргументы, грунтавацца на фактах)* і абазначаць пэўныя паняцці *(ступень даследаванасці, навуковая навізна, тэарэтычнае значэнне, практычная значнасць, актуальнасць вынікаў).*

Найбольш пашыраны ў навуковых тэкстах назоўнікі з абстрактным значэннем і аддзеяслоўныя назоўнікі *(вывучэнне, асэнсаванне, даследаванне, апрабацыя, назіранне, абагульненне).* Сярод прыметнікаў у навуковым

стылі пераважаюць адносныя *(аналітычны, канцэптуальны, кампрамісны, наватарскі, актуальны, традыцыйны)*, а таксама ступені параўнання якасных прыметнікаў *(менш крытычны, больш удалы, найбольш мэтазгодны, найменш зразумелы)*. Адназначныя лічэбнікі, якія не з'яўляюцца адзінкамі вымярэння, у навуковым тэксце запісваюць словамі, складаныя і састаўныя колькасныя, дробавыя лічэбнікі – лічбамі. Займеннікі малаўжывальныя ў навуковым тэксце. Не выкарыстоўваюцца займеннікі «Я», «ТЫ». Займеннік «МЫ» ўжываюць, калі неабходна прадставіць думку пэўнай групы людзей, аднак часцей ён функцыянуе ў словазлучэннях: *на нашу думку, на наш погляд*. Займеннік «ВЫ» ўжываюць у вусным і пісьмовым маўленні для выражэння павагі, пашаны: Прашу *Вас, шаноўны калега, выказаць сваю думку...* Не заўсёды этычна ў навуковым маўленні карыстацца займеннікамі *ён, яна, яны*. Прысутную на пасяджэнні асобу патрэбна назваць па імю і імю па бацьку ці па прозвішчу. Пашырана форма выкладу ад 3-й асобы: *вучоны мяркуе, пісьменнік пераконвае, даследчыкі разглядаюць*. У навуковай мове карыстаюцца ўказальнымі займеннікамі *такі, гэты, той* з прыназоўнікамі, якія абазначаюць лагічныя сувязі між часцінамі выказвання: *у такім выпадку, з гэтай мэтай*. Недарэчна ў навуковым тэксце ўжываць неазначальныя займеннікі *штосьці, калісьці, што-небудзь*.

Навуковыя тэксты і маўленне характарызуюцца значнай колькасцю дзеяслоўных форм, большасць якіх ужываецца ў цяперашнім часе і абазначаюць пачатак, заканчэнне дзеяння або канстатацыю факта: *пачынаць, выканаць, разглядаць, выяўляць, спасцігаць, ахарактарызаваць, інтэрпрэтаваць, матываваць, даводзіць*. Многія дзеясловы ў навуковым тэксце выконваюць ролю звязкі *(будуць праведзены тыпалагічныя жанравыя даследаванні, стануць ужывацца, будзе ажыццяўляцца)*, ужываюцца ва ўстойлівых дзеяслоўна-іменных словазлучэннях *(браць удзел, прытрымлівацца меркавання, ставіць праблему)*, інфінітыў з мадальным словам *(неабходна адзначыць, варта падкрэсліць, у папярэднім раздзеле было разгледжана, падобнае вырашэнне пытання ўяўляецца мэтазгодным)*. Варта пазбягаць ненарматыўных формаў ужывання дзеепрыметнікаў і дзеепрыслоўяў у навуковай мове. Нельга казаць і пісаць: *выступаючы на канферэнцыі магістрант, кіруючы пасяджэннем спецыялізаванай вучонай рады прафесар, адказваючы на пытанні дысертант*.

Аўтары навуковых прац шырока карыстаюцца прыслоўямі *(глыбока, дасканала, абавязкова, вычарпальна, дэталёва)*. У навуковым тэксце частаўжывальныя прыметнікі, якія надаюць усяму выказванню мадальныя адценні сцвярджэння, пярэчання, верагоднасці, мажлівасці або немажлівасці, звязанасці *(безумоўна, мажліва, звычайна, нарэшце, па-першае)*. Прыназоўнікі ў навуковых тэкстах дапамагаюць выражаць адносіны абмежавання *(у межах манаграфіі, у галіне філалогіі, у рамках навуковага*

*тэксту).* Для навуковага стылю характэрны складаныя прыназоўнікі тыпу *на думку, на наш погляд, паводле паведамлення, з пункту гледжання.*

*Сінтаксіс навуковага маўлення* характарызуецца кніжнасцю, злучнікавай сувяззю, складанымі канструкцыямі і адначасова выразнай фармулёўкай думкі. Увагу чытача актывізуюць выразы тыпу: *высветлім гэта пытанне больш дэталёва; прапануем карыстацца такім тэрмінам.* Патрэба прытрымлівацца лагічнай паслядоўнасці, доказаў, аргументаванасці, высвятляць прычыны і вынікі паводле прааналізаванага матэрыялу абумоўлівае выкарыстанне простых, але ўскладненых аднароднымі членамі, адасабленнямі ці ўстаўнымі канструкцыямі выказванняў: *Адметнай рысай сапраўднага беларускага вучонага, і асабліва педагога-філолага, з'яўляецца яго беларуская элітарнасць. У нашым народзе, у тым ліку і сярод інтэлігенцыі, жыве досыць стойкае ўяўленне пра эліту як адукаваных, духоўна і культурна выбітных асоб з высокімі ідэаламі і высакароднымі дзеяннямі на карысць агульна-грамадскіх інтарэсаў беларускага народа.* У навуковых тэкстах ужываюцца складаназлучальныя і складанападпарадкавальныя канструкцыі; складаназлучальныя трапляюцца радзей і іх часткі можна лёгка перастаўляць. Больш пашыраны падпарадкавальныя канструкцыі з адпаведнымі злучнікамі: *што, бо, каб, таму што, паколькі, у сувязі з тым, нягледзячы на тое і інш.* Напрыклад: *Даследчык В. Каваленка перасцерагаў, што сучасныя адносіны да літаратурнай спадчыны павінны быць толькі творчымі, сумленнымі, навуковымі і не мець нічога агульнага са штучнай, робленай актуалізацыяй. Несумненна, што фальшывая актуалізацыя стварае адпаведную гісторыю літаратуры.*

Навуковы пісьмовы тэкст арыентаваны на інтэлектуальна-зрокавае ўспрыняцце. У яго аснове – выклад у форме апісанняў, аналізу, меркаванняў, доказаў і высноў. Таму, рыхтуючы навуковы тэкст, неабходна ўлічваць усе нормы літаратурнай мовы і асблівасці навуковага стылю.

Даследчык-літаратуразнавец павінен пастаянна знаёміцца са здабыткамі ў тэорыі і гісторыі літаратуры, з новымі метадалагічнымі падыходамі, а таксама цікавіцца сучасным станам і развіццём сумежных і блізкіх да літаратуразнаўства філалагічнай, гістарычнай, псіхалагічнай, культуралагічнай і некаторых іншых навук. Поспеху навуковай дзейнасці спрыяюць матывацыйны, эмацыйна-эстэтычны, кагнітыўны кампаненты: сфарміраванасць стойкай, усвядомленай патрэбы займацца даследаваннем слоўнага мастацтва, эмацыйна-ацэначных адносін і ўстойлівай цікавасці да асэнсавання літаратурнага працэсу, яго гісторыі і сучаснасці, перакананасць у грамадска-навуковай значнасці шырокіх філалагічна-гуманітарных ведаў, жаданне здзяйсняць свой уласны навуковы пошук, выпрацоўка даследчыцкага густу шляхам пашырэння філалагічнага кругагляду, прафесійнае задавальненне ад сваёй дзейнасці.

## 4. Метадалогія і культура стварэння навуковага філалагічнага тэксту

Навуковы тэкст уяўляе цэласны камунікатыўны блок, які мае дакладна лагізаваную структуру з унутрана завершанымі часткамі (раздзеламі, падраздзеламі, пунктамі, параграфамі, абзацамі), насычанымі адпаведнай навуковай тэрміналогіяй. Тэкст заўсёды суадносіцца з камунікатыўнай сітуацыяй і яе антрапацэнтрамі: аўтарам і адрасатам, г.зн. суб'ектам маўлення і яго партнёрамі па камунікацыі.

Навуковыя тэксты арыентаваны *на чытача-спецыяліста*, падрыхтаванага да ўспрыняцця прапануемай інфармацыі. Іх зместам з'яўляюцца навуковыя веды, якім уласцівы анталагічнасць, метадалагічнасць, аксіялагічнасць, камунікатыўнасць. Акрамя гэтага, навуковы тэкст можа ўяўляць пэўную паслядоўнасць разнастайных фактаў, падзей і думак.

Навуковы філалагічна-літаратуразнаўчы тэкст нельга стварыць без папярэдняга асэнсавання літаратуразнаўча-тэарэтычнага, крытычнага і мастацка-тэкставага матэрыялу, без устанаўлення, канстатацыі і абдумвання, аналізу фактаў і асаблівасцяў літаратурнага працэсу, жыцця і творчасці пісьменніка, этапаў яго творчай эвалюцыі, станаўлення і г.д. У іншым выпадку навукова-літаратуразнаўчы тэкст будзе нагадваць агляд, рэферат і выконваць толькі інфарматыўную, а не даследчыцкую функцыю.

***Метадалогія літаратуразнаўства прапануе прытрымлівацца існуючых прынцыпаў напісання навуковых тэкстаў:***

а) прынцып зместавай насычанасці, які заключаецца ў навізне спецыяльнай інфармацыі, яе пазнавальнай каштоўнасці;

б) прынцып навуковай значнасці, што выяўляецца ў паведамленні неабходнай тэарэтычнай, метадалагічнай, літаратурна-філалагічнай інфармацыі;

в) прынцып навуковай інфарматыўнасці, накіраваны на выяўленне сэнсавай і зместавай навізны навуковага тэксту, што раскрываецца ў наватарскай аўтарскай канцэпцыі, ацэнцы творчасці пісьменніка ці пэўнага твора, або пэўнага літаратурнага перыяду;

г) прынцып навізны навуковага тэксту, што характарызуецца наяўнасцю новых тэарэтычных палажэнняў, новых ведаў, якія абгрунтаваны на аснове фундаментальных або прыкладных навуковых даследаванняў і рэалізаваны на практыцы;

д) прынцып зместавай завершанасці, які выяўляецца ў цэласнасці вырашэння пастаўленых задач;

е) прынцып праблемнасці, які прадбачыць неабходнасць вылучэння праблемных пытанняў у назвах раздзелаў, змесце асобных параграфаў і ўсяго навуковага тэксту;

ё) прынцып даступнасці спецыялістам адной ці некалькіх галін літаратуразнаўства, філалогіі, што абазначае зразумеласць, адэкватнасць успрыняцця інфармацыі карыстальнікамі, рэцыпіентамі (навукоўцы, аспіранты, магістранты, студэнты-філолагі, спецыялісты-гуманітарыі);

ж) прынцып інтэртэкстуальнасці, які харакратызуюць як многалучную сувязь дадзенага навуковага тэксту з іншымі (літаратуразнаўча-філалагічныя тэксты карэлююцца з лінгвістычнымі, навукова-гістарычнымі, педагагічнымі, сацыялагічнымі, культуразнаўчымі і інш.). Некаторыя вучоныя настойваюць таксама на асаблівым спосабе пабудовы сэнсу навуковага тэксту – на так званым дзялозе з пэўнаю чужой навуковай пазіцыяй, на ўзаемадзеянні свайго і чужога сэнсу, на далучэнні чытача-рэцыпіента да аўтарскага меркавання.

Навуковаму тэксту ўласціва *пэўная кампазіцыя:* кожны кампанент з'яўляецца значнай структурна-сэнсавай адзінкай, г.зн. можа выконваць функцыі тлумачэння, абгрунтавання, удакладнення, дапаўнення і інш.

Выражэнне аўтарскіх адносін да выказваемага даследчыкі называюць *мадальнасцю тэксту.*

Важныя характарыстыкі навуковага тэксту – цэласнасць, структураванасць, лагічнасць, тэарэтычная, інфармацыйная, насычанасць, навуковасць, завершанасць, паслядоўнасць, камунікатыўнасць і інш.

*Цэласнасць навуковага тэксту* прадугледжвае ўнутраную арганізаванасць, сэнсавае адзінства, аднолькавае, паслядоўнае афармленне тэксту ад пачатку да канца. Цэласнасць тэксту выяўляецца ў лагічнасці пераходаў між сэнсава-структурнымі часткамі, аб'яднанымі тэматыкай, праблематыкай, гіпотэзай даследавання і нек. інш.

*Структураванасць, лагічнасць навуковага тэксту* заключаецца ў паяднанні яго кампанентаў між сабою па зместу. Лінейнае разгортванне тэксту суправаджаюць словы *гэты, той, такі, гэта, усё гэта, тут, зазаначаны, падобны, аналагічны,* якія ўказваюць на еднасць або блізкасць суб'ектаў дзеяння. Лагічнасці выкладу навуковага тэксту спрыяюць выразы і моўныя адзінкі, якія выражаюць прычыну і вынік *(таму што, бо, улічваючы гэта, па той (гэтай) прычыне); умову (дзякуючы таму што) і вынік (паколькі, у выніку таго, у сувязі з тым, згодна з тым, паводле гэтага, у такім выпадку (разе), на гэтай падставе і нек. інш.)*

Структураванасць тэксту павінна выражаць адносіны, якія існуюць паміж раздзеламі і падраздзеламі (параграфамі) тэксту. *Паслядоўнасць* у навуковым тэксце можа рэалізавацца пры дапамозе спецыяльных функцыянальна-сінтаксічных спосабаў, якія ўказваюць на парадак развіцця разважанняў *(найперш, спачатку, зараз, потым, у заключэнне)*, пераход ад адной думкі да іншай *(разгледзім, спынімся на..., пяройдзем да...)*, вынік, высновы *(такім чынам, як бачым, падсумуем, як можна перраканацца).*

*Камунікатыўнасць* прадугледжвае скіраванасць тэксту да адпаведнага адрасата.

*Навуковасць* выяўляецца ў аб'ектыўным даследаванні твора, творчасці, літаратурнага працэсу пэўнага перыяду і г.д. і ў высвятленні іх заканамернасцяў і ўзаемасувязяў, узаемаабумоўленасці і г.д.

*Найменшымі структурнымі адзінкамі* навуковага (і ўсякага іншага) тэксту з'яўляюцца *абзацы*, якія перадаюць *паслядоўнасць думак і разваг аўтара, іх завершаны характар*. Кожны абзац, як правіла, развівае думку папярэдняга, вынікае з яго і звязаны сэнсам з наступным. У абзацы *важную ролю адыгрывае першы сказ*. Каб галоўная думка, сфармуляваная ў ім, разгортвалася і далей, у наступных сказах варта захаваць паўтор аднаго і таго ж ключавога слова, словазлучэння ці адпаведных займеннікаў і сінанімічных выразаў. Дакладнае структураванне тэксту на абзацы дапамагае асэнсаваць і ўсвядоміць прачытанае. Напрыклад:

Крыж *маральнай адказнасці* за лёс свайго народа **Змітрок Бядуля**, як і яго герой, нёс усё жыццё. Настойваючы на абуджэнні народнай *самасвядомасці і самапавагі*, **пісьменнік** у сваёй творчасці завастраў увагу на *хрысціянскай маральнасці*. **Ён** у сваіх творах сцвярджаў, што *хрысціянскае самаўдасканаленне* – гэта крыніца <u>духоўнай моцы чалавека</u>, а адраджэнне <u>душы кожнага беларуса</u> – падмурак усяго нацыянальнага Адраджэння. Таму ***кніжна-біблейскі архетып*** у **яго** творах першага дзесяцігоддзя ХХ ст. сінтэзаваны з уласна-беларускім – народным, фальклорным. Але лёгка пераканацца, што ў многіх творах **Змітрака Бядулі** гэтага часу менавіта ***біблейскі архетып*** выступае дамінантным (Мельнікава З. Беларускае гісторыка-функцыянальнае літаратуразнаўства. Брэст, выд-ва БрДУ імя А.С. Пушкіна, 2003. С. 130).

Абзац у навуковым тэксце можа складацца з аднаго сказа, калі яму надаецца асаблівае значэнне. Напрыклад:

*На каардынатах узаемадзеяння побыту і быцця добра праглядваецца дынаміка руху філасофскай тэндэнцыі, якая заўсёды надавала ідэйнавобразнаму ладу мастацкага твора сілу і глыбіню пазнання, умацоўвала ў літаратуры рэалістычны і эпічны патэнцыял (Жураўлёў В. Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана. Мінск: Бел. навука, 2004. С. 25).*

Нягледзячы на тыповасць, кожны навуковы тэкст індывідуальны. Гэта залежыць ад аўтара і яго досведу ў тэкстастварэнні.

## 5. Віды навуковых тэкстаў

Навуковыя тэксты ў адпаведнасці з функцыянальным прызначэннем падзяляюцца на пэўныя *віды* – аглядавы, метадалагічны, эмпірыка-факталагічны, тэарэтычны, тлумачальны, дадатковы, навуковы тэкст змешанага тыпу.

*Аглядавы тэкст* забяспечвае навуковае абгрунтаванне прадмета даследавання, устанаўлівае межы гэтага даследавання, паказвае ступень нявывучанасці яго пэўных аспектаў. Напрыклад:

*Накапленне багатага фактычнага матэрыялу, вяртанне рэпрэсаванай спадчыны, уключэнне ў літаратурны працэс твораў пісьменнікаў беларускага замежжа, напрацоўкі ў галіне тэорыі літаратуры, высокі ўзровень сучаснай філалагічнай навукі, прыкметныя змены сацыякультурнага парадку – усё гэта павінна актывізаваць развіццё тэарэтыка-метадалагічных аспектаў айчыннага літаратуразнаўства. Узнікаюць новыя суадносіны мастацкага тэксту з філасофска-абагуляняючымі, навукова-тэарэтычнымі і нават сімваліка-метафарычнымі спосабамі яго сучаснага ўспрыняцця і асэнсавання; практыкуецца многападыходнасць да твора з мэтай яго ўсебаковага вывучэння, арыентацыя на сістэмнасць і цэласнасць аналізу твора і ўсяго літаратурнага працэсу. Яшчэ ў 90-я гады XX ст. айчынныя даследчыкі адчулі і ўсвядомілі крызіснасць стану тэарэтычнага літаратуразнаўства. З вялікай занепакоенасцю пра гэта пісалі вядомыя беларускія літаратуразнаўцы У. Гніламёдаў, А. Лойка, М. Мушынскі, Дз. Бугаёў, В. Каваленка, іншыя.*

*Адна з важнейшых задач сучаснай літаратуразнаўчай метадалогіі – пошук і абгрунтаванне прынцыпаў вывучэння папярэдніх мастацка-літаратурных набыткаў у святле новага навуковага вопыту, асэнсаванне багатага літаратурна-мастацкага матэрыялу мінулага, пераадоленне спрошчаных, часта аднабаковых уяўленняў аб творах савецкіх дзесяцігоддзяў. З улікам новых філасофска-эстэтычных і тэарэтыка-літаратуразнаўчых ідэй, у святле сучасных метадалагічных канцэпцый неабходна паказаць,* ***што*** *ў літаратуры мінулага жывое і запатрабаванае, а што сапраўды страціла патэнцыял метакамунікатыўнасці (Мельнікава З. Станаўленне беларускага гісторыка-функцыянальнага літаратуразнаўства і творчасць Змітрака Бядулі 20–30-х гадоў. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені доктара філалагічных навук. Мінск, 2004. С. 2).*

*Метадалагічны тэкст* адлюстроўвае матывацыю і апісвае спецыфіку метадалогіі праведзенага даследавання. Напрыклад:

*Метадалогія дысертацыйнага даследавання ўяўляе комплекснае спалучэнне канкрэтна-гістарычнага, гісторыка-генетычнага, гісторыка-функцыянальнага і некаторых іншых гісторыка-літаратурных падыходаў з элементамі тэарэтычнага абагульнення. Гісторыка-літаратурнае вывучэнне дапаўняецца параўнальна-тыпалагічным і герменеўтычным метадамі даследавання. Сістэмнае даследаванне твораў Бядулі спалучана з рэалізацыяй элементаў структурнага аналізу (Мельнікава З. Тамсама. С. 4).*

*Эмпірыка-факталагічны тэкст* (тэрмін Ю. Сурміна) змяшчае апісанне факталагічнай базы даследавання, класіфікацыі і абагульненні фактаў у

канкрэтным даследчыцкім кантэксце. Яны больш уласцівы дакладным, прыродазнаўчым навукам. Але без эмпірыка-факталагічнага падыходу нельга прыйсці да аб'ектыўных высноў і абагульненняў і ў філалагічным даследаванні. Вось прыклад такога навуковага літаратуразнаўчага тэксту:

*Асацыятыўнае, крэатыўнае аўтарскае мысленне, з аднаго боку, і выяўленне класічных светапоглядных ідэй, з другога, выводзяць паэзію А. Разанава на каардынаты мадэрновай эстэтыкі, дыялагічнасці, унікальнасці, свабоднай інтэрпрэтацыі, тлумачаць яе кантэкстуальны характар. Разанаўская паэзія трапляе ў кола розных дыскурсаў, «семіятычных працэсаў» – літаратурных, філасофскіх, культурных.*

*Вылучаныя дамінантныя катэгорыі ў паэзіі А. Разанава (феномен духоўнасці, феномен рэчыўнасці і феномен касмічнасці), а таксама асноўныя вектары, на якіх праяўляецца філасофская мадальнасць яго паэзіі, збліжаюць яе з творчасцю аўтараў, блізкіх яму па стылі мастацкага мыслення. Па-першае, «універсальна-інтэлектуальны» характар разанаўскай паэзіі лучыць яго з творчасцю С. Гяды, З. Кісёва, М. Паўлавіча, В. Хлебнікава. Па-другое, рэалізацыя філасофіі гука як спосабу арганізацыі сэнсаваэмацыйнага ўзроўню паэтычнага твора збліжае яго з паэтамі, у творчасці якіх праявілася тэндэнцыя «максімалізацыі», вонкавага «выпуклення» гукаў. Па-трэцяе, наяўнасць у творчасці паэта жанру зномаў засведчыла аб яго схільнасці да роздуму, аналітызму, жаданні шукаць і знаходзіць ісціну ў парадоксах і антыноміях чалавечага быцця. А. Разанаў працягвае традыцыю М. Багдановіча, Я. Купалы, М. Гарэцкага, якія ў сваіх разгорнутых аўтакаментарыях, самарэфлексіях асэнсоўвалі з філасофска-эстэтычнага боку сваю мастацкую творчасць (Ціхановіч Т. Дынаміка жанравай фонасемантыкі паэзіі Алеся Разанава. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Мінск, 2009. С. 19).*

*Тэарэтычны тэкст* падае тэарэтычныя аспекты прадмета даследавання. Напрыклад:

*Ва ўводзінах абгрунтоўваецца выбар тэмы дысертацыі і яе актуальнасць, даецца агляд навуковай літаратуры па тэме даследавання і аналіз стану распрацаванасці праблемы ў айчынням літаратуразнаўстве, вызначаюцца напрамкі даследавання, а таксама яго тэарэтычная і метадалагічная базы. Прапануецца наступнае азначэнне прыпавесці:* ***прыпавесць – жанр мастацтва слова, які, развіваючыся ад пачатковых вусных да пазнейшых пісьмовых (літаратурных) утварэнняў, сваімі характэрнымі адзнакамі мае алегарычнасць, архетыповасць, сімвалічнасць, камунікатыўнасць, павучальнасць, лаканічнасць, філасафізм, псіхалагізм, шматузроўневасць зместу.*** *(Дубашынскі Р. Прыпавесць у беларускай прозе: эвалюцыя жанру. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Мінск, 2009).*

*Тлумачальны тэкст* раскрывае асноўныя палажэнні, змяшчае розныя прыклады, тлумачэнні паняццяў і інш. Вось прыклад такога філалагічнага тэксту, дзе першы абзац – гэта палажэнне, тэзіс, другі абзац – яго тлумачэнне:

*На першы погляд можа падацца, што біблейскі іншасказальны аповед і сучасная прытча ў плане паэтычнай будовы твора – абсалютна адрозныя рэчы. Каб вызначыць, ці сапраўды гэта так, правядзем аналіз паэтычнай арганізацыі біблейскіх новазапаветных прыпавесцяў і алегарычных гісторый В. Быкава.*

*Евангельскія алегарычныя аповеды і прыпавесці В. Быкава – жывы дыялог з народам. Мэта гэтага дыялогу – паведаміць ісціну, паказаць, навучыць, «загартаваць», выкрыць Зло і ўзвысіць Дабро, дапамагчы знайсці Шлях. Біблейскія прыпавесці будуюцца вакол аднаго цэнтру – ідэі Божага Царства. У быкаўскіх аповедах такім цэнтрам выступае канцэпт Радзімы, які вызначае і ўключае амаль усю тэматыку і праблематыку твораў (Дубашынскі Р. Тамсама. С. 10).*

*Дадатковы тэкст* падае анкеты, метадычныя ці іншыя дадаткі, тэксты заданняў, малюнкі, графікі, тэсты, фатаздымкі, ілюстрацыі і каментар да іх, статыстычны матэрыял і інш. як дадатковыя доказы навуковых палажэнняў.

*Навуковы тэкст змешанага тыпу* характарызуецца спалучэннем розных відаў навуковых тэкстаў, напрыклад, тэарэтычнага з элементамі аглядавага ці тлумачальнага:

*Літаратура першых дзесяцігоддзяў XX стагоддзя доўгі час разглядалася айчынным літаратуразнаўствам як цэласны працэс, аснову якога складае рэалістычная плыня, угрунтаваная на фальклорных і багушэвічаўскіх традыцыях. Мадэрнісцкая ж плыня ў слоўным мастацтве Беларусі лічылася не ўласцівай яму ў адрозненне, напрыклад, суседніх польскага і рускага.*

*Толькі ў 80–90-я гады нашага стагоддзя было перагледжана крытычнае стаўленне да мадэрнізму, пачала стварацца больш аб'ектыўная карціна літаратурнага працэсу. Творчасць жа Змітрака Бядулі 1909–1921 гг. якраз характарызуецца сінтэтызмам, імкненнем да паяднання многіх мастацкіх прынцыпаў. Разгляд набыткаў выдатнага пісьменніка ў разрэзе канцэпцыі «рэалізм – мадэрнізм» паспрыяе глыбейшаму вывучэнню літаратурнага працэсу першай трэці XX стагоддзя, вызначэнню месца рэалістычнага і мадэрнісцкага кірункаў у ім (Кульбянкова І. Змітрок Бядуля і беларускі мадэрнізм першай трэці XX стагоддзя. Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук. Мінск, 2001. С. 1).*

Такім чынам, вызначальнымі прыкметамі навуковага тэксту з'яўляюцца дакладная, лагічная структуа, праблемнасць, гіпатэтычнасць, тэрмі-

налагічная, інфармацыйная насычанасць, завершанасць, камунікатыўнасць, мадальнасць. Стварыць тэкст з такімі якаснымі характарыстыкамі дапамагае сфарміраваная культура чытання.

## 6. Праца з навуковым тэкстам. Культура чытання

Чытанне і асэнсаванне навуковага тэксту – адна з важнейшых функцый пазнавальнай дзейнасці чалавека, скіраваная на засваенне навуковай інфармацыі з існуючых друкаваных крыніц.

У залежнасці ад ступені азнаямлення з інфармацыяй вылучаюць такія *разнавіднасці чытання*: *праглядавае* чытанне, сарыентаванае на папярэдняе азнаямленне з кнігай, на прагляд анатацыі, зместу, прадмовы (уступу), ключавых слоў, асобных частак (раздзелаў); *азнаямляльнае* чытанне, якое прадугледжвае атрыманне агульных звестак пра змест тэксту і вызначэнне яго асноўнай ідэі; *паглыбленае* чытанне, якое заключаецца ў апрацоўцы навуковага тэксту, яго аналізе і ацэнцы (выпісванне паняццяў, тэрмінаў з іх тлумачэннем, неаднаразовае ўважлівае, удумлівае перачытванне асобных частак, раздзелаў); *аналітыка-крытычнае (творчае)* чытанне, накіраванае на пастаноўку рознага тыпу пытанняў да тэксту, сістэматызацыя і адбор навуковага матэрыялу, каментар фрагментаў навуковага тэксту, яго рэцэнзаванне.

*Працуючы з навуковым тэкстам,* ***неабходна:***

- чытаць з алоўкам у руках, каб рабіць неабходныя падкрэсліванні, паметкі, абазначэнні;
- знаёміцца з бібліяграфічнымі характарыстыкамі тэксту;
- пераконвацца ў разуменні ўсіх слоў, словазлучэнняў, тэрмінаў;
- асэнсоўваць здабытую інфармацыю, апіраючыся на ўжо атрыманыя веды і досвед;
- самастойна падбіраць уласныя прыклады, якія таксама ілюструюць галоўныя ідэі (думкі) тэксту;
- перачытваць найважнейшыя па змесце фрагменты тэксту і тыя, што не зусім зразумелыя і выклікаюць пэўныя пытанні і сумненні;
- пісьмова перадаваць асноўную інфармацыю навуковага тэксту.

Чытанне непадзельнае з успрыманнем, усведамленнем і разуменнем навуковага тэксту, а гэта залежыць ад сфарміраванай навуковай культуры асобы, а таксама ад складанасці, тэарэтычнай насычанасці самога тэксту. Важнымі ўмовамі паспяховага ўспрымання з’яўляюцца патрэба ў чытанні, зацікаўленасць, унутраная матывацыя рэцыпіента. Паспяховасць успрымання залежыць таксама ад узросту, узроўню інтэлектуальна-прафесійнага развіцця асобы, кола фонавых ведаў, аператыўнасці памяці, творчага мыслення, здольнасці канцэнтраваць увагу на неабходнай інфармацыі.

На працягу ўспрымання, асэнсавання і ўсведамлення навуковага тэксту чытач часта замяняе сэнсавыя элементы тэксту на эквівалентныя (тоесныя) з уласнага сэнсавага поля. На эфектыўнасць гэтых працэсаў у значнай меры ўплываюць зместавая структура тэксту, такія фармальна-структурныя паказчыкі, як падзел на абзацы, раздзелы, параграфы, загалоўкі, змяшчэнне малюнкаў, табліц, фатаздымкаў і г.д.

Навуковы тэкст характарызуецца вялікай колькасцю абстрактных тэрмінаў і паняццяў, што патрабуе дастатковага развіцця абстрактнага мыслення, а таксама высокага ўзроўню развіцця аналітычнага і сінтэтычнага мыслення. Вынікам успрыняцця тэксту з'яўляецца *разуменне* яго сэнсавай структуры, сутнасці прадметаў і з'яў, апісаных у навуковым тэксце, усведамленне сувязей і сузалежнасці між імі. Разуменне навуковага тэксту дае магчымасць рэцыпіенту параўнаць прапанаваны змест з яго ведамі, каб вылучыць новую для сябе інфармацыю і, адпаведна, новыя веды. Вынік разумення мае адносны характар, бо залежыць ад мэты чытача, яго ведаў аб прадмеце чытання і асэнсавання. Вынікам разумення лічыцца *інтэрпрэтацыя* тэксту, гэта значыць, уменне чытача выкласці сваё бачанне зместу і сэнсу прачытанага.

Разуменне і ўсведамленне атрыманай інфармацыі адбываецца праз выкананне наступных аналітычных этапаў:

а) асэнсавання зместу загалоўка і структурных частак;

б) падзелу тэкста на сэнсавыя часткі;

в) вызначэння ключавых слоў;

г) адбору і сістэматызацыі сэнсавых частак па іх значэннях і характарыстыках; суаднасін вылучанай інфармацыі з існуючымі ведамі;

д) вызначэння навізны атрыманай інфармацыі, магчымасцей яе выкарыстання ва ўласных навуковых пошуках і практычнай дзейнасці;

е) абагульнення інфармацыі, фармулёўка яе асноўных палажэнняў.

Фіксаваць інфармацыю пры чытанні навуковага тэксту мэтазгодна з дапамогай паметак, выпісак, складання плану, тэзісаў, шляхам рэферавання, анатацый, канспектаў. Паметка – гэта пазначэнне ў выглядзе пэўных знакаў, сімвалаў важных для карыстальніка слоў, радкоў, мясцін у тэксце. Паметкі, звычайна, робяць пад час паглыбленага чытання. Каб паметкі дапамагалі эфектыўна працаваць з навуковым тэкстам, хутка знайсці патрэбнае ў ім месца, важна захоўваць іх пэўную сістэму. Існуюць агульнапрынятыя паметкі ў навуковым тэксце.

! – поўная згода з тым, пра што гаворыцца ў тэксце;

? – нязгода з аўтарам, сумненне;

?! – здзіўленне;

NB – вельмі важна;

V – важна;

---- – цікава, можа спатрэбіцца;

• – выказванне, якое можа быць выкарыстана як цытата;

Т – тэрмін, фармулёўка тэрміна ў тэксце;

Л – літаратура, назвы прац, якія неабходна знайсці і прачытаць

*Выпіскі* – выбраныя з тэксту патрэбныя тэарэтычныя палажэнні, выслоўі, іншае са спасылкай на іх крыніцу. Выпіскі важна рабіць на асобных картках, у асобных сшытках да кожнага раздзела навуковай працы. У тэксце выпісак вылучаюць загалоўкі, падкрэсліваюць важныя паняцці, вызначэнні ці фрагменты, робяць паметкі. Такі даследчыцкі матэрыял служыць асновай навуковай, дыпломнай, магістарскай, кандыдацкай працы.

## 7. План навуковага тэксту. Тэзісы. Канспект

Паметкі ў навуковым тэксце і выпіскі з яго важна рабіць паралельна са складаннем плана. *Складанне плана* – від работы з тэкстам, спосаб засваення і разумення прачытанага, шлях да вывучэння (складання, падрыхтоўкі) кампазіцыі тэкста.

У адрозенне ад канспектаў і тэзісаў, якія варта складаць пасля поўнага прачытання матэрыялу, план складаюць пад час азнаямляльнага чытання тэкста. План залежыць ад зместу тэкста, яго асноўнай ідэі. Выдзяляючы ў навуковым тэксце асобныя часткі і ў кожнай частцы асноўную думку і называючы яе пэўным загалоўкам, важна ўсведамляць сутнасць гэтай назвы для раскрыцця асноўнага зместу твора.

*Прынцыпы складання плана навуковага тэксту:* 1) падзел тэксту на сэнсавыя блокі (часткі); 2) вызначэнне галоўнай думкі кожнага сэнсавага блока (часткі); 3) фармулёўка пунктаў плана (загалоўкаў).

Складанне плана спрыяе глыбейшаму засваенню навуковых тэкстаў, якія не маюць дэталёвай рубрыкацыі (падзелу на раздзелы, параграфы, падраздзелы), напрыклад, навуковых артыкулаў.

Чытанне навуковага тэксту суправаджаецца таксама вызначэннем сэнсавых частак і сувязей паміж імі, гэта значыць, правядзеннем кампрэсіі. *Кампрэсія* (ад лац. compressio – сціскание) навуковага тэксту – падзел тэксту на блокі інфармацыі, іх называнне, раскрыццё сэнсавай структуры тэксту.

Разнавіданасцямі кампрэсіі навуковага тэксту з'яўляюцца тэзісы, канспект, рэферат, анатацыя. **Тэзісы –** паслядоўна сфармуляваныя асноўныя ідэі, думкі і палажэнні даклада, лекцыі, артыкула. Складанне тэзісаў (тэзаванне) – гэта вылучэнне асноўнай інфармацыі з тэкста-крыніцы ў выглядзе палажэнняў-тэзісаў. Скарачэнне адбываецца з улікам праблематыкі тэкстаў і аўтарскай ацэнкі інфармацыі. Рэкамендуемы аб'ём тэзісаў – дзве-тры старонкі машынапіснага тэксту праз 1,5–2 інтэрвалы. Тэзісы

пішуць пасля паглыбленага, аналітыка-крытычнага чытання тэксту артыкула, пасля складання адпаведнага плана і выпісак.

Для *тэзісаў* уласціва строгая *зместава-кампазіцыйная структура:*

1) назва, што адлюстроўвае галоўную ідэю;

2) прэамбула (актуальнасць і ступень распрацаванасці праблемы);

3) асноўныя тэзісы-палажэнні (абгрунтаванне, доказы на карысць праблемы, даследаваць якую бярэцца аўтар);

4) абагульняючыя тэзісы (асноўныя вынікі і перспектывы праблемы даследавання).

Кожны тэзіс павінен высвятляць асобную мікратэму (частку агульнай тэмы тэкста), вызначаць змест наступнай або падсумоўваць папярэднія тэзісы. Фармуляванне кожнага тэзіса пачынаюць з абзаца. Кожны тэзіс змяшчае самастойную думку, якая выражаецца ў адным або некалькіх выказваннях. Выклад сутнасці ідэі ці палажэння ажыццяўляецца без ілюстрацый канкрэтнымі прыкладамі.

Спасылкі на крыніцы, цытаты ў тэзісах выкарыстоўваюць рэдка, не абавязковы і фактычны матэрыял. Тыповымі памылкамі ў тэзісах з'яўляецца падмена іх тэкстам паведамлення, рэфератам, анатацыяй.

*Канспектаванне* з'яўляецца ўніверсальнай формай запісу першакрыніцы, што дапамагае выпрацаваць уменне дакладна перадаваць змест сваімі словамі, пры патрэбе – хутка яго аднавіць, дапоўніць, аргументаваць, а таксама ўдасканаліць уменне дакладна мысліць і гаварыць, выбіраць лаканічную форму, абдумваць прачытаны матэрыял. **Канспект** (ад лац. conspectus – агляд) – кароткі пісьмовы выклад зместу кнігі, артыкула, лекцыі і г.д.

Не мэтазгодна канспектаваць пад час першага прачытання навуковага тэксту. Варта спачатку атрымаць агульнае ўяўленне пра тэкст. Пасля гэтага, падчас паўторнага чытання, патрэбна ўжо канспектаваць, звяртаючы асноўную ўвагу на ключавыя словы, якія з'яўлюцца інфармацыйна-сэнсавымі цэнтрамі. *Канспектаванне можа мець характар апісання, аповеду, меркавання.* Апісанне выкарыстоўваюць пры неабходнасці ўзнавіць пэўную з'яву ці працэс, або выкласці новую інфармацыю. Аповед ужываюць пры паслядоўным выкладзе фактаў. Меркаванне прадугледжвае дапаўненне канспекта ўласнымі роздумамі над пытаннямі, якія разглядаюцца.

Асаблівую ўвагу неабходна ўдзяляць структураванню апрацаванага матэрыялу, пабудове лагічных схем, якія дакладна адлюстроўваюць набытыя даследчыкам звесткі і веды. Такі канспект служыць асновай для падрыхтоўкі навуковага выступлення, напісання курсавой, дыпломнай працы, або навуковага артыкула.

## 8. Рэферыраванне навуковай крыніцы. Аўтарэферат дысертацыі

**Рэферат** (ад лац. referre – паведамляць, расказваць) – аналітычная, удумлівая апрацоўка навуковай крыніцы (артыкула, манаграфіі і г.д.), аналіз яго асноўных палажэнняў, фактаў, вынікаў, высноў. Рэферат выконвае інфармацыйную функцыю: падае інфармацыю пра пэўную першакрыніцу або ўтрымлівае інфармацыю па канкрэтнай тэме, праблематыцы.

Рэферыруючы навуковую крыніцу, на этапе азнаямляльнага чытання з мэтай правядзення аглядавага аналізу чытаюць загаловак, уступ (прадмову), змест тэксту, высновы, анатацыю. На этапе паглыбленага аналізу тэксту высвятляюць яго асаблівасці, магчымасці яго практычнай рэалізацыі, вывучаюць факты, новыя ідэі і гіпотэзы, эксперыментальныя дадзеныя, новыя методыкі, перавагі прапанаванага варыянта вырашэння праблем. Пры неабходнасці ў рэферат уключаюць ілюстрацыі, табліцы, бібліяграфічныя спасылкі.

Тэкст рэферату, як правіла, складаецца з трох частак: *уступу, асноўнай часткі і заключнай.* Уступ уключае выхадныя дадзеныя навуковай крыніцы. Апісваючы гэта, ва ўступе карыстаюцца такімі зваротамі: *прапанаваны артыкул (кніга, манаграфія) падае дэталёвы разгляд пытанняў; тэма артыкула ўяўляе значную цікавасць…; выбар тэмы артыкула (манаграфіі) невыпадковы…; у пачатку артыкула (манаграфіі) аўтар падае абгрунтаванне актуальнасці тэмы (праблемы, пытання, ідэі)…; у артыкуле (даследаванні) абагульняецца вопыт, абгрунтоўваецца прынцып…; у манаграфіі апісаны гісторыка-літаратурны працэс…; у працы аналізуюцца розныя падыходы да вырашэння праблемы…* .

У асноўнай частцы даецца характарыстыка важных палажэнняў тэксту, таму мэтазгодна выкарыстоўваць наступныя моўныя клішэ: *аналізуемая манаграфія складаецца з… частак…; аўтар падае вызначэнні (параўнальную характарыстыку, агляд, аналіз)…; аўтар спыняецца на такіх праблемах, як…; даследчык дэталёва высвятляе гісторыю ўзнікнення (станаўлення)…; аўтар даследуе прычыны…; асаблівую ўвагу аўтар надае каментару (інтэрпрэтацыі) атрыманых вынікаў…; важнае значэнне маюць дадзеныя, якія сведчаць аб…; аўтар лічыць неабходным прывесці дадатковую аргументацыю…; аўтар даводзіць…, пярэчыць…; прыводзіць шэраг прыкладаў, якія ілюструюць…; у даследаванні абагульняюцца…* .

У заключэнні рэферата змяшчаюцца агульныя высновы па рабоце. Тут дарэчы ўжыць наступныя моўныя клішэ: *у высновах аўтар сцвярджае, што…; выкладзенае дае магчымасць аўтару зрабіць выснову пра тое, што…; неабходна сцвярджаць, што…* .

Для характарыстыкі кампазіцыі тэксту-крыніцы выкарыстоўваюцца, звычайна, словы абагульнена-абстрактнага значэння *(агляд, падходы, по-*

*гляды, асноўныя палажэнні, вопыт);* тэрміны, якія абазначаюць элементы структуры навуковага тэксту *(аргументацыя, доказ, ілюстрацыя, гістарычная даведка, звесткі, абагульненне, ацэнка вынікаў, высновы);* словы, якія больш дакладна і поўна характарызуюць або ацэньваюць змест асобных частак тэксту-крыніцы, але не выкарыстаны аўтарам *(недакладнасці, пралікі, асаблівасці, адрозненні, аспекты, неабходнасць, сукупнасць, тэндэнцыі).*

Элементамі моўнага афармлення рэферату з'яўляюцца:

- цытаванне, або даслоўнае ўзнаўленне фрагментаў першакрыніцы;
- перафразіраванне, якое прадугледжвае частковую змену (скарачэнне, аб'яднанне, групоўка) асобных фрагментаў тэксту першакрыніцы;
- замяшчэнне, або замена фрагмента тэксту, калі гэта не пярэчыць зместу з магчымым ужываннем слоў *такі, падобны, вышэйзазначаны, прааналізаваны вышэй.*

Тэкст рэферату павінен вылучацца канкрэтнасцю, чытальнасцю, лаканічнасцю, непажадана ўжываць груваcткія словазлучэнні, якія перашкаджаюць успрыманню зместу.

Спецыфічнай разнавіднасцю рэферата з'яўляецца **аўтарэферат** – навуковы жанр, у якім у сціслай форме прадстаўляюцца вынікі праведзенага кандыдацкага ці доктарскага дысертацыйнага даследавання. Аўтарэферат па патрабаванні ВАК Беларусі рассылаюць у вызначаную колькасць бібліятэк, навучальных устаноў, афіцыйным апанентам. Аўтарэферат павінен дакладна ўзнаўляць тэкст дысертацыі і даваць сціслае, але выразнае ўяўленне шырокаму колу чытачоў пра навуковую каштоўнасць і практычнае значэнне выкананага дысертацыйнага даследвання.

Нягледзячы на высокую меру стандартнасці, кожны аўтарэферат – гэта адметная самапрэзентацыя даследчыка. Тэкст аўтарэферату складаецца з уступу (агульнай характарыстыкі работы), асноўнай часткі, высноў, спіса апублікаваных аўтарам прац па тэме даследавання, а таксама анатацыі на беларускай, рускай і англійскай мовах. Кожнаму з названых складнікоў аўтарэферата ўласцівыя пэўныя канструкцыі-клішэ. Паводле функцый, якія яны выконваюць у навуковым тэксце аўтарэферата, моўныя клішэ падзяляюць на *рамкавыя і сітуатыўныя* (Н. Вядзяева).

*Рамкавыя* клішэ забяспечваюць вылучэнне кампазіцыйных частак: актуальнасць тэмы, сувязь работы з навуковымі праграмамі, планамі, тэмамі, аб'ект і прадмет даследавання, мэта і задачы, метады даследавання, навуковая навізна, практычнае значэнне, абгрунтаванасць і даставернасць навуковых палажэнняў, высновы і рэкамендацыі, асабісты ўклад дысертанта, апрабацыя вынікаў даследавання, публікацыі па тэме. Адсутнасць такіх моўных клішэ, графічна не выдзелены тэкст пагаршаюць успрыняцце аўтарэферату.

Сітуатыўныя клішэ робяць больш выразнымі ўяўленні аб змесце навуковага тэксту, выяўляюць творчую арыгінальнасць аўтара. Напрыклад, пазіцыя аўтарэферата *«выкарыстаныя метады даследавання»* можа змяшчаць наступныя клішэ: *для вырашэння пастаўленых задач выкарыстоўваліся такія метады даследавання...; для рэалізацыі мэты і задач даследавання выкарыстоўваўся комплекс метадаў; асноўнымі метадамі даследавання з'яўляюцца...; у працэсе даследавання выкарыстоўваліся метады, адпаведныя прадмету і задачам даследавання.*

Рубрыка *«задачы»* можа быць прадстаўлена такімі выразамі: *мэта і гіпотэза вызначылі задачы даследавання; у адпаведнасці з мэтай і гіпотэзай былі сфармуляваны такія задачы...; рэалізацыя пастаўленай мэты і праверка верагоднасці гіпотэзы патрабуюць вырашэння наступных задач...; пастаўленая мэта абумовіла вырашэнне такіх задач...; адпаведна з пастаўленай мэтай сфармуляваны задачы даследавання.*

Рубрыку *«практычнае значэнне дысертацыі»* можна разнастаіць такімі клішэ: *практычнае значэнне работы заключаецца ў магчымасці выкарыстання яе вынікаў для ...; практычная каштоўнасць выкананай працы вызначаецца непасрэднай сувяззю яе вынікаў з практыкаю выкладання літаратуры ў ВНУ і школе; матэрыялы дысертацыі прапануюцца для выкарыстання ў лекцыйных курсах па гісторыі беларускай літаратуры, для напісання курсавых, дыпломных і магістарскіх прац; практычная каштоўнасць атрыманых вынікаў вызначаецца магчымасцю іх выкарыстання пры... .*

Рубрыку *«апрабацыя вынікаў дысертацыі»* афармляюць такімі выразамі: *апрабацыя вынікаў даследавання адбывалася на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых (навукова-практычных) канферэнцыях...; па матэрыялах даследавання былі прачытаны даклады (зроблены паведамленні)...; асноўныя палажэнні дысертацыі абмяркоўваліся на сумесным пасяджэнні...; асноўныя палажэнні, высновы, рэкамендацыі і вынікі даследавання абмяркоўваліся на штогадовых выніковых канферэнцыях прафесарска-выкладчыцкага калектыву...; матэрыялы дысертацыі апрабіраваны на семінарах....*

У асноўнай частцы аўтарэферата, якая павінна сфарміраваць больш поўнае ўяўленне пра дысертацыю, суіскальнікі навуковай ступені выкарыстоўваюць моўныя клішэ ў выглядзе няпэўна-асабовых і безасабовых дзеяслоўных словазлучэнняў, а таксама моўныя фігуры, якія адлюстроўваюць аўтарскія адносіны да праблемы. Напрыклад: *у даследаванні разглядаецца...; разглядаючы сувязь пісьменніка і яго творчасці з эпохай, адзначаем...; у творчасці пісьменніка вылучаюцца тры перыяды...*

*Высновы ў аўтарэфераце* павінны адпавядаць зместу агульных высноў дысертацыі і змяшчаць сціслую інфармацыю аб выніках усёй

выкананай працы: фармулёўкай навуковых задач, цесна звязаных з мэтаю, асноўнымі навуковымі палажэннямі, што выносяцца на абарону. Моўныя клішэ гэтай часткі могуць быць наступнымі: *У выніку праведзенага даследавання выяўлена і абгрунтавана правамернасць...; Праведзенае даследаванне тэкстаў пісьменніка дало магчымасць зрабіць наступныя высновы...; У дысертацыі зроблена тэарэтычнае падагульненне... і прапанаваны новыя падыходы да вырашэння навуковай праблемы...*

Кожная навуковая і практычная выснова фармулююцца дакладна і адназначна, а спосаб фармулявання павінен адлюстроўваць сутнасць і навізну зробленага.

## 9. Анатаванне навуковай крыніцы

**Анатацыя** – кароткае паведамленне пра кнігу, артыкул, манаграфію і прызначэнні, змесце, жанры і іншых асаблівасцях выдання. Анатаванне – гэта працэс напісання анатацыі, аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі інфармацыі, мэта якой – атрыманне абагульненай характарыстыкі навуковага выдання, у якой раскрываецца яго лагічная структура і змест. Аб’ектам анатавання можа быць навуковы артыкул, манаграфія, дысертацыя, падручнік, навуковыя дапаможнікі і г.д.

Анатацыя належаць да стандартызаваных жанраў пісьмовага навуковага выказвння і адрозніваецца максімальнай кампактнасцю (звычайна да 500 друкаваных знакаў) і лаканічнасцю. Анатацыя дае толькі агульнае ўяўленне пра змест крыніцы, але не раскрывае яго падрабязна. Гэта зручна, напрыклад, пры адборы навуковых крыніц для курсавых, дыпломных, магістарскіх і дысертацыйных прац.

Складаць анатацыю пажадана з улікам яе сігнальнай і пошукавай функцый, бо анатацыя падае такую інфармацыю пра крыніцу, якая дапамагае ўстанавіць яе асноўны змест і прызначэнне, мэту, а таксама вырашыць, ці варта звяртацца да яе поўнага тэксту.

*Для напісання анатацыі важна выканаць наступныя даследчыя этапы:*

1) аглядавае або азнаямленчае чытанне працы (кнігі, артыкула) з мэтай атрымаць уяўленне пра выхадныя дадзеныя і агульны змест крыніцы (назва, жанр навуковай працы, аўтар, год і месца выдання, структура, аб’ём, раздзелы, рубрыкі, ілюстрацыі і г.д.);

2) паўторнае чытанне асобных частак (раздзелаў) тэксту, накіраванае на сэнсавы аналіз з мэтай выяўлення актуальнасці і прызначэння выдання, на структуру і асноўную інфармацыю тэкста (як разгледжаны і вырашаны пастаўленыя праблемы; да якіх высноў прыходзіць аўтар);

3) сціслая характарыстыка моўнай апрацоўкі інфармацыі.

Галоўнымі *структурнымі элементамі анатацыі навуковай крыніцы з’яўляюцца:*

а) уступ – выхадныя дадзеныя крыніцы (назва, жанр, аўтар, месца і год выдання, структура, аб’ём, ілюстрацыі);

б) асноўная частка – пералік узнятых ключавых праблем (можна па раздзелах, параграфах);

в) заключная частка – актуальнасць і адрасат выдання (крыніцы).

Паказчыкамі ўзроўню якасці анатацыі з’яўляюцца сцісласць і дакладнасць інфармацыі пра першакрыніцу, а таксама афармленне ў адпаведнасці з існуючымі моўнымі нормамі. Найбольш тыповая памылка пры складанні анатацый – празмернасць: паўтор інфармацыі, выкарыстанне недакладных, няўдалых выразаў, складаных канструкцый. Навуковая тэрміналогія павінна быць агульнапрынятаю, а малавядомыя тэрміны патрабуюць тлумачэння.

У анатацыі магчымы такія моўныя клішэ:

1) дадзеныя пра аўтара – *аўтар манаграфіі вядомы беларускі вучоны…;*

2) жанр анатуемай першакрыніцы – *манаграфія выдатнага даследчыка; у вучэбным дапаможніку разглядаюцца…; у зборніку навуковых прац упершыню прадстаўлены…; гэта першы ў Беларусі падручнік…;*

3) характарыстыка выдання – *у дапаможніку пададзена праграма, зместавыя модулі і тэмы, пытанні і заданні для самападрыхтоўкі, кароткі слоўнік…; навучальны дапаможнік створаны ў адпаведнасці з сучаснымі праграмамі…; манаграфія прысвечана сучасным праблемам айчыннага літаратуразнаўства; у манаграфіі зроблены аналітычны агляд…; аўтар, аналізуючы (што?), спыняецца на…; у кнізе змешчаны навуковыя (навукова-папулярныя) артыкулы…; галоўная ўвага звяртаецца на…; манаграфія завяршаецца аглядам…; коратка выкладаецца гісторыя…; раскрываецца сутнасць…;*

4) прызначэнне – *рэкамендуецца вучням старэйшых класаў, настаўнікам, студэнтам, аспірантам, маладым вучоным; для шырокага кола чытачоў; разлічана на выкладчыкаў, аспірантаў, студэнтаў; манаграфія адрасавана….*

Кожны аўтар, выдавец імкнецца пазбегнуць манатоннасці і аднастайнасці выкладу, завастрыць увагу на сутнасць пытанняў, выкладзеных у кнізе. Таму для анатацыі прапануюцца і такія моўныя клішэ: *сістэматызавана разгледжаны найактуальнейшыя праблемы…; прадметам асаблівай увагі з’яўляецца…; улічаны навейшыя гіпотэзы, якія сфарміраваліся ў межах…; выкладзеныя тэарэтычныя палажэнні праілюстраваны…; кніга пабудавана паводле новых канцэптуальных падыходаў да…; асаблівая ўвага звернута…; засваенню праблематыкі, набліжэнню ведаў да практычных патрэб спрыяюць прапанаваныя заданні; прыведзены фрагменты*

*аналізу мастацкага твора з выкарыстаннем структурнага аналізу; тэарэтычныя палажэнні прадэманстраваны прыкладамі з мастацкай літаратуры…* .

Анатацыі, як правіла, падаюцца на пачатку кніг. Анатацыі на дысертацыі пішуць, пераважна, у канцы аўтарэфэрата дысертацыі ў лаканічнай і канкрэтнай навуковай форме на беларускай, рускай і англійскай мовах. Яны адлюстроўваюць асноўны змест і вынікі навуковага даследавання. Пасля кожнай анатацыі змяшчаюць ключавыя словы. Агульная колькасць іх – ад трох да дзесяці.

У анатацыях шырока выкарыстоўваюцца наступныя дзеяслоўныя формы: *высветлена, апісана, акцэнтавана, устаноўлена, праведзена, прааналізавана, прасочана, выяўлена* і г.д.

Важнымі этапамі работы з тэкстам з'яўялецца яго *чытанне*, якое бывае розных відаў – *праглядавае, азнаямляльнае, паглыбленае, аналітыка-крытычнае.* Пасяховасць гэтых працэсаў залежыць ад успрымання і ўсведамлення, неабходнай перадумовай якіх выступае ўнутраная матывацыя. Асэнсаванне ўспрынятага залежыць ад узроста, вопыту, фонавых ведаў, творчага мыслення чытача. За ўспрыманнем і ўсведамленнем адбываецца разуменне тэксту і яго інтэрпрэтацыя.

Кампрэсія навуковага тэксту праз канспект, анатацыю, тэзісы, рэферат дае магчымасць больш эфектыўна вылучаць блокі інфармацыі і раскрываць сэнсавую структуру тэкста.

## 10. Структура навуковага тэксту

Навуковы тэкст павінен быць зразумелым не толькі аўтару, але і патэнцыяльным чытачам. Той, хто збіраецца пісаць, павінен дакладна адказаць сабе на пытанні: Для чаго хачу пісаць? Пра што буду пісаць? Што буду пісаць? Для каго хачу пісаць? Як хачу пісаць? Адказ на пытанне «Для чаго хачу пісаць?» дапаможа вызначыць мэту стварэння тэкста. Пытанне «Пра што буду пісаць?» дапаможа вызначыцца са зместам навуковага матэрыялу: гэта будзе аналіз мастацкіх твораў ці даследаванне літаратурнага перыяду і г.д. Адказ на пытанне «Што буду пісаць?» дапаможа вызначыцца з жанрам тэксту (артыкул, тэзісы, дысертацыя). Адказы на пастаўленыя пытанні звязаныя між сабой, яны дапамогуць сфармуляваць задуму працы, змест і форму выкладу матэрыялу.

Асноўныя структурныя элементы навуковага тэксту: *уступ*, дзе даецца абгрунтаванне актуальнасці даследавання, вызначаюцца прадмет, мэта, задачы, тэарэтычнае і практычнае значэнне працы; *асноўная частка*, у якой прадстаўлена метадалогія і канкрэтныя метады даследавання, пошук шляхоў вырашэння праблем, доказы канцэпцыі, ідэі; *высновы*, якія змяшчаюць

вынікі выкананай працы, перспектывы далейшага даследавання падобнай праблематыкі.

Важную ролю ў навуковым тэксце адыгрывае загаловак. **Загаловак** *навуковага тэксту – гэта інфарматыўная адзінка, якая адлюстроўвае тэму (ідэйную задуму аўтара) і адпавядае зместу тэксту.* У загалоўку навуковага тэксту ўвасоблена задума аўтара, устаноўлены межы інфармацыі, якую ён хоча падаць. У залежнасці ад канкрэтызацыі інфармацыі навукоўцы вылучаюць *некалькі тыпаў загалоўкаў:*

1) назвы агульнага характару («Беларуская літаратура ХХ стагоддзя», «У свеце мастацкага твора», «Метадалогія літаратуразнаўства»);

2) назвы, якія канкрэтызуюць пытанні, разгледжаныя аўтарам («Паэзія Таісы Бондар: эвалюцыя мастацкай свядомасці»);

3) назвы, якія адлюстроўваюць асаблівасці аўтарскай пастаноўкі пытання («Класіка – сучаснасць – перспектывы: пра літаратурны працэс ХХ стагоддзя», «Нацыянальны космас класікі»).

## 11. План і рубрыкацыя навуковага тэксту

Кампазіцыя навуковага тэксту залежыць ад плана навуковай працы. **План навуковага тэксту** – *кароткі тэзісны запіс, які акрэслівае паслядоўнасць выкладу думак, раскрывае змест тэксту і ўзнаўляе яго ў памяці.* Ён – каркас будучай працы. Неабходныя характарыстыкі плана – дакладнасць, лагічнасць, лаканічнасць у фармулёўцы яго пунктаў.

План навуковага тэксту складаюць з улікам такіх агульнапрынятых прынцыпаў:

1) распрацоўка структуры тэксту (уступ, асноўная частка, высновы, дадаткі);

2) высвятленне важнейшых пытанняў у межах кожнай часткі;

3) фармулёўка пунктаў і падпунктаў плана.

У працэсе працы над тэкстам план можа змяняцца, дапаўняцца ці іншым чынам карэкціравацца. Часам, карысна складаць некалькі варыянтаў плана тэксту, што паглыбляе ўяўленні аб прадмеце даследавання. План павінен адлюстроўваць паслядоўнасць выкладу матэрыялу. Шляхам складання плана можна праверыць ступень засваення тэксту (узнавіць яго ў памяці), выявіць паўторы, непаслядоўнасць у выкладзе зместу.

Па інфармацыйнай напоўненасці адрозніваюць **простыя планы** (складзеных з асноўных пунктаў-тэм, якія выкладзены паслядоўна і адлюстроўваюць логіку тэксту) і **складаныя планы** (змяшчаюць асноўныя пункты і падпункты, якія канкрэтызуюць, дэталізуюць і ўдакладняюць змест асноўных пунктаў). Па моўным афармленні планы бываюць *пытальнымі* (у выглядзе лагічных пытанняў), *назыўнымі* (у форме назыўных

сказаў), тэзіснымі (у выглядзе тэзісаў), *цытатнымі* (як пункты плана выкарыстоўваюцца цытаты з тэкста).

Рабочыя планы складаюць на працягу выканання кваліфікацыйнай навуковай працы. У іх абагульнена даецца характарыстыка прадмета даследавання, пералік заданняў часта па схеме «гісторыя – тэорыя – практыка», якія патрабуюць вырашэння; вызначаецца неабходная колькасць раздзелаў, падраздзелаў і іх назвы. У працэсе напісання навуковай працы рабочы план некалькі разоў можа ўдакладняцца і зменьвацца.

Адлюстраванню логікі навуковага даследавання спрыяе рубрыкацыя. У рубрыкацыі тэксту, нумарацыі і назве раздзелаў, падраздзелаў (параграфаў) заключаецца графічная культура афармлення плана. **Рубрыкацыя навуковага тэкста** – *дакладны і лагічны падзел яго на пэўныя часткі.*

Патрабаванні да рубрыкацыі выкладзены ў патрабаваннях ВАК Беларусі да дысертацый. Старонкі, раздзелы, падраздзелы, пункты, падпункты, малюнкі, табліцы нумаруюцца арабскімі лічбамі. Прыкладная схема плана навуковай працы можа быць такой:

**План магістарскай (дыпломнай) работы**

ЗМЕСТ

Уступ ........ с
Раздзел 1 (Назва) ........ с
1.1 (Назва) ........ с
1.2 (Назва) ........ с
1.3 (Назва) ........ с
Высновы да раздзела 1 ........ с
Раздзел 2 (Назва) ........ с
2.1 (Назва) ........ с
2.2 (Назва) ........ с
2.3 (Назва) ........ с
Высновы да раздзела 2 ........ с
Раздзел 3 (Назва) ........ с
3.1 (Назва) ........ с
3.2 (Назва) ........ с
3.3 (Назва) ........ с
Высновы да раздзела 3 ........ с
АГУЛЬНЫЯ ВЫСНОВЫ ........ с
ДАДАТКІ ........ с
СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ ........ с

Назвы (загалоўкі) раздзелаў друкуюцца вялікімі літаратмі з новага радка. Кропкі пасля нумара падраздзелаў, як і пасля раздзелаў, не ставяцца. Структурныя часткі ЗМЕСТ, УСТУП, ВЫСНОВЫ, СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ не маюць парадкавага нумара.

Наступны этап працы даследчыка – **складанне плана-праспекта**. Гэта рэфератыўна-тэзіснае выкладанне навуковага матэрыялу, размеркаванага ў лагічнай паслядоўнасці. План-праспект дысертацыі змяшчае, як правіла, тытульную старонку з пазначэннем навучальнай ці навуковай установы, дзе выконваецца праца, прозвішча, імя і імя па бацьку аўтара, тэму дысертацыі, спецыяльнасць, па якой яна абараняецца. На наступных старонках указваецца актуальнасць праблемы, ступень яе даследаванасці, сувязь з навуковымі праграмамі і праектамі навучальнай (навуковай) установы (кафедры), аб’ект, прадмет, мэта і задачы даследавання, яго навуковае, тэарэтычнае і практычнае значэнне, а таксама змест працы.

Пісаць навуковую працу пачынаюць пасля таго, як глыбока асэнсаваны і вывучаны разнастайныя крыніцы, звязаныя з прадметам даследавання: навуковыя працы (манаграфіі, артыкулы, дысертацыі, матэрыялы навуковых канферэнцый, семінараў), а таксама навукова-метадычныя працы (падручнікі, вучэбна-метадычныя дапаможнікі) і, калі гэтага вымагае тэма дысертацыі, нарматыўна-праграмныя дакументы (навучальныя планы, праграмы, дзяржаўныя дакументы аб адукацыі). Паводле апрацаваных літаратурных крыніц складаецца бібліяграфія (або спіс выкарыстаных крыніц).

*Крыніца навуковай інфармацыі* – матэрыял (манаграфія, артыкул, дакумент і нек. інш.), які змяшчае навуковыя факты або з’яўляецца вынікам аналітычнай ці лагічнай апрацоўкі.

Для пошуку інфармацыі звяртаюцца ў навуковыя, спецыяльныя ці профільныя бібліятэкі. У даведачна-інфармацыйным аддзеле бібліятэкі існуе сістэма каталогаў і картатэк, якія дапамагаюць адшукаць неабходныя навуковыя крыніцы. *Каталог* – гэта сістэма накаплення і захавання дадзеных пра літаратуру, якая знаходзіцца ў бібіліятэцы. *Картатэка* – пералік усіх матэрыялаў, выяўленых па пэўнай тэматыцы. Існуюць тры віды каталогаў – *алфавітны, сістэматычны і прадметны. Алфавітны* каталог дае магчымасць даведацца, якія творы таго ці іншага аўтара маюцца ў бібліятэцы, а таксама высветліць звесткі пра выданне (прозвішча аўтара, назва кнігі, месца, дзе яна выдадзена, выдавецтва, год выдання, колькасць старонак).

*У сістэматычным каталозе* карткі згрупаваны ў лагічным парадку ў адпаведнасці з галінамі ведаў. З дапамогай гэтага каталога можна вызначыць, якія кнігі, артыкулы і г.д. па пэўнай галіне ведаў можна знайсці ў гэтай бібліятэцы. Тут можна падабраць неабходную літаратуру па тэме даследавання.

*У прадметным каталозе* бібліятэкі карткі з бібліяграфічнымі запісамі размешчаны па алвафіту прадметных рубрык. Такі каталог выкарыстоўваюць для падбору матэрыялаў па вузкаспецыяльных дысцыплінах.

Для маладога навукоўца часта складана за кароткі тэрмін вылучыць неабходную інфармацыю з вялікай колькасці крыніц. Сёння пошук навуковай інфармацыі значна спрасціўся за кошт электронных каталогаў, якія прадстаўляюць электронны алфавітна-прадметны паказчык, электронны сістэматычны каталог аўтарэфератаў, электронны каталог кніг, артыкулаў і г.д.

Важную інфармацыю прапануюць *рэфератыўныя часопісы*, якія змяшчаюць анатацыі і бібліяграфічныя звесткі, а таксама *бюлетэні сігнальнай інфармацыі,* асноўная задача якіх заключаецца ў аператыўным інфармаванні пра ўсе навуковыя навінкі.

Колькасць літаратурных крыніц павінна быць дастатковай для раскрыцця тэмы даследавання. Азнаямленне з навуковымі крыніцамі дапаможа скласці (удакладніць) план навуковага даследавання.

## 12. Характарыстыка структурных частак даследавання

Кожны навуковы тэкст пачынаецца з *уступу.* Гэтая частка кампазіцыі навуковага даследавання выконвае функцыю праграмы даследавання. Рабочы вартыянт уступу неабходна напісаць на пачатку выканання ўсёй навуковай працы. А канчаткова яго варта афармляць на заключным этапе выканання даследавання, калі будуць выяўлены канчаткова яе вынікі. Даследчыку варта ўдакладніць, ці адпавядаюць атрыманыя высновы задачам, якія ставіліся на пачатку працы. Пры неабходнасці варта скарэкціраваць іх адпаведнасць.

Схема пабудовы ўступу навуковай працы, звычайна, бывае стандартнай:

1) абгрунтаванне актуальнасці навуковай праблемы, абранай для даследавання;

2) характарыстыка існуючых тэарэтычных і практычных даследаванняў па гэтай праблеме, гісторыя пытання;

3) вызначэнне прадмета даследавання, аб’екта (матэрыяла), мэты, гіпотэзы, задач;

4) абгрунтаванне мэтазгоднасці рэалізацыі выбраных метадаў.

Для абгрунтавання выбару тэмы і яе актуальнасці выкарыстоўваюцца, як правіла, такія моўныя формулы: *вырашэнне праблемы ... мае важнае (першачарговае) навуковае, тэарэтычнае і практычнае значэнне; праблема актуальная для літаратуразнаўства і філалагічнай навукі ўвогуле, вырашэнне яе не страціла значэння…*

У *аглядзе* літаратуры падаюцца і аналізуюцца навуковыя крыніцы, у якіх высвятляецца гісторыя вывучэння праблемы: тэарэтычныя працы, якія цалкам ці часткова раскрываюць праблему, акрэсліваюць патрэбу ў новых, далейшых даследаваннях, за што і бярэцца аўтар. Моўныя клішэ агляду літаратуры могуць быць такімі: *па ўказанай (названай, гэтай) праблеме існуюць даследаванні…; выяўлена значная колькасць публікацый, у якіх…; недастатковая распрацавананасць праблемы засведчана малой колькасцю прац, (публікацый, даследаванняў) па…*

*Мэта* даследавання – гэта навуковая фармулёўка ўяўленняў аб выніках працы. Яе вызначаюць на аснове паглыбленага, канкрэтнага, сціслага навуковага апісання тэмы даследавання. Для фармулёўкі мэты выкарыстоўваюцца такія канструкцыі: *навуковая праца*, *дыпломная праца (дысертацыя) прысвечана вывучэнню, разгляду, даследаванню, аналітычнаму апісанню, вырашэнню…*

У навуковых даследаваннях аўтары часта прапануюць *гіпотэзу* (прыкладныя вынікі), што будзе даказвацца (даводзіцца) у асноўнай частцы працы. Гэта – мажлівы адказ на пытанне, якое ўтрымлівае фармулёўка праблемы даследавання, верагодныя вынікі працы. Пры гэтым варта карыстацца наступнымі моўнымі формуламі: *сістэмнае (цэласнае) даследаванне… будзе мець важныя (перспектыўныя) вынікі для…; вывучэнне творчай індывідуальнасці пісьменніка… будзе спрыяць фарміраванню…*

*Задачы даследавання* ў цэлым павінны даваць уяўленне, што неабходна зрабіць для дасягнення мэты. У навуковай працы фармулююць, як правіла, ад трох да сямі задач. Сярод моўных спосабаў афармлення задач пераважаюць дзеясловы: *вывучыць, даследаваць, прааналізаваць, разгледзець, вызначыць, устанавіць, абгрунтаваць, выявіць, давесці, паказаць* і нек. інш., а таксама назоўнікі: *фактары, падыходы, роля, мэтазгоднасць, заканамернасці, формы, метадалогія, метады і прыёмы, асаблівасці, крытэрыі* і інш.

Для дасягнення пастаўленай мэты і вырашэння задач даследавання ў працы вылучаюцца пэўныя *метады.* Гэта – шляхі, спосабы дасягнення пастаўленай мэты і задач даследавання, своеасаблівыя навуковыя алгарытмы выканання тэарэтыка-інтэлектуальных, аналітычных, абагульняючых і інш. дзеянняў і аперацый, накіраваных на пазнанне (спасціжэнне) прадмета даследавання.

Выбар метадалогіі (метадаў) залежыць ад прадмету даследвання і яго мэты. У сучасным беларускім літаратуразнаўстве выкарыстоўваюцца як тэарэтычныя, так і эмпірычныя метады. Да тэарэтычных адносяцца: *біяграфічны, псіхааналітычны, міфакрытычны, герменеўтычны, кампаратывістычны, гісторыка-генетычны, гісторыка-функцыянальны, структурны, гістарыка-параўнальны, метад структурна-сістэмнага аналізу*

*(вывучэння)* і нек. інш. Эмпірычныя, або аналітычныя (практычныя) метады, якімі карыстаецца літаратуразнаўства, часцей, такія: *метад статыстычнага аналізу (напрыклад, параўнанняў, метафар, іншых стылёвавыяўленчых фігур у творчасці пэўнага пісьменніка), анкетавання (пісьменнікаў ці чытачоў для вырашэння пэўных літаратуразнаўчых ці педагагічна-выхаваўчых задач), метад экспертнага апытвання* (*ацэнак, меркаванняў кампетэнтных спецыялістаў, затым сістэматызацыя і фармулёўка ўзважаных высноў, каб ахарактарызаваць, напрыклад, такую з'яву як беларускі постмадэрнізм* і г.д.), *метад маніторынгу* і нек. інш.

Метады даследвання аўтар навуковай працы абірае, кансультуючыся са сваім навуковым кіраўнікам.

Навуковая праца абавязкова павінна быць скіравана *на атрыманне новых літаратурназнаўчых ведаў,* гэта значыць, характарызавацца навуковай навізной. Для маладога даследчыка бывае складаным (часам немагчымым) працэс адкрыцця абсалютна новых ведаў. У сувязі з гэтым у студэнцкіх і магістарскіх навуковых працах навізну акрэсліваюць пры дапамозе такіх тэрмінаў: *дапоўнены (дапаўняюцца), удакладнены, абагульнены, сістэматызаваны, класіфікаваны, праілюстраваны, абгрунтаваны, выяўлены* (*звесткі, заканамернасці, назіранні* і г.д.).

У дысертацыі важна паказаць адрозненне атрыманых вынікаў ад вядомых раней, апісаць ступень навізны, таму варта ўжываць такія выразы: *упершыню выяўлена, удасканалена метадалогія, атрымала далейшае развіццё (напрыклад, тэорыя М. Бахціна)* і нек. інш.

Кожнае навуковае палажэнне неабходна фармуляваць дакладна, вылучаючы яго асноўную сутнасць і засяроджваючы асаблівую ўвагу на ўзроўні дасягнутай навізны. Не варта фармуляваць навуковае палажэнне залішне разгорнута, у выглядзе анатацыі.

У даследаванні ўказваецца таксама практычнае значэнне атрыманых вынікаў. У сучасных дысертацыях, у дадатку, змяшчаюцца кароткія звесткі, даведкі або акты аб укараненні пра рэалізацыю вынікаў даследавання з указаннем месца (кафедры, факультэта, школы, каледжа), дзе прайшла апрабацыя.

*Уступ* дысертацыі заканчваецца кароткай характарыстыкай (анатацыяй) структуры і зместу навуковай працы. Напрыклад: *Дысертацыя складаецца з уступу, трох раздзелаў, заключэння, бібліяграфіі (137 пазіцый). Агульны аб'ём дысертацыі – 120 с., з іх 105 с. асноўнага тэксту.*

Далей зазначаюцца назвы раздзелаў і асноўныя задачы, якія будуць вырашацца ў кожным раздзеле. Пры гэтым выкарыстоўваюцца такія моўныя формулы: *Ва «Уступе» абгрунтоўваецца актуальнасць тэмы, вызначаюцца прадмет і аб'ект даследавання, яго навізна. Фармулююцца*

*мэта і задачы дысертацыі... Указваецца на тэарэтычнае і практычнае значэнне высноў і абагульненняў даследавання...*

*У першым раздзеле асноўнай часткі (або ва ўступе – у залежнасці ад спецыфікі тэмы) навуковай працы* выкладаюцца *тэарэтычныя асновы і кароткая гісторыя* ўзнятай праблемы (праблематыкі), прапануецца аб'ектыўны аналіз і ацэнка сабранага матэрыялу – вывучаных крыніц па праблеме даследавання. Назвы раздзелаў і іх зместавае напаўненне павінны быць накіраваны на вырашэнне задач, сфармуляваных даследчыкам, і пэўным чынам адпавядаць ім. Кожны раздзел пачынаецца з новай старонкі. У канцы кожнага раздзела фармулююцца высновы са сціслым выкладам атрыманых вынікаў.

У раздзеле, або ва ўступнай частцы працы, дзе даецца агляд прац айчынных і замежных навукоўцаў па ўзнятай праблеме, дапускаецца выкарыстанне наступных моўных формул: *аўтар разглядае, раскрывае, высвятляе, вырашае праблему, заглыбляецца ў праблему; улічвае, адзначае, што...; піша, што...; сцвярджае, што...; справядліва ўказвае на тое, што...; аўтар сцвярджае, аналізуе, характарызуе, пераканаўча даводзіць, параўноўвае, супастаўляе, высвятляе, спасылаецца на..., настойвае на значнасці..., фармулюе, сыходзіць з таго, што...; аўтар дапускае, выказвае дапушчэнне, прапануе; аўтар пярэчыць, сцвярджае, ігнаруе, крытыкуе, не падцвярджае выснову аналітычным даследаваннем, спрашчае, крытычна ставіцца, ставіць задачу, падмацоўвае выснову трапнымі спасылкамі, літаратурна-мастацкімі фактамі, прычыну бачыць у тым, што...*

Агляд літаратуры павінен заканчвацца высновамі і прапановамі адносна задач, якія неабходна вырашыць у кантэксце выконваемай працы. Моўныя клішэ гэтага складніка могуць быць такімі: *Нам уяўляецца, што...; Гэта дае нам падставу дапусціць, што...; Варта перайсці да разгляду...; Неабходна больш грунтоўна засяродзіцца на ...; Мэтазгодна прадоўжыць даследаванне...; Улічваючы здабыткі беларускіх і замежных літаратуразнаўцаў па названай праблеме, варта сфармуляваць абноўленыя (новыя) падыходы да...; У пачатку XX1 ст. выразнай стала тэндэнцыя да...; Як сведчыць прааналізаваны матэрыял...; Па нашых назіраннях, у апошнія дзесяцігоддзі актывізаваліся кампаратывістычныя (структуралісцкія...) падыходы да вывучэння...; Навуковая зацікаўленасць сучаснага літаратуразнаўства гэтай праблемай цалкам абгрунтавана.*

Усе наступныя раздзелы даследавання ўяўляюць канкрэтную аналітычную рэалізацыю плана і задач працы. Пры гэтым паказчыкам узаемасувязі структурных частак працы могуць быць такія выразы: *як ужо (вышэй) было сказана, паказана, адзначана, згадана; як ужо зазначалася, сцвярджалася вышэй; адпаведна з..., згодна з гэтым, паводле гэтага, у сувязі з тым, у сувязі са сказаным вышэй, зазначаны, згаданы вышэй* і нек.

інш. У навуковым даследаванні мэтазгодна ўжываць выразы-паказчыкі часавай суаднесенасці і парадку выкладу: *па-першае, па-другое; перадусім; перш чым; пасля таго, як...; у канцы; перад тым, як...; перш за ўсё; у першую чаргу; спачатку, цяпер; разам з тым.*

Прычыну і вынік, умову і вынік выражаюць такімі моўнымі формуламі: *таму, па гэтай прычыне, тым самым, дзякуючы таму, што, улічваючы гэта, у сувязі з тым, у такім выпадку, улічваючы тое, што, на гэтай падставе* і нек. інш. Паказчыкамі пярэчання, нязгоды, супастаўлення ці супрацьпастаўлення з'яўляюцца: *аднак, але, а, у параўнанні з..., у адрозненне ад..., з аднаго (іншага) боку, адначасова, тым часам, таксама, падобна да таго, аналагічна* і інш.

Ступень верагоднасці паведамлення падмацоўваецца такімі моўнымі адзінкамі: *відавочна, безумоўна, без сумнення, несумненна, бясспрэчна*; дапаўненні, удакладненні, вылучэнне асаблівага выпадку – *адначасова, акрамя, акрамя таго, напрыклад, дакладней, заўважым, галоўным чынам* і інш.

Высновы да раздзелаў павінны вынікаць з сутнасці вынікаў праведзенага даследавання.

Важнае патрабаванне да *агульных высноў* – іх сцісласць, дакладнасць, грунтоўнасць. Адпаведна абагульняюць уласныя назіранні, ацэньваюць вынікі, атрыманыя ў ходзе даследавання, указваюць ступень дасягнення пастаўленай мэты, вырашэння задач, прапануюць рэкамендацыі адносна практычнага выкарыстання атрыманых вынікаў. У высновах не паўтараюць змест уступу, асноўнай часткі і высноў да раздзелаў.

Выкладаюць высновы пры дапамозе такіх моўных клішэ: *абагульненыя вынікі праведзенага даследавання...; адзначана, што...*; *высветлена, што...; даследаванне засведчыла...; параўнальны аналіз паказаў, што...; можна зрабіць выснову, што...; абагульняючы сказанае...; улічваючы вышэй сказанае, падсумоўваючы, абагульняючы, маюцца падставы сцвярджаць, што...*

*Дадаткі,* звычайна, змяшчаюць аналітычна-прыкладную або эксперыментальную часткі працы, ілюстрацыі, табліцы, літаратурна-краязнаўчыя карты, пераклады твораў пісьменніка на іншыя мовы. Дадатак не з'яўляецца абавязковым элементам працы, але яго наяўнасць павышае ўзровень даверу да вынікаў даследавання.

Значныя цяжкасці заўсёды выклікае афармленне бібліяграфіі. *Бібліяграфія* – гэта звесткі пра крыніцы (кнігі, энцыклапедыі, манаграфіі, артыкулы і г.д.), прыведзеныя ў навуковай працы па пэўных правілах, і дастатковыя для ідэнтыфікацыі ўказанай крыніцы. Складаюць бібліяграфію ў адпаведнасці з існуючымі на сённяшні дзень патрабаваннямі дзяржаўнага стандарту. Выкарыстаныя ў даследаванні крыніцы размяшчаюць у парадку з'яўлення спасылак на іх у тэксце або ў алфавітным парадку прозвішчаў аўтараў.

Пасля падрыхтоўкі першага варыянта навуковага даследавання аналізуюць лагічную сувязь паміж асобнымі часткамі і складаюць канчатковы план з раздзеламі, падраздзеламі. На гэтым этапе вылучаюць дробязныя або другарадныя фрагменты тэкста і пры мэтазгоднасці пераносяць іх у дадатак (асабліва пры перавышаным аб'ёме працы).

Важна, каб аб'ём інфармацыі, пададзены ў кожнай частцы навуковай працы, быў дастатковым і зразумелым для ўспрымання, а назвы частак (загалоўкі раздзелаў) з'яўляліся своеасаблівым арыенцірам, які сведчыць аб канцэптуальнасці, лагічнасці тэксту.

Мова навуковай працы павінна вызначацца дакладнасцю, яснасцю, лаканічнасцю выкладу. Спецыяльныя тэрміны неабходна ўжываць у іх канкрэтным значэнні. Структура сказаў павінна быць празрыстай, негрувасткай, што спрыяе дакладнаму ўспрыняццю зместу. Немэтазгодна і недапушчальна выкарыстанне ў навуковым даследаванні канструкцый размоўнага стылю, выклад матэрыялу ад першай асобы, адвольныя скарачэнні.

Неабходна прытрымлівацца і агульнапрынятых правіл пераносу, калі *нельга:*

- пераносіць прозвішча, пакідаючы ў канцы папярэдняга радка ініцыялы (або адзін ініцыял), умоўныя скарачэнні (праф., акад., канд. філалаг. н.), якія да іх належаць (М.І. Мушынскі, а не М.І. // Мушынскі; акад. У.В. Гніламёдаў, а не акад. // У.В. Гніламёдаў);
- раз'ядноўваць графічныя ці ўмоўныя скарачэнні (і г.д., і мн. інш., выд-ва);
- адрываць скарочаныя назвы адзінак вымярэння ад лічбаў, да якіх яны належаць (2012 г., а не 2012 // г.; пач. XXI ст., а не пач. XXI // ст.);
- пераносіць на наступны радок граматычныя канчаткі, з'яднаныя з лічбамі праз злучок (2-і, а не 2 // і; 3-га, а не 3 // га);
- разрываць аднаскладовыя часткі складанаскарочаных слоў, акрамя камбінаванай абрэвіятуры (ВАК Беларусі, БДУ, НАН Беларусі);
- пакідаць у папярэднім радку адна-, двух- або трохлітарны прыназоўнік (у, на, пры), з якога пачынаецца сказ;
- пераносіць у наступны радок раздзяляльныя знакі, акрамя працяжніка, дужку ці двухкоссе, якія закрываюць папярэдні радок, а таксама пакідаць у папярэднім радку адкрытую дужку ці двухкоссе.

Граматны выклад працы грунтуецца не толькі на нормах словаўжывання, арфаграфіі, стылістыкі, але і на пунктуацыі. Неабходна ўважліва праверыць раздзяляльныя знакі пры ўстаўных канструкцыях, аднародных, адасобленых членах у складаных сказах.

Неад'емным складнікам навуковай працы з'яўляюцца *спасылкі і цытаванне.*

*Спасылкі* – гэта фрагменты навуковай працы, у якіх аўтар падае звесткі пра прадмет свайго даследавання, што выяўлена ім у іншых навуковых крыніцах. *Мэта спасылак* – аргументаваць, дапоўніць або праілюстраваць уласную думку фактамі з іншых навуковых тэкстаў; падмацаваць або параўнаць розныя падыходы вучоных адносна ўзнятай праблемы. Наяўнасць спасылак сведчыць пра навуковую дасведчанасць аўтара, абгрунтаванасць палажэнняў яго даследавання. У навуковым даследаванні неабходна даваць спасылкі на ўсе вядомыя крыніцы ці матэрыялы, згаданыя ў тэксце. Выкарыстанне асобных тэрмінаў, паняццяў, прапанаваных іншымі аўтарамі, таксама афармляецца спасылкамі. Гэта дапамагае адшукаць крыніцу, праверыць дакладнасць прыведзеных дадзеных, высветліць інфармацыю, абставіны ўзнікнення ідэі ці кантэксту. Навуковыя тэрміны, уведзеныя іншымі аўтарамі, не бяруцца ў двухкоссе, за выключэннем тых, якія выклікаюць агульную палеміку. У такіх выпадках часта выкарыстоўваюць выраз *так званы*. Варта звяртаць увагу на афармленне ініцыялаў і прозвішча аўтара. У спісе выкарыстаных крыніц спачатку ўказваюць прозвішча, а затым ініцыялы. У тэксце навуковага артыкула ці манаграфіі на першае месца ставяць заўсёды імя, або і імя па бацьку, а на другое – прозвішча. Калі перад прозвішчам называецца пасада, прафесія, то прозвішча і ініцыялы пішуць пасля назвы пасады. *Напрыклад: акадэмік Гніламёдаў У.В., псіхолаг Юнг К.-Г., літаратуразнаўца Тычына М.* Каб пазбегнуць непаразуменняў, неабходна ўважліва правяраць кожнае прозвішча і ініцыялы аўтараў, на якіх робяцца спасылкі. Наяўнасць спасылак сведчыць пра навуковую дасведчанасць аўтара, абгрунтаванасць палажэнняў даследавання.

Спасылкі можна рабіць у выглядзе цытат, даслоўнага ці недаслоўнага пераказу з асобнымі цытаванымі элементамі, з указаннем на аўтара.

*Цытата* – даслоўна прыведзены ўрывак з якога-небудзь тэксту для падмацавання або ілюстрацыі пэўнай думкі. Асноўная функцыі цытат у навуковым тэксце – кагнітыўная (пазнавальная) і аргументатыўная (быць доказам). Сярод цытат, якія ўжываюцца ў навуковым тэксце, пашыраны цытаты-тэзісы (імі можа карыстацца аўтар для складання плана лекцыі, выступлення, навуковага даклада) або цытаты-доказы, якімі карыстаюцца для падмацавання меркаванняў аўтара навуковага тэксту. Іх бяруць у двухкоссе, як простую мову. Словы цытаты прыводзяць у той граматычнай форме, у якой яны ўжыты ў літаратурнай крыніцы, з захаваннем асаблівасцей аўтарскага напісання. Цытаванне павінна быць поўным, без пераробкі і адвольнага скарачэння аўтарскага тэксту. У выпадку пропуску некалькіх слоў на пачатку цытаты ставіцца шматкроп’е. Кожная цытата суправаджаецца спасылкай на крыніцу, напрыклад: *«Купалаўская і коласаўская творчасць знаходзіліся ў фокусе «стратэгіі абуджэння» (А. Яскевіч). Прыярытэтнае месца ў ёй займалі традыцыйныя каштоўнасці, спадчына*

*мінулага, што спакваля ўступалі ў дыялог з найноўшымі дасягненнямі сусветнай філасофска-медытатыўнай думкі, з працэсамі агульначалавечай цывілізацыі» [4, с. 5] (Максімовіч В.А. Нацыянальны космас класікі: дыялог традыцый і наватарства ў творчасці Янкі Купалы і Якуба Коласа. Мінск, 2008. 320 с.).* Цытату патрэбна даваць непасрэдна з першакрыніц, а не з прац іншых аўтараў. Першакрыніцай з'яўляецца першадрук або акадэмічнае выданне тэксту. Калі першакрыніца недаступная (архіўная), можна пакарыстацца цытатай з іншага выдання, але з абавязковым пазначэннем «цытуецца па».

Калі пры цытаванні былі выдзелены нейкія словы, у дужках падаецца спецыяльнае тлумачэнне аб гэтым – часцей за ўсё імя і прозвішча аўтара навуковага тэксту. Напрыклад: *«У асобе Купалы і Коласа на авансцэну гісторыі выходзіў **беларускі месіянізм**, наўпрост звязаны з ідэалогіяй абуджэння пачуцця нацыянальнай годнасці і нацыянальнай свядомасці»* (выдзелена намі – З.М.).

Выклад думак іншых аўтараў, непрамое цытаванне падаюць без двухкосся, але і яно павінна быць дастаткова дакладным. Напрыклад: *«Купала і Колас, як слушна сцвярджае літаратуразнавец Максімовіч В., першымі адчулі небяспеку міжвольнага стварэння адмоўнага іміджу нацыі. Асаблівую нязгоду, па меркаванні гэтага даследчыка, у іх выклікалі малюнкі здзіўляючага падабенства гаротнага сялянскага жыцця, побытавай неўладкаванасці, адвечнай скаргі-плачу ў многіх творах тагачасных пісьменнікаў».*

Празмерная колькасць цытат і спасылак стварае ўражанне кампіляцыі (крадзяжа чужых думак) работы, яе рэфератыўнасці, адсутнасці аўтарскага бачання праблемы. Галоўная мэта цытавання – развіццё ўласнай ідэі шляхам яе параўнання з меркаваннямі іншых аўтараў. На старонках навуковай працы павінна быць аргументаваная і карэктная дыскусія. Пры гэтым неабходна асцерагацца плагіяту.

**Плагіят –** капіраванне чужых ідэй, тэксту без спасылак на першакрыніцу. Для выяўлення плагіяту ў тэксце дысертацый ВАК Беларусі выкарыстоўвае спецыяльныя камп'ютарныя праграмы. Яны даюць магчымасць знаходзіць фрагменты тоесных тэкстаў нават пры перакладзе з іншых моў. Калі ў рабоце выяўлецца плагіят, ВАК абавязкова павінна скасаваць рашэнне спецыялізаванага вучонага савета аб прысуджэнні навуковай ступені кандыдата ці доктара навук без права на паўторную абарону.

Важным этапам працы па стварэнні навуковага тэксту з'яўляецца яго *рэдагаванне:* праўка, вычытка, скарачэнне, дапрацоўка ці пераробка. Складанасць гэтага этапу заключаецца ў тым, што пастаянная праца над вялікім тэкстам прыводзіць да забывання паслядоўнасці размешчаных абзацаў, ужытых цытат і г.д. На этапе рэдагавання варта крытычна ацаніць напіса-

нае, пераправерыць канцэпцыю, узмацніць абгрунтаванасць высноў, прасачыць лагічнасць сувязей паміж структурнымі часткамі дысертацыі, прачытаць тэкст як бы «староннім вокам». Рэдагаванне – гэта павольнае, уважлівае чытанне тэкста з алоўкам у руках.

## 13. Навуковы артыкул

Важным працэсам навуковага даследавання з’яўляецца яго **апрабацыя**, гэта значыць спосаб кампетэнтнай ацэнкі навуковых ідэй аўтара іншымі спецыялістамі галіны, філолагамі-літаратуразнаўцамі. *Найбольш пашыранымі відамі апрабацыі з’яўляюцца навуковы артыкул і навуковы даклад (ці выступленне) на навуковай канферэнцыі.* Высокая патрабавальнасць да зместу, формы, мовы дае аўтару магчымасць паспяхова прадставіць свае навуковыя ідэі шырокаму колу чытачоў і слухачоў.

Агульнымі патрабаваннямі да навуковага артыкула і навуковага даклада з’яўляецца інфарматыўнасць, аргументаванасць, лагічнасць, сцісласць. Аднак, у адрозненне ад артыкула, навуковае выступленне – гэта жанр вуснага маўлення, абмежаваны часам, які вызначаецца непасрэдным кантактам са слухачамі.

**Навуковы артыкул** – від навуковай публікацыі, у якім прадстаўлены выніковыя або прамежкавыя вынікі праведзенага даследавання, абгрунтаваны і паказаны спосабы іх атрымання, а таксама акрэслены перспектывы распрацовак у гэтым накірунку. Аб’ём навуковага артыкула, звычайна, бывае ад шасці да дваццаці чатырох старонак, гэта значыць, да аднаго друкаванага аркуша. *Паводле зместу навуковыя артыкулы бываюць:*

1) уласна навуковыя артыкулы, у якіх выкладаюцца вынікі працы;

2) навукова-папулярныя артыкулы, якія адрасаваны чытацкай аўдыторыі, у якой могуць быць неспецыялісты. Прыкметай такіх артыкулаў з’яўляецца даступнасць інфармацыі;

3) навукова-навучальныя ці вучэбна-метадычныя артыкулы, якія змяшчаюць практыкаарыентаваны выклад матэрыялу, яго заканамернасцей, метады іх выкарыстання ў практычнай дзейнасці;

4) навукова-публіцыстычныя артыкулы, якія заўсёды прысвечаны актуальным для навуковай грамадскасці праблемам.

Навуковыя артыкулы прызначаюцца навукоўцам, спецыялістам пэўнай галіны або некалькіх галін. Па колькасці аўтараў яны бываюць аднаасобныя (адзін аўтар) ці калектыўныя (калектыў аўтараў, або сааўтараў).

Па спецыяльным прызначэнні артыкулы бываюць літаратуразнаўчымі, мовазнаўчымі, псіхалагічнымі, педагагічнымі, гістарычнымі і г.д. Паводле навуковых задач – тэарэтычнымі і прыкладнымі. Навуковыя артыкулы выконваюць *даследчыцкую функцыю,* калі падаюць навуковыя вынікі;

*прэзентацыйныя*, калі прадстаўляюць даследчыка і яго навуковыя ідэі ў пэўнай галіне; *ацэначныя,* калі аўтар ацэньвае стан навуковых даследаванняў па пэўнай праблеме. Прыкметамі стылю навуковага артыкула з’яўляюцца лагічнасць, сцісласць, дакладнасць навуковай інфармацыі, крытычнасць у адборы матэрыялу ці фактаў, завершанасць (цэласнасць у раскрыцці аднаго ці некалькіх пытанняў), лагічнасць і абгрунтаванасць высноў, наяўнасць спасылак і важных самастойных навуковых меркаванняў.

Па характары вырашэння даследчай задачы навуковыя артыкулы літаратуразнаўцаў бываюць, як правіла, *аглядавыя, праблемныя і тэарэтыка-метадалагічныя.* У *аглядавых* артыкулах даецца характарыстыка стану і перспектыў навуковых даследаванняў па той ці іншай праблеме. У *праблемных* артыкулах аналізуецца праблема, якая яшчэ не мела цэласнага, усебаковага асэнсавання і вывучэння. У *тэарэтыка-метадалагічных* артыкулах падаецца абгрунтаванне тэарэтычных паняццяў (інструментарыю) і метадалогіі навуковага вырашэння праблемы.

Падрыхтоўка навуковага артыкула складаецца з наступных этапаў:

1. Фармулёўка рабочай назвы артыкула: загаловак павінен быць лаканічным і дакладным, даваць уяўленне аб прадмеце гаворкі.

2. Вызначэнне межаў тэмы і аб’ёму навуковай інфармацыі, якая будзе прадстаўлена ў артыкуле.

3. Распрацоўка плана, асэнсаванне зместу будучага артыкула: яго ўступ, асноўная частка, высновы, перспектывы даследавання.

4. Ва ўступе акрэсліваецца змест артыкула:
   а) пастаноўка праблемы, высвятленне яе актуальнасці і навукова-практычнага значэння;
   б) аналіз іншых даследаванняў і публікацый, у якіх закранался вырашэнне гэтай праблемы і на якія абапіраецца аўтар;
   в) называюцца не вырашаныя раней пытанні, вырашэнню якіх прысвечаны артыкул;
   г) фармулююцца мэты і задачы артыкула.

5. Вызначэнне метадаў даследавання, бібліяграфіі, падрыхтоўка асноўных тэзісаў – адказаў на пастаўленыя пытанні-задачы.

6. Тлумачэнне абранай тэрміналогіі.

7. Абгрунтаванне ў асноўнай частцы атрыманых вынікаў. Тэкст павінен будавацца па прынцыпу – ад вядомага да невядомага, ад простага да складанага.

8. Праверка суаднесенасці, лагічнасці паміж загалоўкам, мэтай, задачамі артыкула і яго высновамі.

9. Развагі аб перспектывах навуковага вывучэння пытанняў па дадзенай праблематыцы.

10. Самаправерка выкананай працы на зместава-сэнсавым, лагічным і моўнастылістычным узроўнях (адпаведнасць патрабаванням навуковага стылю, афармленню цытат і спасылак, існуючым арфаграфічным і стылістычным нормам).

11. Афармленне спісу выкарыстаных крыніц паводле існуючых патрабаванняў.

Мэта ўступу навуковага артыкула – паказаць, што дадзенае даследаванне з'яўляецца развіццём, працягам распрацоўкі пэўнай праблематыкаі, палажэнняў або палемікай з іншымі накірункамі вырашэння гэтай праблемы ці асобнымі навукоўцамі. Вызначаючы ва ўступе праблему і яе актуальнасць, аўтар павінен прааналізаваць публікацыі апошняга часу, у якіх закраналася вырашэнне гэтай праблемы, акрэсліць пытанні, якім прысвечаны артыкул. Высвятленне актуальнасці не павінна быць шматслоўным, галоўнае – паказаць сутнасць праблемнай сітуацыі, якая патрабуе вывучэння. Аналіз прац, у якіх разглядаецца актуальнае пытанне, важнае для разумення прадмета даследавання. Фармуляванне мэты артыкула прадугледжвае дасягненне яе праз вырашэнне канкрэтызаваных задач. Напрыклад: *Нягледзячы на тое, што ў апошнія дзесяцігоддзі да аналітычнага вывучэння творчасці Васіля Быкава звярталіся даследчыкі Дз. Бугаёў, В. Буран, В. Локун, І. Дзядкоў, А. Адамовіч, В. Каваленка і іншыя, усё ж пытанні сюжэталогіі быкаўскіх празаічных твораў цэласна і сістэмна ў беларускім літаратуразнаўстве не вывучаліся.*

*У прапанаваным артыкуле ставіцца мэта – вызначыць сюжэталагічныя асаблівасці аповесцей В. Быкава «Жураўліны крык» і «Круглянскі мост».*

Для падмацавання актуальнасці тэмы і важнасці даследавання варта выкарыстоўваць моўныя клішэ: *сярод праблем, звязаных з...; на сённяшнім этапе развіцця айчыннага літаратуразнаўства засяроджанага вывучэння патрабуюць пытанні ...; асаблівую ўвагу варта звярнуць на...; да гэтага часу толькі фрагментарна вывучаліся пытанні...; не была аб'ектам спецыяльнага вывучэння праблема...*

Мэту і задачы навуковага артыкула дапамагаюць сфармуляваць такія моўныя спосабы: *акрэслім...; высветлім...; мэта артыкула – даследаваць..., прасачыць, вылучыць, падсумаваць, акрэсліць перспектывы, сістэматызаваць, абагульніць, ахарактарызаваць, прааналізаваць* і інш.

Асноўная частка артыкула павінна займаць прыкладна тры чвэрці аб'ёму тэксту. Усе меркаванні неабходна выкладаць так, каб чытачу была зразумелай сутнасць прапанаваных праблем і ідэй. Пры выкарыстанні малавядомых тэрмінаў, неабходна абавязкова даць іх тлумачэнне. Фактычны матэрыял, яго асаблівасці (напрыклад, тэматыка творчасці пісьменніка, жанравыя адметнасці), якія з'яўляюцца аб'ектам даследавання, можа быць

пэўным чынам класіфікаваны, згрупаваны і суправаджацца неабходным каментарам.

Для выкладу гісторыі і сучаснага стану распрацоўкі пытання ў навуковай літаратуры варта карыстацца наступнымі словазлучэннямі: *Агульнавядома, што…; Існуючыя ў сучасным літаратуразнаўстве падыходы сведчаць, што…; Названых поглядаў прытрымліваюцца …*

Выклад сутнасці даследавання ў науковым артыкуле можа змяшчаць такія выразы: *Маюцца ўсе падставы сцвярджаць…; Асэнсаваныя (прааналізаваныя, вывучаныя) матэрыялы даюць магчымасць…*

У навуковым артыкуле, выражаючы ўпэўненасць у правільнасці абраных падыходаў, можна карыстацца моўнымі зваротамаі: *безумоўна, што…; з'яўляецца відавочным, што…; няма сумнення ў тым…; вынікі аналітычнага вывучэння падмацоўваюць справядлівасць…*

Крытычныя заўвагі дапамагаюць выказаць наступныя моўныя формы: *нельга пагадзіцца; выклікае сумненне; наўрад ці мэтазгодна; існуюць супярэчнасці ў поглядах (падыходах) на…; аўтар дапусціў, на наш погляд, недакладнасць* і інш.

Робячы высновы, яшчэ раз правяраюць адпаведнасць паміж назваю, мэтаю, задачамі. Высновы не павінны паўтараць уступу. У высновах указваюць, што высветлілася ў выніку навуковага даследавання і вырашэння задач, тлумачаць навуковае і практычнае значэнне працы. Мэтазгодна таксама падаваць выразнае бачанне перспектывы даследавання па гэтай праблематыцы. Напрыклад: *Існуе патрэба ў заглыбленым комплексным вывучэнні не толькі творчасці выбітных пісьменнікаў эпохі Асветніцтва, якім і быў пісьменнік-філосаф Ігнацій Быкоўскі, але і сістэмнага акадэмічнага даследавання польскамоўнай літаратуры Беларусі.*

Вычытваючы навуковы артыкул, патрэбна высветліць, ці адлюстроўвае яго назва асноўную ідэю зместу, ці не занадта яна шматслоўная, ці лагічная структура. Важна праверыць дакладнасць цытавання і спасылак.

Прыкра сустракаць у філалагічных даследаваннях моўныя недахопы і памылкі. Найбольш пашыранымі з'яўляюцца: ужыванне тэрмінаў без уліку іх значэння, перавага іншамоўных слоў, парушэнне граматычных правілаў, схематызм, бяздоказнасць прапанаваных палажэнняў. Часам у навуковых артыкулах сустракаецца некарэктнае называнне аўтара навуковай працы, на якую робіцца спасылка, «ён» або «яна», маўленчая празмернасць або шматслоўе ці, наадварот, маўленчая недастатковасць, калі апускаюцца словы, патрэбныя для дакладнага выражэння думкі. Сярод тыповых недахопаў у навуковых тэкстах маладых вучоных часта сустракаюцца калькі, асабліва з рускай мовы. Падрыхтаваны навуковы артыкул праз нейкі час варта яшчэ раз перачытаць, уважліва і крытычна ацаніць яго структуру і сэнсавае напаўненне.

## 14. Навуковая рэцэнзія. Навуковы водгук

Жанрам аператыўнага рэагавання на навуковыя адкрыцці і дасягненні з’яўляецца **навуковая рэцэнзія**. Гэта – спецыяльны тэкст-аналіз навуковай крыніцы або некалькіх крыніц, разлічаны на пэўнае кола спецыялістаў. Рэцэнзія выконвае функцыю навуковага інфармавання ці азнаямлення з навуковай працай, асэнсавання і ацэнкі пэўных навуковых ведаў у навуковых колах, а таксама прагматычную і рэкламную функцыі, калі неабходна зацікавіць аналізуемым матэрыялам (манаграфіяй, кнігай) чытачоў.

Характэрнымі прыкметамі навуковай рэцэнзіі з’яўляецца падкрэсленая лагічнасць (паслядоўнасць, сістэмнасць выкладу), дакладнасць, ацэначнасць, адсутнасць суб’ектыўнай эмацыйнасці, сціслацсь.

Аўтарам рэцэнзіі, як правіла, з’яўляецца спецыяліст той самай галіны, да якой належыць і рэцэнзуемы дакумент, або блізкай галіны. Тэкст навуковай рэцэнзіі прадугледжвае каментар асноўных палажэнняў, абагульненую аргументаваную ацэнку, высновы пра значэнне рэцэнзуемай працы. Аб’ектамі навуковай рэцэнзіі могуць быць манаграфія, навучальны дапаможнік, дысертацыя, студэнцкая дыпломная праца і некаторыя іншыя. Ацэньваць неабходна паўнату, глыбіню, усебаковасць раскрыцця тэмы, навізну і актуальнасць пастаўленых задач і праблем, карэктнасць аргументацыі і сістэмы доказаў, дакладнасць вынікаў і верагоднасці высноў.

Навуковая рэцэнзія – складаная праца і патрабуе ад рэцэнзента высокай прафесійнасці, сфарміраваных уменняў весці ўяўны дыялог з аўтарам даследавання (ці чытачамі, калі гаворка ідзе пра рэцэнзію на літаратурны твор пісьменніка). *Схема напісання рэцэнзіі* можа быць такой:

1) вызначэнне прадмета навуковага аналізу (даклад, рэферат, часопісны артыкул, навучальны дапаможнік, дысертацыя і інш.), аналіз загалоўка кнігі ці тэмы даследавання;

2) высвятленне актуальнасці тэмы даследавання (для айчыннага літаратуразнаўства, вырашэння яго практычных і тэарэтычных задач);

3) аналіз структуры і зместу працы;

4) вызначэнне ступені навізны і арыгінальнасці ў вырашэнні пэўных праблем;

5) вызначэнне тэарэтычнага і практычнага значэння выкананай працы;

6) выяўленне недахопаў рэцэнзуемай працы пры ўмове аргументаванасці заўваг рэцэнзента;

7) аб’ектыўная, лаканічная, дакладная агульная ацэнка работы;

8) фармулёўка высноў з улікам віду і жанру рэцэнзуемай працы, яе мэты і пастаўленых аўтарам задач;

9) праверка тэксту рэцэнзіі на адпаведнасць паміж зместам і формай, а таксама існуючым моўным нормам;

10) рэдагаванне тэксту рэцэнзіі.

Для вызначэння прадмета аналізу, актуальнасці карыстаюцца такімі выразамі: *у рэцэнзуемай працы...; важнасць працы бясспрэчная; у аналізуемым рукапісе манаграфіі (артыкуле і г.д.); праца прысвечана актуальнай тэме...; актуальнасць даследавання абумоўлена...; зварот да гэтай праблемы (праблематыкі) з'яўляецца актуальным.*

Кароткі змест навуковай рэцэнзуемай крыніцы характарызуюць пры дапамозе такіх выразаў: *даследаванне складаецца з уступу, ... раздзелаў, высноў, дадаткаў (калі `ёсць). На пачатку даследавання (дысертацыі, манаграфіі, артыкула) аўтар указвае на...*

*Станоўчую* ацэнку навуковай працы выражаюць такія моўныя формулы: *даследаванне вядомага літаратуразнаўцы з'яўляецца адной з перспектыўных спроб навуковага асэнсавання...; праца вызначаецца аналізам вялікага аб'ёму мастацкага матэрыялу, нестандартным падыходам да аналізу ўзнятых праблем; тэарэтычныя палажэнні ілюструюцца багатым літаратурна-мастацкім матэрыялам; вялікай заслугай даследчыка з'яўляецца...; дастаткова абгрунтавана, з улікам напрацовак сучаснага айчыннага і замежнага літаратуразнаўства, уласнай прафесійнай дзейнасці выкладзена канцэпцыя...; аўтар справядліва (слушна) зазначае, аргументавана выказвае перакананне, робіць высновы, дакладна вызначае, дэталёва аналізуе, уважліва разглядае, праніклівa прасочвае, доказна крытыкуе; аргументавана і пераканаўча раскрывае сэнсавае напаўненне, выкарыстоўвае сучасную метадалогію і ключавыя паняцці.*

*Негатыўную* ацэнку навуковай працы выражаюць так: *аўтару не ўдалося паказаць, што...; аўтар пакінуў без адказу такія пытанні, як...; выклікае сумненне тэзіс аўтара пра тое, што...; сярод недахопаў даследавання – празмерная (неапраўданая) катэгарычнасць высноў аўтара.*

У высновах навуковай рэцэнзіі выкарыстоўваюць такія клішэ: *аднак, рэцэнзуемая праца мае важнае значэнне для...; высновы аўтара доказныя; заслугай аўтара варта лічыць новы падыход да вырашэння...; манаграфія (навукова-метадычны дапаможнік) з'яўляецца арыгінальнай па задуме, глыбокай па паўнаце вырашэння...*

Прызначэнне рэцэнзуемай працы выражаюць пры дапамозе такіх моўных формул: *кніга будзе карыснай для студэнтаў філалагічных факультэтаў (магістрантаў, вучняў старэйшых класаў, настаўнікаў); рэцэнзуемы рукапіс рэкамендуецца да друку і выкарыстання ў адукацыйна-выхаваўчым працэсе* і г.д.

Навуковая рэцэнзія звычайна характарызуецца выяўленнем асобы рэцэнзента, што ўвасабляецца ў выкарыстанні розных адпаведных моўных адзінак. Расійскія філолагі А. Бажэнава і М. Кацюрава вылучаюць наступныя тыпы ацэначнасці:

1) аксіялагічны (адлюстраванне ацэначных адносін: *высокі ўзровень, бліскучая ідэя, бездакорная аргументацыя*);

2) ментальны (мае эмацыйна-інтэлектуальны характар: *рацыянальны падыход, дакладны аналіз* і псіхолага-інтэлектуальны: *важны ўклад, сур'ёзная спроба*);

3) прагматычны (адлюстроўвае практычныя інтарэсы рэцэнзента: *сучасная пастаноўка праблем, акадэмічная скіраванасць*).

Разнавіднасцю навуковай рэцэнзіі з'яўляецца навуковы водгук.

**Навуковы водгук** – гэта сціслая форма пісьмовай ацэнкі навуковай працы (дапломнай, магістарскай, кандыдацкай ці доктарскай дысертацый). Водгук на дысертацыю складае афіцыйны апанент на падставе вывучэння дысертацыі і прац суіскальніка навуковай ступені, апублікаваных па тэме дысертацыі.

**Афіцыйны апанент** – асоба, прызначаная вучонай радай па абароне дысертацый для рэцэнзавання дысертацыі і аўтарэферату да яе. Афіцыйны апанент выступае з навуковым водгукам на абароне дысертацыі.

У навуковым водгуку неабходна спыніцца на завершанасці выкананай працы, засяродзіцца на самых важных момантах, выявіць станоўчыя бакі даследавання і яго недахопы. Навуковы водгук таксама вытрымліваецца ў адпаведнасці з моўнымі клішэ: характарызуецца значнай стндартызаванасцю, дакладным захаваннем патрабаванняў ВАК. Аб'ём водгука прыкладна 3–5 і 5–7 старонак для кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый адпаведна.

**Водгук павінен раскрываць такія аспекты:**

- актуальнасць абранай тэмы з улікам яе цеснай сувязі з дзяржаўнымі ці галіновымі навуковымі праграмамі, прыярытэтнымі накірункамі развіцця філалагічнай навукі;
- ступень абгрунтаванасці навуковых палажэнняў, высноў і рэкамендацый, сфармуляваных у дысертацыі;
- ключавыя праблемы даследавання;
- значэнне дысертацыйнага даследавання для філалагічнай тэорыі і практыкі;
- даставернасць асноўных вынікаў, іх навізну, паўнату выкладу ў спецыяльных навуковых выданнях;
- магчымыя канкрэтныя шляхі выкарыстання вынікаў даследавання.

Пры напісанні водгуку важна звяртаць увагу на патрабаванні да моўнага афармлення дысертацыі, адпаведнасці яе зместу спецыяльнасці, па якой яна пададзена да абароны, адпаведнасць зместу аўтарэферата і асноўных палажэнняў дысертацыі.

У водгуку на кандыдацкую дысертацыю неабходна ўказаць, што праца з'яўляецца завершанаю, у ёй атрыманы новыя, навукова абгрунтава-

ныя вынікі, якія вырашаюць канкрэтную навуковую задачу, або новыя навукова абгрунтаваныя тэарэтычныя і (ці) практычныя вынікі, істотныя для развіцця канкрэтнага накірунка літаратуразнаўства. У водгуку на доктарскую дсертацыю неабходна поўна і аргументавана давесці, якія канкрэтна новыя навукова абгрунтаваныя вынікі ў галіне навукі атрыманы, што яны вырашаюць важную навуковую праблему; якія атрыманы новыя навукова абгрунтаваныя метады, напрамкі ў літаратуразнаўстве, што забяспечваюць вырашэнне прыкладной праблематыкі; якія атрыманы прынцыпова новыя тэарэтычныя і практычныя вынікі, што з’яўляецца важным дасягненнем для развіцця канкрэтнага накірунку навукі.

Галоўнае патрабаванне да водгука – крытычны, аб’ектыўны падыход да навуковага даследавання. Ад аргументаванасці і паўнаты высноў апанента ў значнай меры залежыць ацэнка дысертацыі спецыялізаваным вучоным саветам, яго рашэнне аб прысуджэнні навуковай ступені суіскальніку. У навуковым водгуку могуць быць выкарыстанымі клішэ:

- для вызначэння прадмета аналізу і актуальнасці тэмы *праца прысвечана актуальнай тэме; актуальнасць тэмы абумоўлена; відавочна, што...* і інш.
- кароткага выкладу зместу: *даследаванне складаецца з уступу, раздзелаў, высноў, спісу выкарыстаных крыніц;*
- пазітыўнай ацэнкі навуковай працы: *вартасцю працы з’яўляецца; работа каштоўная тым, што ў ёй прадстаўлены...; доказна фармулюецца; аўтар выявіў уменне аналізаваць, сістэматызаваць, абагульняць матэрыял; праца вызначаецца аналітычным вывучэннем вялікага аб’ёму мастацка-літаратурнага матэрыялу, арыгінальнымі падыходамі да вырашэння пастаўленых задач, высокай інфармацыйнасцю; аўтар слушна (справядліва) зазначае, дэталёва аналізуе, уважліва прасочвае эвалюцыю, доказна крытыкуе* і г.д.
- дыскусійных пытанняў навуковай працы: *даследаванне не пазбаўлена пэўных дыскусійных момантаў; занадта катэгарычнымі, на наш погляд, з’яўляюцца сцвярджэнні аўтара пра...; некаторыя палажэнні аўтара застаюцца бяздоказнымі, у іх ліку...; высновы аўтара месцамі не карэктныя; не ўсе прыведзеныя прыклады падцвярджаюць ідэю…*
- высноў работы: *прааналізаваная праца мае важнае значэнне для...; работа заслугоўвае высокай ацэнкі; высновы аўтара доказныя, вынікаюць з аналізу значнага фактычнага матэрыялу; даследаванне паглыбляе; выказаныя заўвагі зніжаюць вартасць дысертацыі, але не з’яўляюцца прынцыповымі і не ўплываюць на агульную станоўчую ацэнку працы.*

Водгук на дыпломныя, магістарскія даследаванні, кандыдацкія і доктарскія дысертацыі піша таксама і навуковы кіраўнік. І гэты водгук таксама павінен змяшчаць элементы рэцэнзіі. Кіраўнік дапамагае сфармі-

раваць у навуковай моладзі ўменні і навыкі аналітыка-філалагічнай дзейнасці, афармлення і прэзентацыі вынікаў навуковага даследавання: аказвае дапамогу падчас выбару тэмы, падбору літаратуры, метадалогіі і метадаў даследавання; аналізуе з маладым навукоўцам змест працы і яе вынікі; кантралюе выкананне даследавання. *У водгуку навуковага кіраўніка павінна быць адлюстравана:* сувязь абранай тэмы з актуальнымі праблемамі навукі; тэарэтычнае і практычнае значэнне распрацоўкі тэмы; кампазіцыйная структура працы; творчае выкарыстанне навуковай, метадычнай, спецыяльнай, даведачнай літаратуры; каштоўнасць і характарыстыка сабранага матэрыялу; ступень самастойнасці студэнта (магістранта, аспіранта) у выкананні даследавання; характарыстыка высноў і абагульненняў; паўната спісу выкарыстанай літаратуры і культура цытавання; культура выкладу матэрыялу, якасць афармлення даследавання; станоўчыя і крытычныя моманты ў выкананай працы.

Навуковы кіраўнік ацэньвае ўменне студэнта (магістранта, аспіранта) арганізаваць сваю працу, лагічна і самастойна мысліць, працаваць з навуковай літаратурай, праводзіць аналітычнае даследаванне матэрыялу, усведамляць аб'ём і сэнс тэарэтыка-метадалагічных паняццяў і рэалізоўваць іх у практычнай дзейнасці, рабіць высновы з атрыманых вынікаў. Навуковы кіраўнік не павінен у водгуку аналізаваць само даследаванне, гэта задача рэцэнзента (апанента). У водгуку навуковага кіраўніка могуць быць наступныя моўныя клішэ: *Пад час вучобы ў магістратуры (аспірантуры)... зарэкамендаваў сябе ўдумлівым (кваліфікаваным) спецыялістам; выкананая праца можа стаць асновай для далейшых навуковых пошукаў...; магістрант зарэкамендаваў сябе здольным да выканання як тэарэтычных, так і практыкаарыентаваных даследаванняў* і г.д.

Побач з захаваннем патрабаванняў у навуковай рэцэнзіі і ў навуковым водгуку могуць мець месца асабістыя ацэнкі аўтара. І рэцэнзія, і водгук павінны засведчыць уменне рэцэнзента даваць прафесійную ацэнку даследаванню, карэктна рабіць заўвагі, карэктна весці навуковую дыскусію, палемізаваць, прапаноўваць.

## Пытанні і заданні

1. Даць характарыстыку навуковаму тэксту. Чаму мае месца выказванне аб тым, што кожны навуковы тэкст індывідуальны?
2. Асэнсуйце разнавіднасці навуковых тэкстаў у адпаведнасці з іх прызначэннем. Раскрыйце сутнасць кожнага з іх.
3. Назавіце ўмовы паспяховага ўспрыняцця, усведамлення і разумення навуковага тэксту.
4. З якой мэтай складаюцца канспекты? Якія віды іх існуюць?

5. Што такое анатацыя і якая яе структура?

6. Чым адрозніваюцца тэзісы і рэферат?

7. Параўнайце структуру курсавой, дыпломнай, магістарскай і кандыдацкай прац.

8. З якой мэтай у навуковы тэкст уключаюць спасылкі? Ахарактарызуйце спосабы афармлення цытат у навуковым тэксце.

9. Высвятліце сутнасць плагіяту і кампіляцыі.

10. Як патрэбна фармуляваць высновы да раздзелаў і агульныя высновы да кваліфікацыйных прац?

11. Чым адрозніваецца навуковы артыкул ад навуковага выступлення? Навуковая рэцэнзія ад навуковага водгука?

## 15. Культура вуснага выказвання навукоўца. Навуковы даклад. Выступленне

Культура вуснага навуковага выступлення мае вялікае значэнне. У слухачоў заўсёды выклікае цікавасць камунікатыўная ўстаноўка прамоўцы, выражэнне яго адносін да слухачоў, здольнасць выклікаць іх давер да прадмету гаворкі і да самога сябе. Слухачамі заўсёды ацэньваецца асоба дакладчыка, яго этычнасць і талерантнасць пры дыскусіі, уменне весці навуковы дыялог з калегамі, адкрытасць, здольнасць прадставіць уласныя думкі ў арыгінальнай форме, валоданне рэплікай і паўзай і г.д.

Важнай формай апрабацыі вынікаў навуковага даследавання з’яўляюцца навуковы даклад і навуковае выступленне на канферэнцыях, семінарах, круглых сталах. *Навуковы даклад* – гэта жанр навуковага стылю, які ўяўляе разгорнутае паведамленне па пэўнай тэме ці праблеме, зафіксаванае ў вуснай ці пісьмовай форме і агучваецца на пасяджэнні навуковага таварыства.

Навуковы даклад адрозніваецца ад навуковага выступлення большым аб’ёмам (да 15–20 старонак) і прызначаны, як правіла, для выступлення на пленарным пасяджэнні. Навуковае выступленне мае аб’ём да 5–7 старонак і яно, звычайна, агучваецца на секцыйным пасяджэнні канферэнцыі ці іншага сходу навукоўцаў. *Навуковае выступленне* – публічная прамова, якая ўтрымлівае асобны пункт гледжання па пэўным пытанні.

У навуковым дакладзе выкладаецца кампетэнтны погляд на важную для спецыялістаў праблему, таму, звычайна, з дакладам выступаюць дасведчаныя навукоўцы, што павышае ўзровень навуковага форуму, дазваляе іншым навукоўцам зверыць свае погляды на дадзеную праблему з перакананнямі і высновамі дакладчыка.

Паводле функцый навуковыя даклады могуць быць розных тыпаў: *тэматычныя*, калі падаецца разгорнуты выклад пэўнай навуковай

праблемы; *інфармацыйныя*, калі дакладчыкам прапануецца інфармацыя пра стан даследаванняў у пэўнай галіне навуковай дзейнасці; *зводныя*, калі абагульняюцца, напрыклад, вынікі працы некалькіх навукова-даследчых груп, школ.

Поспех навуковага даклада залежыць ад прадуманай логіка-кампазіцыйнай будовы маўлення дакладчыка, доказнасці, аргументаванасці, кантакту з аўдыторыяй, умення выкарыстоўваць розныя прыёмы актывізацыі ўвагі, высокай моўнай культуры, моўных спосабаў выразнасці (метафары, фразеалагізмы, прыказкі, тропы) і карэктнасці пазамоўных фактараў – позы, манеры, жэстаў, мімікі, а таксама тэхнікі маўлення.

Навуковыя даклад і выступленне павінны вызначацца правільнасцю ўжытых моўных форм, сэнсавай адэкватнасцю ў адпаведнасцю з пастаўленымі дакладчыкам задачамі. Даследчыкі прапануюць прытрымлівацца наступных *прынцыпаў пабудовы навуковых дакладаў:*

1) прынцып сціслаcці (імкненне выказаць максімальную па аб'ёму інфармацыю мінімальнай колькасцю моўных сродкаў);

2) прынцып паслядоўнасці (прадугледжвае паслядоўна-лагічны выклад матэрыялу);

3) прынцып мэтанакіраванасці (пабудова кампазіцыі даклада па схеме «праблема – тэма – тэзіс – аргумент – мэта»);

4) прынцып нарошчвання або ўзмацнення (тэмп маўленчага ўплыву на слухачоў узрастае паступова, праз пералік аргументаў і фактаў);

5) прынцып выніковасці (выступленне павінна мець высновы, пэўныя рэкамендацыі).

Падрыхтоўка навуковага даклада, звычайна, утрымлівае такія этапы:

1. Этап інтэнцыі (вынаходніцтва). Гэта першы этап, на якім фарміруецца задума і вызначаецца матывацыя выступлення, тэма, мэта, ідэя, аб'ём інфармацыі. Выпрацоўваецца канцэпцыя, гэта значыць сістэма поглядаў, разумення літаратурных з'яў і працэсаў, прадумваецца набор доказаў і адпаведная навуковая тэорыя. Канцэпцыя ўвасабляе бачанне аўтара, яго ацэнку прадмета і матэрыяла даследавання, ад чаго залежыць падбор аргументаў. Дакладчык павінен апрацаваць значную колькасць матэрыялу з розных крыніц па тэме даследавання (манаграфіі, навуковыя часопісы, у тым ліку і замежныя, інтэрнэт-рэсурсы), асэнсаваць яго, вырашыць, што будзе выкарыстана ў яго дакладзе.

Тэма даклада ці выступлення павінна быць зразумелай, адначасова не прымітыўнаю і адлюстроўваць змест прамовы, яна павінна закранаць і актывізаваць увагу слухачоў. Дакладчык павінен улічваць характар аўдыторыі (узрост, колькасць слухачоў, навуковыя зацікаўленні), мэту і месца правядзення навуковага форуму.

2. Этап распрацоўкі. Найперш неабходна скласці план выступлення, у якім выразна вызначыць паслядоўнасць структурных частак даклада. Лепш пабудаваць план так, каб наступная ідэя вынікала з папярэдняй, каб быў між імі лагічны пераход. На гэтым этапе вызначаюць праблемы дыскусійнага характару, падбіраюць фактычны матэрыял, прагназуюць магчымыя пытанні слухачоў і адказы на іх. Уступ даклада павінен абудзіць цікавасць слухачоў, асноўная частка – стаць лагічным працягам пытанняў уступу і прэзентаваць аўтарскае бачанне праблемы; у высновах абагульняюцца асноўныя ідэі выступлення. Асаблівую ўвагу неабходна звяртаць на высновы, на логіку падсумавання вынікаў працы.

Недахопамі структуры даклада лічыцца нераўнамернасць кампазіцыйных кампанентаў і адсутнасць лагічнай сувязі між імі, парушэнне паслядоўнасці выкладу, дэкларатыўнасць і бяздоказнасць.

3. Этап славеснага афармлення думак. На гэтым этапе правяраецца матэрыял на адпаведнасць мэце і логіцы выступлення, дакладнасць інфармацыі, адбываецца напісанне даклада, гэта значыць, яго моўна-стылістычнае афармленне. Важна прадумаць, дзе будуць зроблены неабходныя псіхалагічныя або лагічныя паўзы, выдзеліць гэтыя мясціны ў тэксце. У залежнасці ад вопыту, досведу, узроўню аратарскага майстэрства дакладчыка пішацца ўвесь тэкст даклада або толькі план да яго. Але вопыт паказвае, што лепш выступаць, арыентуючыся на тэкст. Гэта пакідае ў слухачоў уражанне вольнага валодання матэрыялам і надае дакладчыку ўпэўненасць. Напісаны тэкст можна пераправерыць, выправіць, палепшыць.

4. Этап запамінання. Чытанне ўголас, трэніроўка дакладчыка дапаможа праверыць напісаны матэрыял, праверыць колькасць часу, які будзе затрачаны на выступленне, унесці неабходныя ўдакладненні і выпраўленні. Для гэтага важна пазначыць ключавыя словы, тэрміны. Непажадана ўжываць складаныя сінтаксічныя канструкцыі. Варта ўводзіць у даклад дзеясловы *высветлім, прасочым, разгледзім, ахарактарызуем, патлумачым, адзначым, параўнаем, размяжуем, прааналізуем, прадэманструем,* якія актывізуюць увагу слухачоў і выконваюць камунікатыўныя функцыі. Пры гэтым неабходна ўлічваць узровень падрыхтоўкі аўдыторыі, дасведчанасць слухачоў па прадмеце гаворкі.

5. Этап публічнага выступлення. На гэтым этапе асабліва важны кантакт з аўдыторыяй. Выступленне мэтазгодна пачаць са звароту да прысутных, а не з чытання тэксту. Дакладчык павінен прамаўляць упэўнена і зразумела, «адчуваць аўдыторыю». Спецыялісты па рыторыцы раяць пазбягаць маўленчых штампаў, уласцівых афіцыйна-дзелавому стылю, ужываць моўныя звароты, якія робяць інфармацыю больш выразнай. Устанавіць кантакт з аўдыторыяй, прасачыць развіццё важных думак, іх доказнасць і аргументацыю дапамагаюць дакладна ўжытыя рытарычныя пытанні.

Спецыялісты вылучаюць наступныя прыёмы ўтрымання ўвагі слухачоў:

1) прыём саўдзелу: выкарыстанне дзеясловаў першай асобы множнага ліку – *зазначым, спынімся на такіх аспектах* і г.д.

2) прыём апелявання да навуковай грамадскасці, асабістага вопыту слухачоў, іх досведу;

3) прыём тэкставага чакання: падаецца спачатку факт, а потым каментар да яго;

4) прыём псіхалагічнай паўзы між блокамі навуковай інфармацыі: яе працягласць – 5–7 секунд;

5) прыём парадаксальнай сітуацыі: разгляд адной падзеі, літаратурнага факта ў розных аспектах;

6) прыём пастаноўкі праблемнага пытання: на пачатку даклада фармулюецца праблемнае пытанне і на працягу выступлення «разам са слухачамі» шукаецца адказ на яго;

7) прыём выкарыстання фактычнага матэрыялу, відавочных прыкладаў: пры неабходнасці да выступлення далучаюцца статыстычныя, храналагічныя звесткі, прыклады-ілюстрацыі, каб слухачы атрымалі паглыбленае ўяўленне аб прадмеце навуковага дыялогу.

Важную ролю на этапе чытання даклада мае разнастайнасць інтанацый, чысціня і яснасць тэмбру голаса, эмацыйная насычанасць фраз, здатнасць дакладчыка голасам эмацыйна ўплываць на слухачоў. Дакладнае вымаўленне слоў указвае на ўнутраную дысцыпліну дакладчыка, невыразнае вымаўленне стварае ўражанне няўпэўненасці; занадта гучнае, тэмпераментнае вымаўленне стварае ўражанне навязвання пазіцыі; дужа ціхае і павольнае – перашкаджае адэкватнаму ўспрыняццю зместу і сэнсу.

Лепшай позай для выступлення з дакладам з’яўляецца нязмушаная пастава з крыху ўзнятай галавой і распраўленымі плячыма. Калі адчулася страта ўвагі слухачоў, варта змяніць тэмп маўлення, прывесці цікавы прыклад. Не пажадана звяртаць увагу незвычайнай манерай маўлення, асаблівымі жэстамі, мімікай ці экстравагантным выглядам.

Немэтазгодна злоўжываць увагай слухачоў. Выступленне павінна доўжыцца толькі вызначаны рэгламентам час. За дзесяць хвілін можна прачытаць прыкладна чатыры старонкі машынапіснага тэксту праз два інтэрвалы.

6. Этап паслаблення напружання. Пасля выступлення з дакладам карысна прааналізаваць зместавы і кампазіцыйныя аспекты паводле кантактавання з аўдыторыяй, высветліць прычыны зніжэння ўвагі слухачоў, эфектыўнасць ужытых прыёмаў кантакту з аўдыторыяй.

Вопытныя лектары (дакладчыкі) вылучаюць наступныя недахопы вуснага навуковага маўлення:

- ужыванне слова ў неўласцівым яму значэнні: *адыгрываць значэнне, мець ролю, вялікая колькасць, многа;*
- неадрозненне адценняў сінонімаў: *знакаміты, вядомы, вялікі, выдатны, аўтарытэтны, прызнаны, адбівацца, адлюстроўвацца* і г.д.;
- парушэнне лексічнай ці граматычнай паяднанасці: *размова вядзецца (ідзе)* і г.д.;
- змешванне паронімаў: *тэма – тэматыка, праблема – праблематыка, дыялектны – дыялектычны, эфектны – эфектыўны* і г.д.;
- таўталогія (празмернасць): *уносіць унёсак, мая аўтабіяграфія, узаемна адзін аднаму* і інш.;
- выкарыстанне неабавязковых слоў: *ну, вось, значыць, як бы, так сказаць* і інш.;
- ужыванне штампаў, шаблонаў, канцылярызмаў: *на сённяшні дзень, у выніку розных абставін, у дадзеным выпадку* і інш.;
- выкарыстанне слоў іншай стылістычнай афарбоўкі, жарганізамаў, дыялектаў або прастамоўных слоў *(зробе, носе);*
- няправільны парадак слоў, непатрэбная шматслоўнасць;
- злоўжыванне замежнай тэрміналогіяй і паняццямі, якія ўскладняюць успрыманне зместу і сэнсу;
- выкарыстанне складаных сказаў, колькасць слоў у якіх перавышае 14–15: такія фразы цяжка ўспрымаюцца і страчваецца іх сэнс.

Фанетычна-маўленчыя недахопы дакладчыка – невыразная дыкцыя, «глытанне» канчаткаў, манатоннасць інтанацыі, адсутнасць лагічных націскаў на важнейшых момантах даклада, хуткі або вельмі павольны тэмп маўлення, парушэнне норм вымаўлення.

Навукоўцу важна не толькі выступаць з дакладамі, але і слухаць выступленні іншых калег. Пры гэтым варта звяртаць увагу на змены інтанацыі, тэмпу, голаса, за паўзамі, якія заўсёды папярэднічаюць высновам, за ўжываннем іншымі дакладчыкамі рытарычных і праблемных пытанняў. Неабходна ўмець слухаць, усведамляць і ацэньваць пачутае, вылучаць асноўнае і асабліва каштоўнае ў дакладах іншых, важнае для сябе – занатоўваць.

## 16. Камунікатыўная культура дакладчыка

Старажытны філосаф Цыцэрон сцвярджаў, што аратар павінен валодаць тонкасцямі дыялектыкі, думкай філосафа, мовай паэта, памяццю юрыста, голасам трагіка, жэстамі і грацыяй вялікіх актораў. Сучасныя даследчыкі рыторыкі і аратарскага майстэрства вылучаюць такія патрабаванні да дакладчыка: навізна, арыгінальнасць, сістэмнасць, сцісласць, паўната выкладу, здольнасць выклікаць давер у слухачоў, захопленасць наву-

ковай ідэяй. Майстэрства дакладчыка – гэта вялікая праца над удасканаленнем аратарскіх уменняў і навыкаў. Кожны вучоны павінен мець прафесійную *моўную асобаснасць*, гэта значыць, валодаць здольнасцямі да стварэння лагізаваных, глыбокіх тэкстаў, іх дасканалага прамаўлення.

*Важнейшыя складнікі моўнай асобаснасці* – каштоўнасны (сістэма каштоўнасцей асобы), светапоглядны (сістэма поглядаў на жыццё і яго сэнс), культуралагічны (узровень засваення асобай культуры), пазнавальны (узровень індывідуальнага валодання лексіка-фразеалагічным патэнцыялам, граматычнымі формамі і канструкцыямі, стылістычнай разнастайнасцю мовы), узровень паводзін у тыповых сітуацыях зносін, моўнае майстэрства, моўнае чуццё, інтэлектуальныя здольнасці.

«Дар слова» або моўная інтуіцыя (чуццё) – індывідуальна выпрацаваная сістэма падсвядомых ацэнак, што грунтуецца на літаратурных нормах і моўных ідэалах. Часта гавораць аб прыроджанай здольнасці да засваення мовы, літаратуры ці матэматыкі, але часцей за ўсё моўнае майстэрства настойліва выпрацоўваецца гадамі. Часам гавораць аб моўным гусце чалавека, яго здольнасці ўтвараць і ўжываць у сваім маўленні трапныя вобразныя параўнанні, устанаўліваць гарманічныя сэнсавыя сувязі паміж сказамі, іншымі структурнымі часткамі выказвання.

У апошні час філолагі ўжываюць паняцце *камунікатыўная кампетэнцыя асобы,* пад якім разумеецца сфарміраваная сістэма прафесійных ведаў, камунікатыўных уменняў і навыкаў, каштоўнасных арыентацый, агульнай гуманітанай культуры, неабходных для якаснай прафесійнай дзейнасці. *Моўнатэрміналагічная кампетэнцыя* асобы выяўляецца ва ўменні да месца карыстацца тэрміналогіяй спецыяльнасці (філалагічнай, педагагічнай), *прагматычная кампетэнцыя* – выказвацца ў адпаведнасці з камунікатыўнымі намерамі і сітуацыямі, *інфармацыйная* – самастойна шукаць неабходную інфармацыю, у тым ліку электронную, захоўваць, перадаваць, аналізаваць яе.

*Важнымі камунікатыўнымі кампанентамі маўлення даследчыка* з’яўляюцца: глыбокае асэнсаванне тэмы, галоўнай думкі выступлення; дакладнасць выбару слоў, якія найбольш адпавядаюць выказванню зместу; паслядоўнасць, лагічнасць выказвання; правільнасць ужытых моўных формаў, сціслацць выкладу думак, доказнасць; карэктнасць ужывання тэрмінаў, адпаведных камунікатыўнай сітуацый спосабаў выказвання; правільнае літаратурна-нарматыўнае вымаўленне з адсутнасцю пазалітаратурных элементаў (канцылярызмаў, штампаў, вульгарызмаў); уменне звяртаць увагу слухача формаю і лагічнасцю выкладу, эмацыйнасцю прамаўлення з улікам матываў, патрэб схільнасцей, інтарэсаў, сацыякультурнага ўзроўню слухацкай аўдыторыі.

*Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі асобы залежыць* ад матывavанасці чалавека, яго здольнасці настойліва вучыцца, злучаць набытыя веды з вопытам, з жаданнем і ўменнямі карыстацца рознымі лексікаграфічнымі, энцыклапедычнымі выданнямі, з набыццём навыкаў самастойнай навукова-даследчыцкай працы, з усведамленнем унутранай патрэбы звяртацца да спецыяльнай навукова-пазнавальнай літаратуры. Гэтыя ўмовы забяспечаць высокі ўзровень прафесійнай філалагічнай падрыхтоўкі, паглыбляць цікавасць і павагу да роднай мовы, роднай літаратуры, іх гісторыі і будучыні.

У сувязі з пашырэннем герменеўтычнай інтэрпрэтацыі свету і дамінуючага ўплыву антрапацэнтрычнай парадыгмы ў гуманітарных навуках узнікла вострая неабходнасць у філалагічным прачытанні літаратурных тэкстаў. Гэта вымагае разглядаць мову навукі і навуковага стылю як важнейшага спосабу камунікацыі. Пісьмовае і вуснае маўленне філолага павінна быць узорам навуковай і прафесійнай культуры. На асобу і яе культурны свет заўсёды ўплываюць грамадска-сацыяльныя ўмовы, асаблівасці пэўнай мясцовасці, дзе жыве чалавек, асаблівасці нацыянальнай культуры. Асоба, якая клапоціцца аб сваім развіцці, шукае новыя эфектыўныя індывідуальныя спосабы моўнай выразнасці. Індывідуальнасць навукоўца выяўляе не толькі яго стыль, псіхалагічныя рысы, але і асаблівасці грамадскай, нацыянальнай, этычнай свядомасці краіны, дзе ён жыве.

## 17. Спосабы і культура апрабацыі вынікаў даследавання (канферэнцыя, дыскусія, навуковая спрэчка, дыспут, палеміка, выступленне)

Для маладога даследчыка вельмі важна ўмець паспяхова прэзентаваць сваю навуковую працу на навуковым форуме – канферэнцыі, семінары ці пасяджэнні спецыялізаванай вучонай рады. На навуковых форумах дэманструюць, раскрываюць сутнасць сваіх навуковых навінак і адкрыццяў. Эфектыўнай формай высвятлення вынікаў навуковай працы (рэферату, курсавой, дыпломнай ці магістарскай) з’яўлююцца навуковыя канферэнцыі. Яны даюць магчымасць выявіць перспектыўную для навуковай працы моладзь, спрагназаваць рэалізацыю яе творчых здольнасцей, стымуляваць патрэбу ў маладых людзей у творчым авалоданні ведамі. На навуковыя канферэнцыі збіраюцца прадстаўнікі навуковых, адукацыйных арганізацый з мэтай абмеркавання і вырашэння пэўных навуковых праблем і пытанняў. Канферэнцыі з’яўляюцца дзейсным сродкам актывізацыі навучальна-пазнавальнай, навукова-даследчай дзейнасці, рэалізацыі набытых здольнасцей, публічнага абмеркавання навукова-даследчых вынікаў, абмену вопытам, выяўлення лепшых навуковых прац.

На канферэнцыю (вучнёўскую, раённую, гарадскую, студэнцкую, рэспубліканскую, міжнародную і г.д.), як правіла, пасля абмеркавання на пасяджэннях навуковых гурткоў і па рэкамендацыі навуковага кіраўніка прапануюцца лепшыя, паводле раскрыцця тэмы даследавання, працы.

Для правядзення канферэнцыі ствараецца аргкамітэт, які вызначае праблемнае (тэматычнае) поле канферэнцыі і складае папярэдні інфармацыйна-тэматычны план (ліст) канферэнцыі, што рассылаецца магчымым удзельнікам з прапановай падаць заяўкі на ўдзел у канферэнцыі ў вызначанай форме (звесткі пра ўдзельніка, тэма яго даклада ці выступлення).

На падставе атрыманых заявак складаецца праграма канферэнцыі, дзе ўказваецца час і месца яе правядзення, спіс удзельнікаў і тэмы іх выступленняў, а таксама падзел удзельнікаў па секцыях. Ход канферэнцыі прадугледжвае дакладны парадак працы. На пленарным пасяджэнні выступаюць найбольш вядомыя і аўтарытэтныя па праблематыцы канферэнцыі даследчыкі. Кіраўнік пленарнага пасяджэння адкрывае канферэнцыю, аб'яўляе агульны парадак працы, устанаўлівае рэгламент.

У час пасяджэнняў навуковы этыкет патрабуе звяртацца да ўдзельнікаў па імені і па бацьку, а таксама па прозвішчу з выкарыстаннем слоў, што вызначаюць статус удзельніка ці яго пасаду. Напрыклад, *Слова для даклада даецца прафесару Сяргею Валер'евічу Кавалёву*. Зваротам *калега* пажадана карыстацца навукоўцам аднаго статуса.

У межах канферэнцыі праводзяцца таксама круглыя сталы, прэс-канферэнцыі, дыскусіі, майстар-класы.

Па выніках працы канферэнцыі абмяркоўваецца праект рашэння канферэнцыі, у якім звяртаецца ўвага на найбольш актуальныя навуковыя праблемы і перспектывы іх вырашэння ў будучым. Сёння традыцыйныя канферэнцыі дапаўняюцца тэлеканферэнцыямі, якія пры дапамозе электроннай пошты, відэа- і аўдыякамунікацый даюць магчымасць арганізаваць інтэрактыўны дыялог і палілог з фізічна аддаленымі ў розных гарадах і нават розных краінах калегамі.

На канферэнцыях, пад час навуковых дыялогаў і дыскусій выпрацоўваюцца самастойнасць, арыгінальнасць і дакладнасць выказвання ўдзельнікаў, уменне весці аргументаваную палеміку. Удзел студэнтаў, магістрантаў і нават вучняў старэйшых класаў у навуковых канферэнцыях – важны шлях набыцця маладым вучоным прафесійнай дасведчанасці, навуковай культуры.

*Навуковы дыялог* – тып навуковага маўлення, у ходзе якога адбываецца абмен рэплікамі, выказваннямі між вучонымі, удзельнікамі размовы (дыскусіі, спрэчкі), вынікам чаго з'яўляюцца новыя веды па прадмеце абмена думкамі. Каб адбыўся дыялог, неабходная наяўнасць прамоўцы і яго актыўнага слухача, у якога ўзніклі пытанні. Прыкметы такога дыялогу – сітуатыўнасць (узнікае незапланавана, па сітуацыі), перавага апавядальных

і пытальных сказаў, сказаў-пярэчанняў. Згоду з думкаю суразмоўцы выказваюць такімі моўнымі спосабамі*: згодзен з Вамі, што…; падтрымліваю Вашу думку адносна…;* нязгоду – *дазвольце з Вамі не пагадзіцца…; цяжка пагадзіцца з тым, што…*

З мэтай атрымання ад субяседніка інфармацыі па пэўным пытанні варта ўжываць такія канструкцыі: *як Вы лічыце; ці згодны Вы з тым, што…; ці падзяляеце Вы думку пра тое, што…* Для ўдакладнення або дапаўнення патрэбнай інфармацыі карыстаюцца такімі выразамі: *што Вы мелі на ўвазе; удакладніце, калі ласка; прашу прывесці прыклад…*

У час навуковых форумаў часта разгортваюцца *навуковыя дыскусіі*, у ходзе якіх публічна абгаворваюцца пэўныя праблемы або асобныя пытанні з мэтай высвятлення ісціны. Характэрная прыкмета дыскусіі – наяўнасць адзінай тэмы, яе задача – дасягенне агульнага разумення гэтай тэмы ці праблемы.

Навуковыя дыскусіі і дыялогі паходзяць ад філосафаў старажытнасці – Сакрата, Платона, Арыстоцеля. У мінулыя стагоддзі адукаваныя людзі павінны былі валодаць прыёмамі рыторыкі. Арганізатарам дыскусіі выступаў лектар, які агучваў тэзіс. Кожны з удзельнікаў дыскусіі павінен быў аргументавана падтрымаць гэты тэзіс або доказна запярэчыць.

Сучасныя вучоныя мяркуюць: калі патрэбна пераканаць слухача або чытача ў праўдзівасці выказанай думкі, неабходна, каб слова было зразумелым, тэма – пераканаўча абгрунтаванай, маўленне – багатым, правільным і прыемным. Той, хто хоча быць жаданым суразмоўнікам, павінен многа ведаць, асабліва гісторыю, літаратуру, філасофію, эстэтыку.

## Этапы падрыхтоўкі дыскусіі

1. Вызначэнне тэмы дыскусіі і яе межаў: асэнсаванне праблемнага кола, пытанняў, якія будуць узняты; пры неабходнасці варта звяртацца да энцыклапедый і іншай даведачна-інфармацыйнай літаратуры.
2. Высвятленне асноўных структурных кампанентаў дыскусіі і іх ролі ў абмеркаванні вызначанай тэмы:
   - пачатак, устанаўленне кантакту з суразмоўцамі; вызначэнне мэты, праблем і актуальнасці дыскусіі; актывізацыя ўвагі ўдзельнікаў;
   - інфармаванне: выклад інфармацыі ў выглядзе паведамлення, тлумачэння, апісання ці характарыстыкі;
   - уласна дыскусія: аргументацыя, гэта значыць карэктнае выказванне доказаў у абарону сфармуляваных тэзаў і контраргументацыя – сістэма доказаў, пярэчанняў суразмоўніку;
   - прыняцце рашэння;

– падвядзенне вынікаў.

3. Высвятленне крыніц інфармацыі па тэме дыскусіі і знаёмства з імі.

4. Параўнанне розных падыходаў, разгортаванне ўласнага погляду на праблему або далучэнне да пэўнай пазіцыі дыспутантаў.

5. Праектавання свайго ўдзелу у дыскусіі: прагназаванне верагодных пярэчанняў і заўваг, магчымых контраргументаў і ўласнай формы рэакцыі на іх з мэтай пераканання; выбар канкрэтных прыёмаў утрымання ўвагі суразмоўнікаў.

6. Вызначэння мажлівых варыянтаў завяршэння дыскусіі, выбар найбольш мэтазгоднага.

7. Аналіз сваёй дзейнасці пад час дыскусіі.

Рыхтуючыся да навуковай дыскусіі, неабходна звярнуць увагу на *выпрацоўку пэўных уменняў:* паведамляць пра што-небудзь, апісваць, даваць каментар з’явам, фактам і падзеям, успрымаць аргументы суразмоўніка. Важныя ўменні задаваць пытанні, супастаўляць і параўноўваць факты, ацэньваць падзеі, рабіць высновы; далучацца да выказаных поглядаў; прыпыняць размову ці мяняць яе накірунак; выказваць згоду ці нязгоду; адмаўляцца ў прабачальнай форме; устанаўліваць кантакт з суразмоўнікам, падтрымліваць яго ўвагу; карэктна выказваць незадавальненне. Варта прыслухацца да парад англійскага філосафа-лінгвіста П. Грайса, якія можна сфармуляваць *як прынцыпы:*

1) колькасці: не кажы больш ці менш, чым патрэбна для дасягнення бягучых мэтаў дыялогу;

2) якасці: не кажы таго, у чым не ўпэўнены або для доказу чага не маеш дастатковых падстаў;

3) адносннасці: не адхіляйся ад тэмы;

4) спосабу: выказвайся ясна і зразумела, пазбягай незразумелых выразаў, неадназначных слоў і тэрмінаў, будзь лаканічным і арганізаваным.

У навуковай дыскусіі выяўляюцца *камунікатыўныя стратэгіі ўдзельнікаў,* гэта значыць, спосабы маўлення, якія выкарыстоўваюць удзельнікі дыскусіі, каб данесці свае думкі да слухачоў самым зразумелым і эканомным спосабам. Пад ступенню валодання камунікатыўнымі стратэгіямі разумеюць падрыхтаванасць ці непадрыхтаванасць удзельнікаў дыскусіі да абмеркавання ўзнятай праблемы, вольнае аперыраванне паняційным і тэрміналагічным апаратам у межах тэмы, наяўнасць аргументаў і контраргументаў. Пры гэтым важна *валодаць стратэгіямі самапрэзентацыі* – уменне трымаць увагу партнёра, імкненне падаць сябе найпрывабней. Дыскусія з’яўляецца навуковай спрэчкай, да якой загадзя рыхтуецца навуковы матэрыял. Правядзенне дыскусіі павінна вызначацца высокай культурай, нязмушанасцю, што патрабуе ад апанентаў высокага ўзроўню падрыхтаванасці і кампетэнтнасці па прадмеце спрэчкі. *Навуковая спрэчка* –

гэта славесны абмен аргументамі паміж двума або некалькімі навукоўцамі, кожны з якіх мае свой погляд і даводзіць сваю думку на пэўнае навуковае пытанне. Прадметам спрэчкі могуць быць пераканні, палажэнні, якія абмяркоўваюцца праз абмен думкамі ўдзельнікаў.

Па колькасці ўдзельнікаў вылучаюць спрэчкі-маналогі (калі чалавек спрачаецца сам з сабой), спрэчкі-дыялогі (калі спрачаюцца дзве асобы), спрэчкі-палілогі (спрэчка паміж некалькімі ці многімі ўдзельнікамі). У залежнасці ад мэты расійскі філолаг Л. Увядзенская адрознівае:

1) спрэчку для пошуку ісціны (яна прыносіць задавальненне ўдзельнікам, пашырае веды аб прадмеце спрэчкі, узмацняе веру ва ўласныя інтэлектуальныя сілы);

2) спрэчку для пераканання (з мэтай пераканаць апанента ў нечым, схіліць на свой бок);

3) спрэчка для перамогі (для самасцвярджэння ўдзельніка);

4) спрэчка дзеля спрэчкі (для задавальнення амбіцый аднаго з удзельнікаў).

Поспех спрэчкі і яе прадуктыўнасць залежаць ад узроўню культуры, эрудыцыі, жыццёвага вопыту ўдзельнікаў і валодання правіламі публічнай спрэчкі (дакладна вызначаць сваю пазіцыю, не адыходзіць ад галоўных палажэнняў, з павагай ставіцца да апанентаў, мець вытрымку).

У ходзе спрэчкі карыстаюцца рознымі сінтаксічнымі канструкцыямі, якія перадаюць сумненне ў правільнасці меркаванняў суразмоўнікаў: *Ваша палажэнне пра...падаецца мне крыху сумніўным; Гэтыя аргументы не зусім пераканаўчыя, падмацуйце гэты тэзіс, калі ласка, фактычнымі прыкладамі;* спрашчэнне аргументаў апанента: *Уявім, што Вы атрымалі пазітыўны вынік, але як тады растлумачыць тое, што...; Гэтыя ідэі, на жаль, не знайшлі падмацавання...*

*Дыспут* – гэта загадзя падрыхтаваная публічная спрэчка. Яго мэта – высветліць і супаставіць розныя погляды і дасягнуць пэўнай ступені згоды або агульнага рашэння паміж удзельнікамі адносна пэўнай тэмы. Гэтую тэму фармулююць раней, спосабы і прыёмы дыспута павінны быць карэктнымі.

Важным спосабам як пераканання, так і фармулёўкі новых поглядаў лічыцца таксама *палеміка*. Гэта – тып дыскусіі, у якой сцвярджаюцца пэўныя ідэі і каштоўнасці з выкарыстаннем карэктных прыёмаў. Мэта палемікі – сцвердзіць уласную думку шляхам спрашчэння думкі апанента, канкурэнта. У палеміцы па сітуацыі дапускаецца экспрэсіўнасць, не дапушчальныя грубасць і абразлівасць.

Усе жанры навуковай камунікацыі патрабуюць добрага валодання словам. Асноўнае ў навуковай дыскусіі – абмеркаванне праблемы спецыялістамі. Выступленні ўдзельнікаў часта можна кваліфікаваць як выступленні-пытанні і выступленні-водгукі. *Выступленне-пытанне* з’яўляецца раз-

горнутым меркаваннем палемічнага характару, што змяшчае адно або некалькі пытанняў Пры гэтым варта карыстацца такімі сінтаксічнымі канструкцыямі: *як даўно Вы займаецеся гэтым пытаннем; што Вы маеце на ўвазе, калі гаворыце…; чым Вы можаце абгрунтаваць Вашу пазіцыю аб…; якой методыкай (метадамі, матэрыялам) Вы карысталіся* і нек. інш.

У выступленні-водгуку выказваецца аўтарская пазіцыя па праблеме, якая абмяркоўваецца ўдзельнікамі дыскусіі. У такім выпадку можна ўжываць канструкцыі тыпу: *несумненна, выступоўца пераканаўча выклаў сутнасць праблемы; цікава і карысна было пачуць аб…; хачу заўважыць, што…; важна, што і практыка падмацоўвае меркаванне аб…* і інш.

Навуковец павінен умець карэктна выказаць крытыку, этычна афарміць негатыўную ацэнку, якую, паводле навуковага этыкету, неабходна выказаць мякка і зычліва ў форме парад на будучую працу. Талерантнасць навуковай дыскусіі патрабуе паважлівага стаўлення да думак апанентаў, калег, крытычнага падыходу і да ўласных навуковых вынікаў. Кожны навуковец павінен удасканальваць уменне пераканаўча і карэктна выкладаць свае думкі, дыскутаваць, карыстаючыся рознымі спосабамі аргументацыі і абавязкова прытрымлівацца культуры зносін.

# МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Практычныя заданні

### 1. Навуковая культура і прафесійная дзейнасць даследчыка

*1. Растлумачце, якая ідэя аб'ядноўвае выказванні пра навуку, вучоных і грамадскіх дзеячаў:*

«Мы фінансуем навуку не таму, што багатыя, а мы багатыя таму, што фінансуем навуку» (Р. Рэйган).

«Навука, як і ўсе віды творчай дзейнасці, працэс не толькі лагічны, але і эмацыйны. Для навукі, акрамя таленту, уласціва натхненне і азарэнне» (В. Фролькіс).

«Навука сама стварае сабе мову, без якой яна не можа развівацца. Змест навукі і яе мова не могуць існаваць адно без аднаго, мова арганічна ўключаецца ў галоўныя спосабы перадачы інфармацыі» (Я. Смародзінскі).

*2. Пракаменціруйце выслоўі:*

«Вучыцца прыгожай, спакойнай, інтэлігентнай мове трэба доўга і ўважліва – прыслухоўваючыся, затым запамінаючы, заўважаючы, чытаючы і вывучаючы» (Дз. Ліхачоў).

«Разумовая праца ці не найважнейшая для чалавека. Марыць – лёгка і прыемна, а думаць цяжка» (К. Ушынскі).

«Усе людскія ўменні – не што іншае, як сумесь цярпення і часу» (А. дэ Бальзак).

*3. Прадоўжыце меркаванне:*

А) Страх беларускага вучонага перад беларускаю мовай параджаецца не толькі боязню не прытрымлівацца нормаў, але і няўменнем або нежаданнем засвоіць яе, каб перакадзіраваць навейшыя навуковыя інфармацыйныя патокі, што плывуць да нас не ў роднамоўным адзенні. Мысленне моўнымі клішэ, адсутнасць адпору чужамоўным словам, брак намаганняў для пошуку адпаведных беларускіх спосабаў выражэння навуковай думкі зніжае навуковы патэнцыял беларускага вучонага, робіць яго паддатлівым да навуковых схем і ідэй, навязаных звонку. …

Б) «Людское жыццё ўвасоблена ў дыялогу. Жыць – азначае браць удзел у дыялогу: запытваць, пагаджацца, разумець, адказваць. У гэтым

дыялогу асоба бярэ ўдзел усё жыццё, укладаючы ўсяго сябе ў слова, і гэтае слова ўваходзіць у дыялагічную тканіну людскога жыцця» (М. Бахцін).

*4. Прачытайце меркаванне. Што варта прыняць да ўвагі, шліфуючы мову і стыль навуковай працы? Абгрунтуйце сваю думку.*

Як можна дамагчыся паляпшэння стылю выкладу навуковага матэрыялу дысертацыі?.. Сакрэт паляпшэння стылю дысертантам заключаецца ў тым, каб уважліва чытаць мастацкія кнігі і вывучаць іх… Дазвольце сабе вывучыць Купалу, Коласа, Караткевіча, Брыля, Сіпакова. Піце з гэтых крыніц… Калі будзеце прытрымлівацца гэтых парад, то паступова, непрыкметна, але няўхільна ваша манера маўлення і выклад думак на паперы стануць прыгажэйшымі, вытанчанымі і стылістычна граматнымі…

*5. Прачытайце тэкст. Вызначце стыль маўлення, асноўную думку. Якія каштоўнасці важныя для аўтара? Ці пагаджаецеся вы з такім бачаннем? Знайдзіце словы, што ўжыты ў пераносным значэнні. Растлумачце словы, напісаныя ў двухкоссі.*

Чалавек вырастае ў асяроддзі роднай мовы, «зрастаецца» з ёю: уменне гаварыць на роднай мове становіцца для чалавека такой жа натуральнай з’явай, як уменне дыхаць, хадзіць, есці. Чалавек становіцца носьбітам мовы. І хоць ад адной асобы лёс мовы не дужа залежыць, аднак мова датуль застаецца жывою, пакуль існуе супольнасць носьбітаў, якія вывучаюць яе і карыстаюцца ёю як роднай.

Таму родная мова з’яўляецца асновай існавання супольнасці, гэта ланцуг, які паядноўвае цяперашнія пакаленні з мінулымі і будучымі, яднае людзей у прасторы. У жывой мове працэс «светастварэння», «амаўлення» свету не прыпыняецца: кожнае пакаленне робіць у яго свой унёсак, пакідае ў ім сляды свайго існавання на свеце. Паколькі моўным навучаннем і выхаваннем дзіцяці ў ранні узросце займаецца маці, то ў многіх моўных супольнасцях замацаваўся адпаведны тэрмін. Напрыклад, немцы ўжываюць выраз «Muttersprache». Як паэтычную назву ўжываюць выраз «материнська мова» ўкраінцы (Я. Радзевіч-Вінніцкі). Якія адпаведныя паэтычныя выразы ёсць у беларусаў?

*6. Перакадзіцеі тэкст з рускай мовы. Параўнайце моўныя клішэ ў рускім і беларускім тэкстах. Паразважайце, абапіраючыся на тэкст, якімі якасцямі павінен валодаць навуковец.*

«Истинный ученый – это действительно и поэт, творец. Поэт – так как исследователь, как и он, ищет мысли, образы, специально или невольно изучает события, психологию, природу. Быть ученым – образ жизни, работа без времени. Вдохновение – это и есть «внутренний огонь». Что его паддерживает – загадка. У одного есть, у другого – нет и не будет. Такой человек, даже далеко не обделенный способностями, живет, не стремясь отдавать всего себя труду. Вдохновение рождает идеи, отсутствие его ведет к неверию в науку, пессимистическому отношению к творчеству. Справедливо – «нет ничего хуже молодого пессимиста». Если молодой человек скептически относится к исследовательской деятельности, то лушче всего ему сразу же искать другое приложение своим силам. Стремление держаться в кругу своих знаний, консерватизм мышления, стойкая приверженность к догмам не способствуют свободе мысли, а, напротив, препятствуют творчеству. Неверие в незыблимость истин, постоянное обдумывание предмета исследования, поиск путей воплощения какой-то идеи и приводят к открытию. Открытию малому или большому. Генезис их однотипен, хотя пути и результаты могут быть разными (Д. Зебрино).

*7. Прачытайце ўрывак з навуковага артыкула В. Старычонка. Прааналізуйце лексічныя і граматычныя спосабы, выкарыстаныя аўтарам, ахарактарызуйце навуковае маўленне даследчыка.*

Паэзія народнага паэта Беларусі Максіма Танка сагрэта дабрынёй і даверам да чалавека. Яна выхоўвае ў чытачоў душэўную прыгажосць, высокую інтэлектуальнасць, заклікае да філасофскіх роздумаў аб жыцці, аб чалавецтве. У ягонай творчасці, якую можна смела разглядаць як люстэрка жыцця беларускага народа другой паловы XX стагоддзя, люстэрка нашай рэальнасці, арганічна спалучыліся вечныя і агульначалавечыя тэмы радзімы, роднага краю, беларускага народа, яго гісторыі і мовы, тэмы мастака і мастацтва, паэта і паэзіі, дабра і зла, любові і нянавісці, ісціны, веры, сумлення, дабра…

Максім Танк імкнуўся як рэалістычна апісаць пэўныя факты і з’явы, перадаць змест пэўных падзей, так і выбраць такія словы і формы, якія б дапамаглі чытачу не толькі «паглынуць» гэты змест, але і ўбачыць глыбінны падтэкст, адчуць яго разгалінаваную асацыятыўнасць, умоўную вобразнасць. Невыпадкова паэт шырока выкарыстоўвае як традыцыйныя, так і новыя формы і жанры (паэмы, вершы, балады, легенды, санеты, оды, прытчы, трыялеты, верлібры, дыялогі, вершы-мініяцюры, алюзіі і інш.).

Адной з адметных рыс творчай манеры Максіма Танка, ягонага стылю з’яўляецца ўмелае выкарыстанне вобразна-выяўленчых сродкаў, якія выступаюць у якасці спецыфічнага сродку рэалізацыі чалавекам яго пазна-

вальных адносін да акаляючага свету і разумення свайго месца ў неабмежаванай у часе і працягласці прасторы.

Максім Танк яскрава абыгрывае сэнсавыя магчымасці кожнага слова, закладзены ў ім вобразны патэнцыял. Таму ў яго творах часта гучаць шматлікія фальклорныя выразы і азначэнні, традыцыйныя і нетрадыцыйныя асацыятыўныя спалучэнні тыпу *залатое юнацтва, шэрая восень, сварлівае лета, панурая ноч, маўклівы камень, палыновы сум, гуллівая рэчка, плакучыя бярозы, крыштальныя вочы, непакорныя кручы* і інш. Паэт можа многа расказаць пра *вандроўніцу-вясну, бярозаньку-сястрыцу, вочы-прамені, зязюльку-варажбітку, вайну-навальніцу, хмары-навалы, віхуры-вятры, агні-журавіны, смыкі-бароны, сляды-каляіны, нівы-разлогі* і інш. Ён здатны гадзінамі весці аповед пра вецер, які можа *шумець, шаптаць, свістаць, галасіць, голасна тужыць, стагнаць, ныць, выць, плакаць, спяваць, а таксама гасіць запалкі, замятаць сляды, расчыняць па-гаспадарску усе дзверы насцеж, біцца птушкай у вокны, іграць на жалейцы, гнаць раннюю зару, цалаваць рукі і твар, хвалявацъ жыта, хістаць прысады…*

Сярод усіх вобразна-выяўленчых сродкаў у паэтычных творах найбольш пашыраныя субстантыўныя метафары (яны выражаюцца назоўнікамі), якія ў многім абумоўлены карцінай свету носьбітаў мовы, той народнай сімволікай і традыцыйнымі жывымі ўяўленнямі аб рэаліях, прыметах і дзеяннях. Метафара выступае ў якасці найбольш прадуктыўнага сродку другаснай апасродкаванай намінацыі, універсальнага спосабу пазнання і канцэптуалізацыі свету. Яе называюць крыніцай і асновай усіх важнейшых феноменаў чалавечай культуры… У паэтычных творах Максіма Танка выкарыстоўваюцца самыя розныя тыпы метафар: вонкавападабенчыя, гукавыя, квантатыўныя, анімістычныя, зоамарфічныя, зоасемічныя, персаніфікаваныя, індывідуальна-аўтарскія і розныя іх камбінацыі («Полымя». 2012. № 8. С. 165–166).

*8. Прачытайце тэкст. Вызначце тэму і асноўную думку. Вызначце стылёвую прыналежнасць, тып і жанр маўлення. Падбярыце загаловак.*

Напэўна, кожнага даследчыка літаратуры нават у дні творчага ўздыму не пакідае пачуццё незадавальнення. Яно тычыцца тых прафесійных загадак, якія важна бывае вырашыць перш за ўсё для самога сябе…

І не тое, каб гэта было непасрэднай рэакцыяй на стан крытыкі або водгукам той незадаволенасці літаратурнай тэорыяй, якую ў свой час, у той ці іншай сувязі, не таячыся выказвалі і Пушкін, і Талстой, і Дастаеўскі, і нашыя нацыянальныя класікі М. Багдановіч, М. Гарэцкі… Аддаючы належнае поспехам навукі ў распрацоўцы самых агульных, як мы сёння сказалі б, сацыялагічных напрамкаў літаратурнага развіцця, гэтыя вялікія

практыкі адзінадушна пагаджаліся з тым, што ў вытлумачэнні самой рэчыўнасці вобразнай матэрыі, у разуменні тэхнікі майстэрства літаратурная тэорыя з-за сваёй зусім відавочнай прыблізнасці мала прыдатная для жывой мастацкай справы.

Заўсёды можна заспакоіць сябе, зручна спаслаўшыся на спецыфіку самае навукі, якая, маўляў, жыве сваімі ўнутранымі законамі і ўплывае на літаратурны працэс па-іншаму, больш апасродкавана, чым гэта жадалася б прадстаўнікам творчага цэху…

Усё гэта выглядае і грунтоўна, і пераканаўча, але цяжка бараніцца ад самога сябе, калі сам не ўпэўнены. Ці схопліваюць дзівосную сутнасць мастацтва, ці пранікаюць у яго зіхатлівыя бездані нашы тэарэтычныя збудаванні. Ці не працякае міма іх жывое рэчышча вобразных з'яў…

Не думайце, і ў «бясстраснага» вучонага таксама жыве недзе на дне душы гэтае трапяткое жаданне, якое так хараша аднойчы выказаў П. Антакольскі ў інтэрв'ю для «Вопросов литературы» (1967. № 12. С. 123):

«Але бываюць, – прызнаваўся ён, – такія ранішнія гадзіны, такое свежае адчуванне навізны ўсяго, што ні ёсць перад вачыма, калі неабходна адкінуць любую прадузятую класіфікацыю. Неабходна ўбачыць усё на свае вочы, у тым ліку і тое мастацтва, якому служыш. Убачыць яго ў першароднай цэласнасці, у будаўнічых рыштаваннях, у друзе, у гліне, як нешта створанае на вачах і толькі таму – жывое».

Уласна, для гэтага далёка не простымі пуцявінамі і ішла літаратурная навука ў распрацоўцы сваіх метадаў, у пошуках новых падыходаў для вывучэння найбольш складаных мастацкіх з'яў (Яскевіч А. У свеце мастацкага твора. Мінск, «Маст. літ.», 1977. С. 3–4).

*9. Прачытайце тэкст. Вызначце разнавіднасць навуковага стылю і яго моўныя асаблівасці.*

**Чым дыпломная праца можа спатрэбіцца пасля ўніверсітэту?**

Ёсць два спосабы зрабіць так, каб дыпломная праца была карысная і пасля абароны. Па-першае, трэба выбраць для дыпломнага даследавання такую тэму, якая можа перайсці ў шырэйшае даследаванне на многа год наперад, пры наяўнасці жадання і здольнасцей. Не толькі навукоўцам, але, напрыклад, і дырэктару турагенства можа спатрэбіцца вопыт працы над дыпломнай. Бо для напісання якога-небудзь дакумента давядзецца:

1) дакладна сфармуляваць тэму;
2) сабраць матэрыял;
3) сістэматызаваць матэрыял;
4) асэнсаваць сабраны матэрыял;

5) надаць матэрыялу адпаведнае стылёвае афармленне, жанр;

6) паклапаціцца, каб чытач, па-першае, зразумеў пра што ідзе гаворка, а па-другое, мог самастойна звярнуцца да згаданых (цытаваных) дакументаў і выказаць меркаванне пра іх.

Гэта значыць, што праца над дыпломным праектам вучыць разважлівасці і сістэмнасці. Выбіраецца метад. Чалавек вучыцца ствараць прыдатны для ўжывання тэкст. Таму важна як тэма працы, так і метадалогія, і вопыт яе стварэння. Карацей кажучы, напісанне дыпломнай працы як трэніроўка памяці (паводле У. Эка).

*10. Выпішыце з навуковых прац літаратуразнаўчага профілю прыклады навуковага апісання, разважання, меркавання. Вызначце ў іх ключавыя паняцці, словы, тэрміны.*

*11. З дапамогай слоўнікаў вызначце значэнне тэрмінаў, складзіце з імі выказванні.*

Гіпотэза, метад, метадалогія, кампетэнцыя, дыпломнік, магістр, аспірант, канцэпт, канатацыя, лакуна, таўталогія; дэтэрмінаваны, кампаратыўны, эквівалент, скандэнсаваны, рафініраваны, сімптом, прэрагатыва, дамінаваць, акумуляваць, адэкватны, індыфірэнтны, радыкальны, прэвінтыўны.

*12. Выкажыце ўласнае меркаванне адносна запазычанняў, улічваючы думкі навукоўцаў.*

Носьбіты моваў з моцнымі сацыялінгвістычнымі пазіцыямі ўвогуле талерантна ставяцца нават да значных запазычанняў. Зусім інакш да іх павінен ставіцца той народ, чыю мову пагражае паглынуць іншая, мацнейшая мова. Слабейшая мова не мае права на лексічнае змешванне, бо гэта можа стаць пачаткам яе канца, бо ў такім выпадку яна можа быць асуджана на паступовае выцісканне і ўрэшце на поўнае выміранне.

На жаль, мы з’яўляемся сведкамі бяздумнага і масавага ўжывання іншамоўных (пераважна англійскіх) тэрмінаў нават у тых выпадках, калі для іх было б зусім лёгка знайсці простыя і дакладныя айчынныя адпаведнікі. З погляду іншаземцаў гэта можа разглядацца як фактычнае прызнанне меншай вартасці, неразвітасці нацыянальнай мовы. Прыкра, што філалагічная навуковая грамадскасць (і, звычайна, не толькі яна) вельмі слаба супрацьдзейнічае гэтай ганебнай з’яве.

*13. Вызначце агульны сэнс тэксту, вылучыце яго сэнсавыя часткі, ключавыя словы, тэрміны.*

Настаўніку школы, каледжа, гімназіі, выкладчыку вышэйшай навучальнай установы, незалежна ад яго пасады ці навуковага звання, увесь час даводзіцца мець справу са стварэннем уласных тэкстаў. Гэта таксама чытанне, асэнсаванне і ацэнка значнай колькасці тэкстаў сваіх вучняў, калег, аспірантаў, магістрантаў, студэнтаў. Гэта перадусім навуковыя артыкулы, лекцыі, вучэбна-метадычныя комплексы, вучэбныя дапаможнікі і падручнікі. Сюды ж адносяцца розныя кваліфікацыйныя работы студэнтаў, дысертацыі магістрантаў, аспірантаў, а таксама дактарантаў. Такія тэксты маюць рознае мэтавае прызначэнне, розную знакавую прыроду і характар інфармацыі, а таксама і сваю спецыфіку структурнай і зместавай пабудовы. Ведаючы гэту спецыфіку, можна лёгка засвоіць разнастайнасць прыёмаў стварэння тэкстаў у канкрэтыцы разнастайнасці іхніх тыпалагічных прыкмет. Сыходзячы з характару інфармацыі, яе мэтавага прызначэння і чытацкай ці слухацкай аўдыторыі, разгледзім асаблівасці стварэння для публічнага выступлення ці публікацыі тэкстаў наступных відаў: навуковыя, навукова-папулярныя, даведачныя, навучальныя.

*14. Адрэдагуйце навуковы тэкст.*

Тэмп генерацыі ведаў стаў настолькі высокім, што выпускнік вышэйшай навучальнай установы толькі тады зможа творча падыйсці да распрацоўкі сучасных навуковых канцэпцый, калі непасрэдна бярэ ўдзел у іх распрацоўцы. Прынцып спалучэння навуковай працы з навучаннем стаў дзейсным фактарам падрыхтоўкі і фарміравання спецыяліста. Удзел студэнтаў у навуковай працы, увядзенне даследчыцкіх элементаў у розныя формы навучальных заняткаў з'яўляецца эфектыўным спосабам пераадолення вядомай супярэчнасці паміж масавым характарам падрыхтоўкі ў ВНУ і патрэбамі развіцця ў кожнага студэнта самастойнасці і ініцыятывы.

Развіццё ў студэнтаў гэтых многа ў чым не традыцыйных і складаных уменняў і навыкаў вымагае карэкціроўкі сістэмы падрыхтоўкі будучых спецыялістаў, што павінна датычыцца ўсіх бакоў навучальна-выхаваўчага працэсу.

## 2. Метадалогія і культура стварэння навуковага тэксту

*1. Прачытайце парады італьянскага навукоўца У. Эка адносна чытання першакрыніц. Складзіце кароткае паведамленне пра тое, як вы чытаеце навуковыя працы.*

Падкрэсліванні ўзбагачаюць кнігу. Яны з'яўляюцца знакамі вашай зацікаўленасці, даюць магчымасць вярнуцца да кнігі нават праз працяглы

час і хутка адшукаць тое месца, што вас зацікавіла. Але падкрэсліваць патрэбна разумна. Некаторыя падкрэсліваюць усё. Гэта азначае не падкрэсліць нічога.

Карыстайцеся рознымі колерамі, бо бывае, што на адной старонцы суседнічаюць звесткі match рознага парадку. Каляровыя адзнакі стануць прыгоднымі на апошнім этапе работы, калі за чырвоным колерам вы лёгка знойдзеце матэрыял для першага раздзелу даследавання, за зялёным – для другога.

Адзначайце ступень важнасці матэрыялу, інфармацыі. Пазначайце ўсе месцы, да якіх вы маеце намер вярнуцца.

У якіх выпадках не падкрэсліваюць? Калі кніга не ваша. Або калі яна рэдкая, добра ілюстраваная і дарагая. У такіх выпадках, відавочна, выйсце са становішча – ксеракапіраваць адпаведныя старонкі або выпісаць у сшытак найважнейшыя цытаты з адпаведнымі каментарамі.

*2. Складзіце анатацыю да навуковай манаграфіі. Параўнайце сваю анатацыю з прыведзенаю ў кнізе.*

*3. Напішыце рэцэнзію на часопісны артыкул літаратуразнаўчай праблематыкі.*

*4. Прачытайце тэкст. Паразважайце, якія функцыі ён выконвае: анатацыі, рэкламы ці іншыя.*

Ці варта вучыць таго, хто абраў навуковы шлях і ўжо мае пэўныя дасягненні? Папулярнае выслоўе, у розных яго варыяцыях, сцвярджае: вучыць вучонага – псаваць яго. І ўсё ж вучонымі не нараджаюцца! Гэта – ісціна, ці не так? А калі зыходзіць з яе, то і выпускнікі вышэйшых навучальных устаноў, і магістранты, і аспіранты, і дактаранты, і нават тыя, хто ўжо напісаў кандыдацкія і доктарскія дысертацыі, павінны вучыцца. Тым больш, што абсягі навуковай дзейнасці пастаянна ўзрастаюць: ускладняецца інструментарый даследаванняў, неабсяжным становіцца паток навуковай інфармацыі, а без іх засваення немагчыма адолець наступныя ступені ў тэарэтычным асэнсаванні рэчаіснасці. Навуку цяжка спасцігнуць з першага кроку, яе патрэбна ўспрыняць, асэнсаваць,ператварыць у спосаб жыцця, асвоіць не толькі асобную тэхналогію, методыку, але і метадалогію, мастацтва аналізу і творчасці, сістэму інтэлектуальных і прафесійных каштоўнасцей.

Гэты падручнік-энцыклапедыя дапаможа распазнаць таямніцы паспяховай навуковай дзейнасці, пазнаёміць зацікаўленых са складаным светам навукі.

Для сур'ёзнай працы над навуковым даследаваннем неабходна засвоіць нямала звестак: з метадалогіі навуковага пазнання (яны фарміруюць агульную навуковую культуру), у якіх падаюцца патрабаванні да навуковай дзейнасці, асабліва – да дысертацыйных даследаванняў, да навуковага асэнсавання механізмаў творчасці.

Прапанаванае выданне – спроба замяніць кнігі з некалькіх паліц толькі адной кнігаю, якая б зняла покрыў таямнічасці з навукі і навуковай творчасці, даходліва расказала пра навуковую працу, урэшце, проста дала парады аб падрыхтоўцы навуковага даклада ці прэзентацыі навуковага даследавання.

Аўтар кнігі – доктар філасофіі, прафесар, мае вопыт напісання навуковых прац ( у яго 20 манаграфій і падручнікаў) і навуковага кіраўніцтва. У гэтай кнізе ён паяднаў уласныя набыткі з ведамі іншых вучоных, спрабаваў падаць той інструментарый і механізм навуковай творчасці, без якіх не адбудзецца ніводнае даследаванне.

*5. Падбярыце навуковыя крыніцы па тэме даследавання па прадметным і алфавітным каталогах бібліятэкі. Дапоўніце спіс знойдзеных крыніц пры дапамозе электроннага пошуку.*

*6. Прачытайце парады У. Эка аб складанні папярэдняй бібліяграфіі. Як вы ажыццяўляеце першы пошук інфармацыі?*

У першыя дні не намагайцеся ўзяць у рукі ўсе кнігі ў бібліятэцы, а займіцеся папярэдняй бібліяграфіяй. Пераглядаць каталог патрэбна паралельна з праглядам энцыклапедый, слоўнікаў, дапаможнікаў у даведачнай зале. Калі адшукаеце артыкул па вашай тэме з вялікай, падрабязнай бібліяграфіяй, перапішыце сабе бібліяграфію ўсю. Замаўленне ў чытальнай зале мэтазгодна пачынаць з гэтых кніг. Калі вы прагледзелі два-тры даведкавых выданні, параўнаннем бібліяграфій вы зможаце вылучыць назвы кніг, крыніц, на якія спасылаюцца ўсе. Вось вам і першасная іерархія.

*7. Складзіце бібліяграфію да тэмы вашай навуковай працы.*

*8. Прааналізуйце план кандыдацкай дысертацыі.*

**Тэма «Творчая спадчына Ігнацiя Быкоўскага ў кантэксце эпохі еўрапейскага Асветніцтва»**
Уводзіны
Агульная характарыстыка работы
Раздзел 1 Традыцыі еўрапейскага Асветніцтва ў паэзіі І. Быкоўскага

1.1 Эстэтыка і паэтыка класіцызму ў паэтычнай спадчыне пісьменніка
1.2 Асветніцкі сентыменталізм у мастацкім метадзе І. Быкоўскага
Высновы да раздзела 1
Раздзел 2 Асветніцкія матывы ў прозе і драматургіі І. Быкоўскага
2.1 Філасофская накіраванасць празаічных твораў пісьменніка
2.2 Вобраз асветнага грамадзяніна і кодэкс маральных паводзін у п’есах І. Быкоўскага
Высновы да раздзела 2
Раздзел 3 Гісторыка-культурны аспект мемуараў і эпісталярыя І. Быкоўскага
3.1 Адлюстраванне гістарычных падзей і бібліяграфічны рэестр ва ўспамінах пісьменніка
3.2 Стылявыя асаблівасці эпісталярных тэкстаў І. Быкоўскага
Высновы да раздзела 3
ЗАКЛЮЧЭННЕ
БІБЛІЯГРАФІЧНЫ СПІС
ДАДАТАК

*9. Выпішыце з манаграфій і навуковых артыкулаў выказванні (або складзіце самастойна), дзе ўжыты наступныя формулы навуковага маўлення:*

Наяўныя (прыведзеныя) пераканаўчыя доказы; улічана; нягледзячы на аналіз фактаў, вывучэнне асобных пытанняў…; навуковыя высновы вучоных, у якіх высвятляюцца…; адсутнічаюць фундаментальныя даследаванні…; большасць літаратуразнаўцаў пазбягаюць разгляду…; навуковыя пошукі айчынных літаратуразнаўцаў вядуцца па такіх накірунках, як…

*10. Прачытайце ўступ да дыпломнай працы (на выбар). Пракаментуйце яго змест і структуру, дайце ацэнку культуры і навуковасці выкладу.*

*11. Прааналізуйце і ацаніце навуковы артыкул па актуальных праблемах літаратуразнаўства ў кантэксце асноўных патрабаванняў да зместу, пабудовы і моўнага афармлення.*

*12. Вылучыце ключавыя словы ў загалоўках артыкулаў. Якія з іх, на ваш погляд, дакладна адлюстроўваюць праблему даследавання?*

- «Споведзь сэрца, споведзь веку (па старонках дзённікаў, запісных кніжак Пімена Панчанкі)»
- «Творчая індывідуальнасць паэта»

- «Літаратура патрэбна чалавеку заўсёды: Агляд прозы за 2011 год»
- «О родная зямля! Ты – кніга вечнага жыцця!» (метафары ў паэтычным дыскурсе Максіма Танка)
- «Волаты духу нацыі. Да 130-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа»
- «Метафара маладосці як ідэйна-эстэтычны прынцып мадэрнізму і яго актуалізацыя ў творчасці Янкі Купалы»
- «Патрыятычны «неарамантызм» Янкі Купалы ў святле міцкевічаўскай традыцыі і еўрапейскага мадэрнізму»
- «Наватарскія тэндэнцыі ў беларускай літаратуры пачатку XX ст.»
- «Напісанае – застанецца!»

*13. Азнаёмцеся з меркаваннямі адносна цытавання. Ці пагаджаецеся вы з імі? Адказ абгрунтуйце.*

Асноўным аргументам большасці работ сучасных маладых даследчыкаў-філолагаў з'яўляецца цытата. Пра факт зафіксаваных у сучасных навуковых тэкстах вялікай колькасці цытат можна гаварыць «за» і «супраць». З аднаго боку, ужытае ў патрэбным месцы аўтарытэтнае выказванне набывае статус знойдзенага доказу. Высокі індэкс даверу да цытавання тлумачыцца культуралагічным важным фактам **кантынуальнасці** навуковага пазнання, якое па вызначэнні рэмінісцэнтнае, і кожнае асобнае даследаванне – ад тэзісаў да манаграфіі – своеасаблівы «інтэлектуальны сінтэз».

Асабліва небяспечна, калі такі створаны па волі цытуючых аўтарытарызм грунтуецца на малавыразных, хрэстаматыйных, што пераходзяць з работы ў работу, цытатах. Звычка да капіравання чужых думак – найбольшая небяспека для навуковай этыкі і для самой навукі. У творчым плане капіраванне бесперспектыўнае.

*14. Азнаёмцеся з меркаваннямі адносна плагіяту. Выкажыце ўласнае бачанне гэтай праблемы.*

Плагіятам у навуковым асяродку лічаць акрамя спісвання яшчэ і выкарыстанне эксперыментальных дадзеных, аналітычных вынікаў, запазычанні без спасылак тэкстаў ці іх фрагментаў. «Гэта крадзёж чужога розуму» (У. Эка). Гэта – ганебная з'ява.

*15. Прааналізуйце артыкул, змешчаны ў спецыялізаваным часопісе (на выбар) па плане:*

1) тэма, асноўная праблема, галоўная думка;

2) мэта і задачы аўтара;
3) адпаведнасць назвы артыкула асноўнаму зместу;
4) кампазіцыя (структура) артыкула, высновы;
5) моўная культура даследчыка.

*16. Напішыце рэцэнзію на дыпломную працу, ужываючы традыцыйныя навукова-маўленчыя формулы:*

У рэцэнзуемай працы зроблены аналіз…; багаты фактычны матэрыял, прыведзены ў працы аўтара, падмацоўвае (сведчыць)…; увогуле, адзначаючы пазітыўныя аспекты працы, неабходна звярнуць увагу на асобныя памылкі і недакладнасці; у рабоце зроблены агляд…; аўтар сцвярджае, што…; аднак, асноўная думка заключаецца ў тым…; даследчык справядліва адзначае; доказна крытыкуе; спрашчае тэзіс пра тое, што…; неабгрунтавана сцвярджае, што…; вырашае пытанне адносна…; занадта катэгарычна піша; глыбока аналізуе; дакладна вызначае; спрошчана паказвае; дэталёва аналізуе.

*17. Перакладзіце тэкст на беларускую мову. У чым пераконвае аўтар гэтага выказвання?*

Наука – это непрерывный поиск, столкновение мнений, научных идей. Важно, чтобы это не превращалось в столкновение личностей, а тем более – научных коллективов. Иначе под видом развития науки, принципиальной борьбы мнений начинается утонченное сведение личных счетов, ориентация исследователей не на истину, а на межличностные отношения. Все это разъедает науку, как ржавчина железо, снижает эффективность научного потенциала, создает конфликтные ситуации, негативно сказывающиеся на научной деятельности, психическом здоровье людей. Причем развитый в интеллектуальном отношении человек оперирует и более утонченными средствами, приемами нарушения профессиональной этики. Поэтому требовательность к самому себе, к коллегам, профессиональная этика в научно-педагогических коллективах должны быть самого высокого уровня.

## 3. Культура вуснага навуковага маўлення

*1. Пракаментуйце выказванне вядомага расійскага лінгвіста Р. Богіна **«Речь раскрывает содержание личности».***

*2. Напішыце рэцэнзію на навуковы даклад з улікам харктарыстык маўлення:*

Выразна – манатонна; вольна – скута; лёгка – складана для ўспрыняцця; інфарматыўна насычана – ненасычана; пераканаўча – непераканаўча; натуральнасць – штучнасць інтанацый.

*3. Падрыхтуйце план навуковага выступлення на адну з тэм:*

1) «Дакладна карыстайцеся словам, і вы пазбавіце свет ад паловы непаразуменняў» (Р. Дэкарт);
2) «Час – найлепшы ацэншчык навуковых прац» (Л. Пастэр);
3) «Слова валодае магічным дарам адкрываць чалавеку самога сябе ў слове» (М. Жулінскі);
4) «Мова – адкрытая сістэма, што паддаецца ўплывам і сама ўплывае» (Т. Панько).

*4. Ацаніце даклад (выступленне) вашага таварыша паводле наступных крытэрыяў:*

- выяўленне дастатковага кругагляду і начытанасці па праблеме;
- манера выкладу матэрыялу дакладчыкам;
- наяўнасць ідэі, якая мае актуальную навуковую цікавасць;
- мэта выступлення;
- дакладна выражаныя пераходы ад адной часціны да другой;
- наяўнасць лагічнага завяршэння;
- культура маўлення.

*5. Прааналізуйце тэматыку студэнцкай навуковай канферэнцыі філалагічнага факультэта. Прапануйце ўласныя варыянты фармулёўкі тэмаў.*

*6. Прааналізуйце адзін з дакладаў навуковай канферэнцыі па крытэрыях метадалогіі, канцэптуальнасці, навізны высноў, актуальнасці.*

*7. Напішыце паведамленне пра ваша навуковае даследаванне на студэнцкі семінар.*

*8. Падрыхтуйце выступленне «Моўнае аблічча сучаснага студэнта».*

*9. Пазнаёмцеся з парадамі ўкраінскага вучонага К. Трухольскага для аратараў. Якія з іх вы лічыце каштоўнымі для сябе? Пракаментуйце стыль выказвання.*

Кароткія выказванні. Кароткія выказванні. Кароткія выказванні.

Ясны план у галаве – і як мага менш на паперы. Факты – або звароты да пачуццяў. Аратар – не энцыклапедыя. Энцыклапедыя ёсць у людзей дома.

Адзін і той жа голас стамляе. Гавары не больш сарака хвілін. Не шукай эфектаў, якія не вядуць да галоўнай мэты. Трыбуна бязлітасная: чалавек на ёй больш аголены, чым на пляжы.

Памятай: чым карацейшая прамова, тым менш шансаў праваліцца.

*10. Ахарактарызуйце публічнае выступленне. Ацаніце дакладчыка па такіх крытэрыях:*

- ці выявіў дастатковы кругагляд?
- ці паказаў кампетэнтнасць у сваёй галіне?
- ці выявіў захопленасць сваім прадметам?
- ці імпанавала вам манера яго выкладу?
- ці валодаў добрай дыкцыяй і артыкуляцыяй?
- ці было маўленне дакладчыка дастаткова жывым і натуральным?
- ці дастаткова гучна гаварыў дакладчык?

*11. Ацаніце навуковыя выступленні вашых калег і свой даклад па крытэрыях:*

- актуальнасць і навізна;
- практычнае значэнне;
- змест і агульны аб'ём выкананай працы: тэарэтычная і практычная часткі;
- форма выкладу матэрыяла;
- адказ на пытанні;
- якасць прыведзеных матэрыялаў (аб'ект даследавання);
- аб'ём і якасць аналізу літаратуры.

*12. Падрыхтуйце тэкст навуковага выступлення па тэме даследавання з улікам адпаведных патрабаванняў да гэтага навуковага жанру. Падумайце, як пазбегнуць непатрэбнага хвалявання, як паводзіць сябе перад аўдыторыяй, чытаць ці расказваць тэкст, ці карыстацца жэстамі, як заваяваць увагу і сімпатыю аўдыторыі.*

*13. Прачытайце выказванні аб тым, ад чаго залежыць фарміраванне маладога вучонага. Выкажыце ўласныя меркаванні аб гэтым.*

Думаю, што любіць прадмет – гэта не азначае любіць навуковую дзейнасць і быць здольным да яе. Варта ўдзяляць больш увагі самому працэсу развіцця здольнасцей да навуковай дзейнасці. Па маім глыбокім перакананні, няма сэнсу імкнуцца да пастаяннага павелічэння колькасці навуковых супрацоўнікаў. Мне здаецца, што трэба шукаць шляхі адбору асабліва творчых людзей, каб значна меншай колькасцю вучоных дасягаць максімальных вынікаў у навуцы. Таксама неабходна ствараць лепшыя ўмовы для навуковай творчасці і падбіраць навуковых супрацоўнікаў па здольнасцях.

***

У чым цяжкасці падрыхтоўкі навуковых кадраў? Развіццё навукі ў XXI ст. адбываецца так хутка, што ўжо немагчыма перадаць будучаму спецыялісту ўвесь аб'ём ведаў па адной дысцыпліне. Прычым, у многіх галінах навукі палавіна ўсіх ведаў, атрыманых студэнтамі ў універсітэце, праз дзесяць год становяцца ўстарэлымі. Вось чаму ад будучага спецыяліста патрэбна патрабаваць здольнасці да самаадукацыі. Таму важна, каб вучні яшчэ ў школе навучаліся самастойна абнаўляць і папаўняць свае веды.

***

Няма ніякага сумнення, што падрыхтоўка навуковых кадраў – складаная справа. Відавочна, перш за ўсё для маладых людзей важная цікавасць да навуковай дзейнасці, да самой дзейнасці, а не да прадмета геаграфіі, фізікі, мовы, літаратуры. Несумненна, любоў да самой творчай, разумовай дзейнасці і вырашэння задач больш важная, чым любоў да нейкага прадмета.

*14. Асэнсуйце, што агульнае, а што markрознае паміж навуковым артыкулам і навуковым выступленнем (дакладам).*

**Агульнае:**

1) аргументаванасць;
2) інфарматыўнасць;
3) лаканічнасць.

**Рознае:**

***Навуковы артыкул:***

- аб'ём 6–24 старонкі;
- жанр пісьмовай моўнай камунікацыі;
- шырокая аўдыторыя;
- кантакт пісьмовы.

***Навуковае выступленне (даклад):***

- працягласць 10–20 хвілін;
- жанр вуснай моўнай камунікацыі;
- абмежаваная аўдыторыя;
- інтанацыйны малюнак;
- непасрэдны кантакт са слухачом;
- аналіз рэакцыі слухачоў.

*15. Распрацуйце фрагмант выступлення па праблемах уласнага даследавання з выкарыстаннем тэхнічных сродкаў навучання.*

*16. Падрыхтуйце камп'ютарную прэзентацыю ўласнага даследавання.*

*17. Распрацуйце web-старонку «Педагагічныя сітуацыі ў беларускай мастацкай літаратуры».*

*18. Зрабіце пераклад з рускай мовы. Падрыхтуйце паведамленне (або навуковы дыялог) «Укараненне вынікаў даследчай працы ў навучальны працэс», выкарыстоўваючы беларускамоўныя адпаведнікі.*

Благодаря тому что – …; в значительной мере (степени) – …; в отличие – …; в результате – …; в связи с тем, что, поскольку – …; в то время как – …; в частности – …; во время – …; вместо этого – …; между тем как – …; при анализе – …; с помощью – …; таким образом – …; прежде всего – …

## 4. Заданні да самастойнай працы

1. Падрыхтоўка канспекта навуковага артыкула літаратуразнаўчай праблематыкі.
2. Падрыхтоўка і правядзенне дыскусіі «Якой, на ваш погляд, павінна быць сучасная беларуская навукова-філалагічная тэрміналогія: нацыянальнай ці інтэрнацыянальнай?»
3. Моўнастылістычны аналіз навуковага тэксту.
4. Моўнастылістычны аналіз навукова-навучальнага тэксту.
5. Моўнастылістычны аналіз навукова-папулярнага тэксту.
6. Анатацыя навукова-філалагічнага, літаратуразнаўчага артыкула, манаграфіі, падручніка, курсавой, дыпломнай, магістарскай работы.
7. Прэзентацыя навуковага інфарматыўнага прадукта.
8. Складанне праграмы публічнага абмеркавання курсавой, дыпломнай (магістарскай) працы аднагрупніка.

9. Абгрунтаванне назвы навуковага тэксту (артыкула, курсавой, дыпломнай, магістарскай).

10. Складанне плана прэзентацыі аўтарскай навуковай працы.

11. Рэдагаванне навуковага літаратуразнаўчага тэксту.

12. Рэцэнзаванне навуковага літаратуразнаўчага тэксту.

13. Падрыхтоўка агляду аб апрацаваных крыніцах навуковай інфармацыі.

14. Складанне канспекта артыкула, кнігі, падручніка, курсавой, дыпломнай, магістарскай.

## Тэрміналагічны слоўнік

**Аб’ектыўнасць навуковага выкладу** – уласцівасць тэксту, якая выяўляецца ў выкладзе і аналізе розных поглядаў на праблему.

**Адрасант** – адзін з камунікантаў, аўтар тэксту або той, хто прамаўляе.

**Адрасат** – адзін з камунікантаў, на каго разлічана прамова аўтара, твор пісьменніка, суразмоўнік або чытач, рэцыпіент паведамлення.

**Анатацыя** – кароткія звесткі пра кнігу, артыкул, манаграфію паводле прызначэння, зместу, віду, формы, жанру, асблівасцей выкладу матэрыялу і г.д.

**Анатаванне** – працэс напісання анатацыі, аналітыка-сінтэтычнай апрацоўкі інфармацыі, мэта якой – атрыманне абагульненай характарыстыкі навуковага тэксту, калі раскрываецца логіка структуры і зместу.

**Апрабацыя** – спосаб карэкціроўкі, дапрацоўкі, выпраўлення, кампетэнтнай ацэнкі навуковага тэксту.

**Аргумент** – лагічная выснова, якая служыць для доказу тэзіса.

**Афіцыйны апанент** – асоба, прызначаная вучоным саветам па абароне дысертацый для рэцэнзавання дысертацыі і аўтарэферата дысертацыі і выступлення з навуковым водгукам на яе абароне.

**Афіцыйныя зносіны** – зносіны, у якіх кожны ўдзельнік намагаецца адпавядаць сваёй сацыяльна-службовай ролі, гаварыць стрымана, прытрымлівацца ўсіх фармальнасцяў.

**Багацце маўлення** – адна з якасцей маўлення, адзнака высокай моўнай кампетэнцыі асобы, што выяўляецца ў выкарыстанні вялікай колькасці моўных адзінак (слоў, словазлучэнняў, выказванняў), розных па сэнсе і будове, адсутнасці неапраўданых паўтораў слоў, аднатыпных сінтаксічных канструкцый.

**Бібліяграфія** – звесткі пра выкарыстаныя ў даследаванні крыніцы, аформленыя па пэўных правілах і даступныя для іх ідэнтыфікацыі.

**Выразнасць маўлення** – камунікатыўная якасць пісьмовага ці вуснага маўлення, якая вызначаецца падборам маўленчых адзінак (слоў, выказванняў), якія найдакладна, арыгінальна, пераканаўча перадаюць думку выказвання, прыцягваюць увагу чытачоў або слухачоў, уплываюць на іх эмоцыі і пачуцці, уражваюць незвычайнасцю, навізной, адметнасцю.

**Вучонае званне** – званне, афіцыйна нададзенае навуковым і навукова-педагагічным супрацоўнікам на падставе іх творчага ўдзелу ў навуковых даследаваннях і выкладчыцкай дзейнасці ў вышэйшых навучальных установах, падцверджанае атэстатам. У Беларусі ўстаноўлены такія навуковыя званні: старшы навуковы супрацоўнік, дацэнт, прафесар.

**Гіпертэкст** – асаблівы метад пабудовы інфармацыйных сістэм, што забяспечвае прамы доступ да інфармацыі на падставе лагічнай сувязі між

яе блокамі; сістэма прадстаўлення тэкставай і мультымедыйнай інфармацыі ў выглядзе сістэмы звязаных між сабой тэкставых ці іншых файлаў.

**Даклад навуковы** – навуковы дакумент, у якім выкладзены вынікі навукова-даследчай працы, апублікаваны або прачытаны ў аўдыторыі.

**Даследаванне навуковае** – працэс выпрацоўкі новых навуковых ведаў, від пазнавальнай дзейнасці, які характарызуецца аб'ектыўнасцю, доказнасцю, дакладнасцю.

**Дацэнт** – вучонае званне, якое прысвойваецца супрацоўнікам вышэйшых навучальных устаноў і навуковых арганізацый за навукова-даследчую і навукова-педагагічную дзейнасць.

**Дэфініцыя** – кароткае лагічнае вызначэнне зместу якога-небудзь паняцця.

**Дыпломная праца** – навучальна-навуковае даследаванне, якое выконваецца на завяршальным этапе вучобы ў вышэйшай навучальнай установе пры атрыманні кваліфікацыі спецыяліста; прадугледжвае сістэматызацыю, замацаванне, пашырэнне тэарэтычных і практычных ведаў па базавай спецыяльнай навучальнай дысцыпліне і выкарыстанні іх пры вырашэнні канкрэтных навуковых і практычных заданняў у адпаведнай галіне ведаў, развіццё навыкаў самастойнай пошукавай працы і авалоданне методыкай даследавання.

**Дысертант** – асоба, якая выконвае і прадстаўляе да абароны дысертацыю.

**Дысертацыя** – арыгінальнае самастойнае навукова завершанае даследаванне, якое можа садзейнічаць вырашэнню пэўнай навуковай праблемы (для кандыдацкай дысертацыі) або адкрыццю новых накірункаў у навуцы (для доктарскай дысертацыі).

**Дыскурс** – 1) сукупнасць узаемазвязаных выказванняў (тэкстаў), якія рэалізуюцца ў пэўных сацыяльна-культурных, часавых і прасторавых умовах з улікам дзейнасці ўдзельнікаў камунікацыі (адрасата і адрасанта); 2) працэс вярбальных і невярбальных зносін.

**Дыскусія** – публічнае абмеркаванне пэўнай праблемы або асобных пытанняў на семінарах, канферэнцыях, у друку з мэтай дасягнення ісціны.

**Дыспут навуковы** – форма арганізацыі папярэдне падрыхтаванага публічнага абмеркавання складанага, супярэчлівага пытання, у працэсе якога выяўляюцца розныя, часта супрацьлеглыя, погляды.

**Доктар навук** – навуковая ступень, прысуджаная ВАК на падставе хадайніцтва спецыялізаванага савета па абароне дысертацый, прынятая па выніках публічнай абароны дысертацыі даследчыкам, які мае ступень кандыдата навук.

**Жанр навуковага стылю мовы** – канкрэтная разнавіднасць навуковых тэкстаў, што адрозніваюцца функцыямі і структурай (навуковы артыкул, манаграфія, агляд, рэцэнзія).

**Загаловак навуковага тэксту** – інфарматыўная адзінка, якая адлюстроўвае тэматыку, праблематыку і адпавядае зместу тэкста.

**Звязнасць навуковага тэксту** – паяднанне кампанентаў навуковага тэкста між сабой па зместу.

**Змястоўнасць мовы** – камунікатыўная якасць мовы, што вызначаецца інфармацыйным напаўненнем выказанага, адпаведнасцю яго тэме паведамлення.

**Змястоўнасць маўлення** – глыбокае асэнсаванне тэмы і галоўнай ідэі выказвання, дакладнае веданне наяўнай інфармацыі па гэтай тэме; разнабаковае і поўнае раскрыццё тэмы.

**Ідыёстыль** – сукупнасць фармальных і стылістычных асаблівасцей, характэрных для мовы пэўнай асобы.

**Індывідуальны інтанацыйны стыль –** інтанацыйная манера, асновай якой з’яўляецца выбар прамоўцам варыянтаў інтанацыйных адзінак (інтанем).

**Інтэнсіўнасць маўлення** – сіла вымаўлення гукаў, слоў, моўных тактаў, што залежыць ад амплітуды вібрацыі галасавых звязак і звязана з асаблівасцямі моўнага дыхання.

**Інтэрактыўнасць** – тэкстава-дыскурсіўная катэгорыя, якая прадстаўляе суб’ектна-аб’ектна-суб’ектнае ўзаемадзеянне адрасанта і адрасата на падставе знакавага тэксту, інтэнцый, стратэгій, тактык камунікацыі і праграм адрасаванасці паведамлення.

**Кандыдат навук** – навуковая ступень, прысуджаная спецыялізаваным саветам па абароне дысертацыі паводле вынікаў публічнай абароны дысертацыі даследчыкам, які мае вышэйшую прафесійную адукацыю.

**Ключавое слова** – слова або словазлучэнне, якое найбольш поўна і спецыфічна характарызуе змест навуковага тэксту або яго часткі.

**Кампіляцыя** – тэкст, напісаны на аснове запазычання ў іншых аўтараў матэрыялаў без самастойнай іх апрацоўкі.

**Камунікатыўная сітуацыя** – функцыянальна-камунікатыўная сфера (побытавая, афіцыйна-дзелавая, навуковая і інш.), у якой ствараецца тэкст.

**Камунікатыўная стратэгія** – маўленчы спосаб, якім карыстаюцца ўдзельнікі дыскусіі з мэтай вытлумачэння сваіх думак слухачам найбольш зразумелым або найбольш эканомным спосабам.

**Камунікатыўны намер (інтэнцыя)** – канкрэтна вызначаная мэта выказвання прамоўцы, якая з’яўляецца рэгулятарам маўленчых паводзін партнёраў і на вызначэнне якога ўплываюць матывацыя, патрэба, умовы сітуацыі і інш.

**Канферэнцыя навуковая** – форма абмену навуковай інфармацыяй па пэўнай тэматыцы ў адпаведнасці з распрацаванай праграмай, рэгламентам выступленняў.

**Канцэпцыя** – сістэма поглядаў, разумення пэўных з'яў, працэсаў, набор доказаў пры абгрунтаванні навуковай тэорыі.

**Крыніца навуковай інфармацыі** – дакумент, які змяшчае навуковы факт або з'яўляецца вынікам аналітычнай і лагічнай апрацоўкі.

**Культура навуковага маўлення** – захаванне літаратурных нормаў вымаўлення, націскаў, словаўжывання, пабудовы словазлучэнняў, тэкстаў; нарматыўнасць вуснай і пісьмовай навуковай мовы, што выражаецца ў яе правільнасці, дакладнасці, лагічнасці, чыстаце, выразнасці, мэтазгоднасці, а таксама ў разнастайнасці граматычных канструкцый, багацці слоўніка, захаванні ў пісьмовым маўленні арфаграфічных і пунктуацыйных нормаў.

**Магістарская праца** – кваліфікацыйная самастойная навукова-даследчая праца, якая выконваецца з мэтай атрымання адукацыйна-кваліфікацыйнай ступені «магістр».

**Магістр** – асветна-кваліфікацыйны ўзровень спецыяліста, які ён атрымаў шляхам паглыблення спецыяльных ведаў і ўменняў інавацыйнага характару, прадугледжваецца вопыт выкарыстання новых ведаў для вырашэння праблемных прафесійных задач у пэўнай галіне.

**Метадалагічная аснова** – асноўныя палажэнні, на якіх грунтуецца навуковае даследаванне.

**Маўленчая кампетэнцыя** – складнік камунікатыўнай кампетэнцыі; дзейнасць асобы, накіраваная на разуменне або стварэнне тэксту (вуснага ці пісьмовага), што адбываецца ў працэсе маўленчай дзейнасці.

**Моўнае майстэрства** – здольнасць асобы да выкладу сваіх думак з улікам моўных норм, уменне выбіраць з мажлівых варыянтаў найбольш удалы, дакладны ў семантычных і стылістычных адносінах.

**Моўнае чуццё** – моўны густ, які забяспечвае эфектыўную камунікатыўную дзейнасць прамоўцы, веданне ім нормаў сучаснай літаратурнай мовы; індывідуальная сістэма падсвядомых ацэнак, якая грунтуецца на літаратурных нормах і моўных ідэалах.

**Моўны этыкет** – мікрасістэма нацыянальна-спецыфічных стэрэатыпных устойлівых формул зносін, прынятая грамадскасцю для ўстанаўлення кантакту суразмоўнікаў, працягу або спынення зносін.

**Моўна-інфармацыйная кампетэнцыя** – уменне здзяйсняць самастойны пошук неабходнай інфармацыі, у тым ліку электроннай, захоўваць яе, перадаваць, аналізаваць і г.д.

**Моўнакамунікатыўная кампетэнцыя** – сфарміраваная сістэма прафесійных ведаў, камунікатыўных уменняў і навыкаў, каштоўнасных арыентацый, агульнай гуманітарнай культуры, інтэгральных паказчыкаў культуры маўлення, неабходных для якаснай прафесійнай дзейнасці.

**Мадальнасць** – выражэнне аўтарскіх адносін у навуковым даследаванні.

**Манаграфія** – навуковая праца больш за 100 старонак друкаванага тэксту, у якой адлюстравана найбольш поўнае і ўсебаковае вывучэнне пэўнага аб'екта, бачанне яго ў праблемным полі сучаснай навукі.

**Навука** – сфера чалавечай дзейнасці, функцыяй якой з'яўляецца выпрацоўка і тэарэтычная сістэматызацыя аб'ектыўных ведаў пра рэчаіснасць; форма грамадскай свядомасці.

**Вучэбная праграма** – дакумент, які вызначае змест, аб'ём, парадак выкладання пэўнай вучэбнай дысцыпліны ці яе раздзела.

**Вучэбны дапаможнік** – выданне, якое замяняе або дапаўняе падручнік, часта прысвечаны пэўным дэталёва распрацаваным раздзелам вучэбнай дысцыпліны.

**Навуковая галіна** – галіна навукі, па якой праводзяць навуковыя даследаванні, дыферэнцыруюць навуковыя веды і адпаведна з назваю якой прысуджаюць адпаведную навуковую ступень.

**Навуковая дзейнасць** – інтэлектуальная творчая дзейнасць, накіраваная на атрыманне і выкарыстанне навуковых ведаў.

**Навуковы даклад** – жанр навуковага стылю, які прадугледжвае разгорнутае паведамленне на спецыяльную тэму, фіксуецца ў вуснай ці пісьмовай форме і зачытваецца на пасяджэнні навуковага таварыства.

**Навуковая рэцэнзія** – спецыяльны тэкст-аналіз навуковай крыніцы (адной ці некалькіх), разлічаны на пэўнае кола спецыялістаў.

**Навуковы артыкул** – від навуковых публікацый, у якім апісаны канчатковыя або прамежкавыя вынікі даследавання, абгрунтаваны спосабы іх атрымання, а таксама акрэслены перспектывы наступных напрацовак.

**Навуковая тэма** – заданне навуковага характару, якое патрабуе правядзення навуковага даследавання.

**Навуковае даследаванне** – мэтанакіраванае пазнанне з мэтаю атрымання ведаў як сістэмы паняццяў, законаў і тэорый.

**Навуковы водгук** – сціслая форма пісьмовай ацэнкі навуковай работы (курсавой, дыпломнай, магістарскай кваліфікацыйных работ, кандыдацкай ці доктарскай дысертацый).

**Навуковы дыялог** – тып навуковага маўлення, які складаецца з абмену рэплікамі-выказваннямі між некалькімі вучонымі, удзельнікамі размовы (гутаркі, дыскусіі, спрэчкі), вынікам якога з'яўляюцца навуковыя веды.

**Навуковы кіраўнік** – асоба, прызначаная загадам рэктара ВНУ або дырэктара навуковай установы кіраўніком студэнта ці аспіранта для падрыхтоўкі дыпломнай, магістарскай работ або кандыдацкай дысертацыі.

**Навуковы кансультант** – асоба, прызначаная загадам рэктара ВНУ або кіраўніка навуковай установы кансультантам дактаранта па падрыхтоўцы дысертацыі.

**Навуковая ступень** – навуковая кваліфікацыя ў пэўнай галіне ведаў, падцверджаная абаронай дысертацыі і замацаваная атрыманнем дыплома.

**Навуковы тэкст** – цэласны камунікатыўны блок, які мае дакладную лагічную структуру з унутрана завершанымі часткамі (раздзеламі, падраздзеламі, пунктамі, параграфамі, абзацамі), насычанымі адпаведнай тэрміналогіяй.

**Плагіят** – капіраванне чужых ідэй, тэксту без спасылак на першакрыніцу.

**Палеміка навуковая** – тып дыскусіі, мэтаю якой з’яўляецца сцвярджэнне пэўных каштоўнасцей з выкарыстаннем карэктных прыёмаў.

**Прафесійнае чытанне** – зварот да тэкстаў, якія змяшчаюць спецыяльную інфармацыю.

**Пурызм** – празмернае імкненне да ачышчэння літаратурнай мовы ад іншамоўных запазычванняў, неалагізмаў, а таксама намаганне ўберагчы літаратурную мову ад пранікнення лексічных ці граматычных элементаў, якія знаходзяцца за межамі нормы (размоўных, прастамоўных, дыялектных і інш.).

**Рэферат –** аналітыка-сінтэтычная апрацоўка навуковай крыніцы (артыкула, манаграфіі і інш.), аналіз яе асноўных палажэнняў, фактаў, вынікаў, высноў.

**Рэцэпцыя** – успрыманне чытачом, слухачом інфармацыі, абумоўленае яго папярэднім вопытам і моўнаю кампетэнцыяй.

**Рэцыпіент** – той, хто ўспрымае моўную інфармацыю.

**Рыторыка –** філалагічная дысцыпліна, якая вывучае спосабы пабудовы па-мастацку выразнай мовы; навука красамоўства, аратарскае мастацтва. Рыторыка інтэгруе зместавыя каманенты такіх навук як філасофія, логіка, псіхалогія, лінгвістыка, этыка, сцэнічнае майстэрства, літаратуразнаўства.

**Роздум навуковы** – тып моўнага выказвання, у якім аўтар выкладае свае меркаванні па пэўнай навуковай праблеме.

**Разуменне навуковага тэксту** – раскрыццё сутнасці прадметаў і з’яў, апісаных у навуковым тэксце, усведамленне сувязяў, адносін і залежнасцяў між імі.

**Рубрыкацыя навуковага тэкста** – дакладны і лагічны падзел на пэўныя часткі.

**Складанне плану** – від працы з тэкстам, спосаб засваення і разумення прачытанага, шлях да вывучэння (складання, падрыхтоўкі) кампазіцыі тэксту.

**Стыль навуковага мыслення** – гістарычна сфарміраваная сістэма метадалагічных рэгулятараў, ідэалаў і нормаў навукі, якія вызначаюць змест і скіраванасць развіцця навукі.

**Стратэгія камунікатыўная** – маўленчы спосаб, які выкарыстоўваюць удзельнікі дыскусіі з мэтай данясення сваёй думкі да слухачоў найбольш зразумелым або найбольш эканомным спосабам.

**Сугестыўнасць** – здольнасць перадаваць свае эмоцыі і ўплываць на паводзіны адрасата.

**Спрэчка навуковая** – славеснае сутыкненне паміж дзвюма або некалькімі асобамі па пэўным пытанні, у час якога кожны з бакоў даводзіць сваю думку.

**Суржык (трасянка)** – змешаная мова, якая ўзнікае як вынік працяглалай русіфікацыі, частае ўжыванне русізмаў.

**Унутранае маўленне** – механізм разумовай дзейнасці чалавека; бязгучнае маўленне, асноўнымі функцыямі якога з'яўляецца апрацоўка і ўсведамленне інфармацыі, планаванне праграмы будучага выказвання.

**Успрыманне навуковага тэксту** – псіхічны працэс разумення чалавекам зместу тэкста праз непасрэдны ўплыў на органы пачуццяў, працэс распазнавання навуковай інфармацыі.

**Уступ** – частка навуковага тэксту, у якой абгрунтоўваецца выбар тэмы даследавання, апісаны метады даследавання, сфармуляваны мэты і задачы працы.

**Функцыянальная мова** – мова, прызначаная для спецыяльных мэтаў і абслугоўвае пэўныя сферы людскіх зносін.

**Функцыянальны стыль** – агульна ўсвядомленая сукупнасць прыёмаў ужывання, адбору і спалучэння маўленчых спосабаў, функцыянальна абумоўленых сацыяльна значнай сферай зносін.

**Цытата** – даслоўна прыведзены ўрывак з іншага тэксту для падцвярджэння або ілюстрацыі той ці іншай думкі.

**Эксперт** – спецыяліст у пэўнай галіне навукі і практычнай дзейнасці, які выконвае па ёй экспертызы.

**Эмацыйнасць маўлення** – камунікатыўная якасць мовы, якая выражае індывідуальныя пачуцці, перажыванні, настроі, суб'ектыўныя адносіны асобы да выказваемага.

**Эстэтычнасць маўлення** – камунікатыўная якасць, якая выяўляецца ў аптымальным адборы і арганізацыі маўлення ў адпаведнасці з камунікатыўнымі ўмовамі і задачамі аўтара, аптымальнае моўнае афармленне зместу, гармоніі і цэласнасці тэкста, якаснасці яго знешняга афармлення ў пісьмовай форме ці вусным выкананні.

**Этыкет навуковы** – сукупнасць правілаў дзейнасці і паводзін, якія забяспечваюць выкананне асноўных прынцыпаў навуковай этыкі і спрыяюць стварэнню камфортных умоваў працы вучонага.

**Эфектыўнасць навуковай камунікацыі** – камунікатыўны паказчык, які вызначае дасягненні камунікатыўнага супрацоўніцтва між адрасантам і адрасатам і скіраваны на такі спосаб арганізацыі канцэптуальнай структуры тэксту, які спрыяе разуменню яго з мінімальнымі высілкамі для чытача.

## Літаратура

1. Абабурка, М. Культура беларускай мовы / М. Абабурка. – Мінск : Выш. шк., 1994. – 122 с.

2. Антанюк, Л. Беларуская навуковая тэрміналогія / Л. Антанюк –. Мінск : Навука і тэхніка, 1987. – 249 с.

3. Асновы культуры маўлення і стылістыкі : вучэб. дап. / У. Анічэнка [і інш.] ; пад рэд. У. Анічэнкі. – Мінск : Універсітэцкае, 1992. – 254 с.

4. Арутюнова, Н.Д. Диалогическая модальность и явление цитации / Н.Д. Арутюнова // Человеческий фактор в языке: Коммуникация, модальность, дейкис / под ред. Т.В. Булыгиной. – М. : Наука, 1992. – С. 52–79.

5. Баженова, Е.А. Научный текст в аспекте поликультурности / Е.А. Баженова. – Пермь : Изд-во Пермского ун-та, 2001. – 272 с.

6. Бахтин, М.М. Эстетика словесного творчества / М.М. Бахтин. – М. : Искусство, 1986. – 445 с.

7. Будагов, Р. Как мы говорим и пишем / Р. Будагов. – М. : Изд-во МГУ, 1988. – 79 с.

8. Василевич, А.П. Как слово наше отзовется? (Опыт исследования качества научного выступления) / А.П. Василевич // Энергия. – 2006. – № 2. – С. 61–66.

9. Гальперин, И.Р. Научный текст как объект лингвистического исследования / И.Р. Гальперин. – М., 1999. – 139 с.

10. Головин, Б. Основы культуры речи / Б. Головин. – Минск : Высш. шк., 1988. – 320 с.

11. Зеліньска, Н.В. Сучасны навуковы дыскурс: парадоксы развіцця / Н.В. Зеліньска // Веснік Кіеўск. міжн. ун-та. – 2004. – Вып. 3. – С. 13–25. – (На ўкр. мове).

12. Иванов, Л.Ю. Текст научной дискуссии: Дейкис и оценка / Л.Ю. Иванов. – М. : НИП «2Р», 2002. – 208 с.

13. Караулов, Ю.Н. Русский язык и языковая личность / Ю.Н. Караулов. – 6-е изд. – М. : URSS, 2007. – 263 с.

14. Коваль, А.П. Навуковы стыль сучаснай украінскай літаратурнай мовы. Структура навуковага тэксту / А.П. Коваль. – К., 1970. – 306 с. – (На ўкр. мове).

15. Кожина, М.Н. О речевой системности научного стиля сравнительного с некоторыми другими / М.Н. Кожина. – Пермь : Пермский университет, 1972. – 375 с.

16. Котюрова, Н.П. Культура научной речи: текст и его редактирование : уч. пособие / Н.П. Котюрова. – Пермь: Пермский гос. ун-т, 2005. – 125 с.

17. Лепешаў, І.Я. Асновы культуры мовы і стылістыкі : практыкум / І.Я. Лепешаў. – Мінск : Універсітэцкае, 1989. – 207 с.

18. Лотман, Ю. О лингвистическом исследовании текстов научного стиля / Ю. Лотман // Вопросы языкознания. – 1997. – № 4. – С. 125–138.

19. Морозов, В. Культура письменной научной речи : уч. пособие [Электронный ресурс] / В. Морозов. – Режим доступа : htpp://www.qumer.info.

20. Савойкин, К.Б. Диалогика научного текста / К.Б. Савойкин. – Саранск : Изд-во Морд. ун-та, 2006. – 148 с.

21. Семяног, А.М. Культура навуковай украінскай мовы / А.М. Семяног. – К., Выд. цэнтр «Акадэмія», 2010. – 213 с. – (На ўкр. мове).

## Змест

1. Навуковая культура і прафесійная дзейнасць даследчыка ........................ 3

2. Навуковыя тэксты: спецыфіка, функцыі, тыпы, жанры............................. 5

2.1. Акадэмічныя (уласна навуковыя), навукова-навучальныя і навукова-папулярныя тэксты ........................................................................ 9

3. Культура вуснага і пісьмовага навуковага выказвання............................ 15

4. Метадалогія і культура стварэння навуковага філалагічнага тэксту ...... 20

5. Віды навуковых тэкстаў.......................................................................... 22

6. Праца з навуковым тэкстам. Культура чытання...................................... 26

7. План навуковага тэксту. Тэзісы. Канспект .............................................. 28

8. Рэферыраванне навуковай крыніцы. Аўтарэферат дысертацыі .............. 30

9. Анатаванне навуковай крыніцы .............................................................. 33

10. Структура навуковага тэксту.................................................................. 35

11. План і рубрыкацыя навуковага тэксту .................................................... 36

12. Характарыстыка структурных частак даследавання............................. 39

13. Навуковы артыкул.................................................................................. 47

14. Навуковая рэцэнзія. Навуковы водгук .................................................... 51

15. Культура вуснага выказвання навукоўца. Навуковы даклад. Выступленне.............................................................................................. 56

16. Камунікатыўная культура дакладчыка .................................................. 60

17. Спосабы і культура апрабацыі вынікаў даследавання (канферэнцыя, дыскусія, навуковая спрэчка, дыспут, палеміка, выступленне) .................. 62

МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

Практычныя заданні.................................................................................... 68

Тэрміналагічны слоўнік.............................................................................. 85

Літаратура.................................................................................................... 92